№ 37 (443) 7 кастрычніка 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднoўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

### Калякін узначаліць штаб адзінага

Ценевы ўрад будзе называцца нацыянальным камітэтам.

Старонка 3

### Мілінкевіч як аратар

Адзінаццаць гадоў кіраваньня Лукашэнкі паказалі, што яго немагчыма перакрычаць. Мілінкевіч такой мэты ня ставіць.

старонка 5

«Магу!» — сказаў ён. Рэпартаж Алеся Кудрыцкага з Кангрэсу дэмакратычных сілаў. Старонкі 3—5.

# Выбар зроблены: Мілінкевіч

### Лябедзьку на пераправе не мяняюць

Палітрада АГП не прыняла адстаўкі лідэра.

старонка 3

### Акадэмік Вайтовіч пераацаніў сілы

Маладафронтаўцаў без маладафронтаўцаў жанілі.

старонка 3

СКАНДАЛ

**Лішкі бранятанкавай прадукцыі**

У турму трапіў дырэктар Барысаўскага танкарамонтнага заводу, які вінавацілі ў кантактах з рэжымам Хусэйна. **Старонка 7.**

КУЛЬТУРА

**«Ксты» і дуліна ў кішэні**

Пасьля непрыхавана слабой «Дуліны ад Барадуліна» зьявілася геніяльная senilia «Кстоў». Дзьве апошнія кнігі Рыгора Барадуліна паставілі рабром пытаньне аб прыродзе яго таленту. Піша Аляксандар Фядута. **Старонка 9.**

КІНО

**Сьціплы шарм стаіцызму**

Новы фільм Алега Дашкевіча — пра адзін дзень, пражыты пры рэжыме Лукашэнкі. Піша Андрэй Расінскі. **Старонка 8.**

КАМЭНТАРЫ

**Атэістычны рэванш**

Ці ж маўчаньне праваслаўных і каталіцкіх ярархаў Беларусі, калі ўлады душаць Эвангельскую царкву, гэта справядлівасьць у дачыненьні да самога Хрыста? Піша Пётра Рудкоўскі. **Старонка 14.**

АБ УСІМ ПАТРОХУ

**Бэкхэм як люстэрка**

Напачатку быў Дэвід Бэкхэм. Першы футбаліст — ікона попкультуры. Сёньня свае Бэкхэмы ёсьць ужо ў Расеі, Румыніі, Украіне. **Старонка 21.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

**Выбар адзінага. Погляд з Каракасу**

Няма нічога лепшага на сьвеце, як сядзець на беразе Карыбскага мора, цягнуць мясцовы ром і разважаць пра лёсы беларускай дэмакратыі. Фэльетон Лёліка Ушкіна. **Старонка 24.**



## Лукашэнка здае «Белтрансгаз»?

Дзяржава жадае скупіць усе акцыі «Белтрансгазу». Піша **Зьміцер Дрыгайла**.

Дзяржава, якой належыць 99,88% акцый ААТ «Белтрансгаз», жадае набыць апошнія 0,12% (або 236 706 акцый, ці 947 млн руб.), што належаць працоўнаму калектыву прадпрыемства. Урад матывуе патрэбу гэтага тым, што ў плянах — стварэньне газатранспартнага сумеснага прадпрыемства з ААТ «Газпром» «на парытэтных умовах». Дамова з расейцамі нібыта ўжо заключаная. Пра гэта паведаміў першы віцэ-прэм’ер ураду Ўладзімер Сямашка 5 кастрычніка на X Беларускім энэргетычным і экалягічным кангрэсе ў Менску. Віцэ-прэм’ер адзначыў, што перамовы з «Газпромам» пра стварэньне СП на базе «Белтрансгазу» не спыняліся. «Проста мы не сышліся ў цане». А ў наяўнасьці мінарытарных акцыянэраў «Газпром» сёньня бачыць падвох. Дамаўляцца з дробнымі трымальнікамі акцыяў будуць 11 кастрычніка на агульным сходзе акцыянэраў прадпрыемства. **Старонка 6.**

## Дрыкганты на Малой сцэне

Што такое Дзікае Паляваньне? Гэта ўлада жаху, які паралізуе. У Купалаўскім — спэктакль паводле Караткевіча.

Чаму менавіта «Дзікае паляваньне»? Чаму менавіта зараз? Толькі таму, што Караткевічу сёлета 75 гадоў? І што ўласна яны хацелі тым сказаць? Прэм’ера спэктаклю «Дзікае паляваньне караля Стаха» адбылася 30 верасьня на Малой сцэне Купалаўскага тэатру. **Старонка 8.**

**50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА**

### Новая палітычная сытуацыя

Выбар зроблены. Дыскусіі скончаны. Кандыдат ад апазыцыі абраны. Яе на выбары павядзе Аляксандар Мілінкевіч. Складаецца новая палітычная рэальнасьць.

Ад Мілінкевіча дэлегаты Кангрэсу пачулі штосьці такое, чаго ніколі ня чулі ад лідэраў апазыцыі — заклік да жалезнай дысцыпліны, як на вайне. Мы мусім выбудаваць дэмакратычную вэртыкаль, больш кансалідаваную за лукашэнкаўскую. Бо ідэйную. Прыкладна гэтак сказаў ён.

Усе погляды прыкаваныя цяпер да Мілінкевіча. Ад яго будзе залежаць цяпер так шмат. Ці здолее адсунуць штатных дэмагогаў на другі плян, не разбурыўшы пры гэтым кааліцыі? Ці зможа знайсьці новую рыторыку, якая б зацікавіла шырокія слаі выбарцаў? Ці зможа штодзённа весьці завочную дыскусію з Лукашэнкам, падтрымліваць цікавасьць да сябе?

"Геі" на ўваходзе ў ДК МАЗу паказалі, што кампанія будзе найбруднейшая. Нічога такога ў 2001 годзе ўлады сабе не дазвалялі. Каго лукашэнкаўцы дапусьцяць да выбараў у якасьці тэхнічных кандыдатаў. Гайдукевіча? Казуліна? Які расклад палітычных сілаў будзе перад выбарамі? Усё гэта пачынаем аналізаваць у гэтым нумары "НН".

### Трагедыя нацыянальных бібліятэк

Узьвядзеньне Нацыянальнай бібліятэкі ня выклікала ў нацыі вялікіх эмоцый. Людзі, для якіх наведваньне бібліятэк — рэальная патрэба, ведаюць вартасьць "дыямэнту". Катастрафічна пагаршаецца якасьць бібліятэчнага фонду. З 1995 г. на тры мільёны кніг скараціўся кніжны фонд, наведвальнасьць і колькасьць выдадзенае літаратуры. Бо новых паступленьняў вобмаль, бо кніга самых разьвітых краінаў сьвету амаль не трапляе ў Беларусь.

Больш за тое, апошнія 15 гадоў у краіне няўхільна зьмяншаецца колькасьць бібліятэк. У 1991 г. было 6,1 тыс. бібліятэк, у 1995 г. — 5367, у 2004-м — 4438. За дзесяць год у Беларусі ліквідавалі тысячу бібліятэк!

Для вёскі гэта сапраўдная катастрофа. Тысяча зьніклых бібліятэк — гэта атупеньне цэлых краёў. Вось што на адной чашы шаляў. А на іншай — адзіная на ўсю краіну новая бібліятэка. Інфармацыйнае й культурнае адставаньне паміж сельскай мясцовасьцю й гарадамі, паміж паказушнымі цэнтрамі і дабітым агулам нарастае ў геамэтрычнай прагрэсіі. Ля станцыі мэтро "Маскоўскай" паўстае гмах кнігазбору. А за кальцавой дарогаю, паміж пушчаў, балот дажываюць апошнія сотні бібліятэк — як напамін пра род чалавечы, што некалі там пражываў.

**Сяргей Харэўскі**

**Працяг тэмы на старонцы 15.**

# У чым іх недзяржаўнасьць?

Рэктараў недзяржаўных ВНУ будзе прызначаць міністар адукацыі. Так гаворыцца ў першым законе, зацьверджаным палатай прадстаўнікоў на восеньскай сэсіі. Піша **Зьміцер Дрыгайла**.

Адным зь першых законаў, прынятых у першым чытаньні дэпутатамі, стаў законапраект "Аб вышэйшай адукацыі". Праўда, ён быў прыняты яшчэ ў чэрвені 2004 г., але А.Лукашэнка загадаў дапрацаваць, і яго адклікалі ва ўрад.

Стары закон аб адукацыі дзейнічаў ад пачатку 1990-х. За гэты час колькасьць студэнтаў у краіне павялічылася з 180 да 370 на 10 тыс. насельніцтва. Цяпер студэнтамі зьяўляюцца больш за 360 тысяч чалавек (300 тыс. вучацца у дзяржаўных ВНУ, зь іх — 140 тыс. на платнай аснове). Завочнікі ў Беларусі складаюць 47%.

Новы закон вяртае вышэйшую адукацыю да савецкай мадэлі. Ён не прадугледжвае бакалаўрыяту.- Навучаньне будзе чатырохгадовым (у асобных ВНУ — пяць). Затое засталася магістратура (1—2 гады). Новы закон дазваляе ВНУ мець свае каледжы й ліцэі. Галоўны падарунак робіцца прыватным інстытутам. Цяпер рэктары прыватных ВНУ (такіх у краіне дзесяць) будуць назначацца й здымацца з пасады міністрам адукацыі — праўда, па рэкамэндацыі заснавальнікаў ВНУ.

Найбольш хвалюючае для студэнтаў пытаньне — тэрмін абавязковага размеркаваньня, які плянавалі павялічыць да пяці гадоў. Пакуль пакінулі статус-кво — два гады для студэнтаў ВНУ і год для выпускнікоў тэхнікумаў і каледжаў. Калі студэнт-бюджэтнік не паедзе па размеркаваньні, ён будзе вымушаны кампэнсаваць дзяржаве кошт усяго навучаньня. Памер кампэнсацыі прыкладна роўны 25 млн рублёў.

На парадку дня сэсіі ёсьць і іншыя законы. У камісіі па нацыянальнай бясьпецы завяршаецца праца над законапраектам аб барацьбе з карупцыяй, які дэпутаты двойчы накіроўвалі на дапрацоўку. Самы цікавы з законапраектаў — праект бюджэту на наступны год — у Авальную залю яшчэ не паступіў.

Яшчэ будуць разгледжаны законапраект аб унясеньнях зьмен у Адміністрацыйны кодэкс, зацьверджэньні асноўных напрамкаў унутранай і замежнай палітыкі, зьмены ў Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны й Крымінальна-выканаўчы кодэксы.




**Каваленя працягвае пагром**

**Андрэй Кіштымаў (на фота справа), дасьледчык гісторыі эканомікі, стаў чарговым вядомым навукоўцам, якога пазбавілі працы ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук. З кандыдатам гістарычных навук, які адпрацаваў у Інстытуце ад 1979 году, "не падоўжаны кантракт". Гэтаму папярэднічаў выхад нэасталінісцкай манаграфіі па аграрнай гісторыі Беларусі, у якой Кіштымава зьвінавачваюць у "заалягічнай нянавісьці да савецкай і сучаснай уладаў, суцэльным панэгірыку прыватнай уласнасьці, Захаду". Працу Кіштымава называюць у ёй "разнузданым" антысавецкім пасквілем. Вось яна, новая-старая мова беларускай гістарычнай навукі. Заслуга пагрому беларускага акадэмічнага асяродку належыць новапрызначанаму дырэктару Інстытуту гісторыі Аляксандру Каваленю.**

### «Наша Ніва» і "ARCHE" ў Навагрудку

Валер Булгакаў, Андрэй Дынько і Андрэй Хадановіч сустрэнуцца з чытачамі з старой беларускай сталіцы і яе ваколіцаў 13 кастрычніка, у чацьвер. Пачатак а 16-й гадзіне. Пра месца сустрэчы можна даведацца праз тэлефон 343-41-49.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Толькі да 17 кастрычніка

У Музэі гісторыі і культуры Беларусі (Менск, вул.Маркса, 12) дэманструюцца чатыры ўнікальныя слуцкія паясы, перададзеныя зь Дзяржаўнага гістарычнага музэю ў Маскве. Штодня да 18-й, апрача серады.

**Пра выставу «Слуцкіх паясоў» — на старонцы 8.**

### Падпіска на «ARCHE»

Працягваецца падпіска на штодвухмесячнік «ARCHE». Часопіс можна атрымаць практычна толькі праз падпіску. Падпісны індэкс 00345.

У «ARCHE» друкуецца палітычны аналіз, культурная крытыка, гістарычныя матэрыялы, нонканфармісцкая літаратура.

## IN MEMORIAM

### Ён сышоў гэтак рана



За Зьмітра Кісяля ніколі не бывала сорамна. Цяжка пераацаніць яго заслугі ў адраджэньні беларускіх спраў. Паходзіў зь сям'і вядомых беларускіх патрыётаў, рэпрэсаваных сталінскім рэжымам. Адзін са сталых фундатараў беларускіх спраў на Гарадзеншчыне. Шматлікія культурніцкія фэсты пачатку 1990-х былі зробленыя на ягоныя грошы! Зьміцер Кісель, як толькі пачаў нешта зарабляць у бізнэсе, адразу стаў адлічваць на справы беларускія, не пакідаючы часам сабе анічога. Ён і бізнэс свой разглядаў як крыніцу фінансаваньня беларускага Адраджэньня: адзін з заснавальнікаў традыцыі ўшанаваньня памяці Ларысы Геніюш у Зэльве, адзін з заснавальнікаў Дзён памяці братоў Каліноўскіх у Сьвіслачы, ініцыятар адраджэньня Сацыял-дэмакратычнай грамады ў Горадні. Аўтар "Пагоні", пэўны час — старшыня гарадзенскай філіі БАЖ.

Ён ведаў шмат пра кожную вуліцу, кожны дом у Горадні. Меў сяброў па ўсёй краіне і за яе межамі. Калі думаеш, якімі людзьмі ўвасабляецца Беларусь, дык Зьміцер Кісель стаіць тут у першым шэрагу. Ён даказаў гэта цэлым сваім жыцьцём і апошнімі сваімі днямі.

**Зьміцер Сідаровіч**

# «Магу!» — сказаў Мілінкевіч

У Палацы культуры МАЗу 1—2 кастрычніка выбралі лідэра апазыцыі. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Хоць Кангрэс мусіў пачацца толькі ад 14-й, жыцьцё ў палацы віравала ад сёмай ранку. На рэгістрацыю стаялі даўжэзныя чэргі дэлегатаў, валянтэры спрытна пакавалі тэчкі матэрыяламі кангрэсу, кнiганошы прадавалі літаратуру й музычныя дыскі. Ахову будынку забясьпечвалі сорак хлопцаў з «Правага альянсу». Цягам двух дзён яны неназойліва, але прафэсійна адсочвалі ўсіх выпадковых людзей і ахоўвалі ўсіх кандыдатаў у прэзыдэнты. Калі інцыдэнты і адбываліся, дык толькі па-за сьценамі будынку. Напрыклад, выступ тэатральнай каманды, якая сілком пхала ў рукі дэлегатам блакітныя паветраныя балёнікі, пасьля чаго прадэманстравала для тэлекамэраў БТ і АНТ «пацалунак геяў». Адзін з «геяў» цішком выцер вусны, а журналісты брахалавак з пачуцьцём выкананага абавязку паехалі рабіць «матэрыял пра Кангрэс».

У гэты час у цесным пакойчыку, набітым журналістамі, кіраўніцтва АГП праводзіла пасяджэньне. Было пастаноўлена патрабаваць, каб кангрэс быў сталым органам, дэлегаваўшы паўнамоцтвы па вырашэньні бягучых пытаньняў будучай палітычнай радзе. Толькі з такой умовай Анатоль Лябедзька пагадзіўся падпісаць палітычнае пагадненьне. АГП не задавальняла пазыцыя Алеся Мілінкевіча, які заявіў, што кіраваць кампаніяй адзінага кандыдата мусіць штаб, які павінен мець жорсткую вэртыкальную структуру — каб унікаць гаварыльні і безадказнасьці.

У кулуарах кангрэсу цокаў новы лідэр расейскага Саюзу правых сіл Мікіта Бялых: «Да апошняга моманту ня верыў, што зьбярэцца столькі людзей». Пытаньне, дзе дэмакраты маюць больш працы — у Расеі ці ў Беларусі, — сп.Бялых назваў складаным: «Казаць пра дэмакратычныя пэрспэктывы Расеі цяпер рана. Але сама надзённая праца ў беларускіх дэмакратаў больш складаная, хоць агульная сытуацыя больш спрыяе Беларусі».

### Сутычкі й кампрамісы

Заля набітая бітком. Балькон упрыгожаны трансparантам «Разам — за свабоду і перамены» і выявай мапы Беларусі з сэрцам усярэдзіне. На сцэну выходзіць тузін фотакарэспандэнтаў ды тэлеапэратараў — яны здымаюць прэтэндэнтаў ды VIP-асоб у першых шэрагах. Мілінкевіч зьяўляецца ў залі зь невялікім спазьненьнем і адразу сутыкаецца з павышанай увагай прэсы. Карэспандэнты атачаюць яго шчыльным колам. Раптам гучыць музыка — мэлёдыя з «Полацкага сшытку». Яна многім незнаёмая, але настолькі ўрачыстая, што ўсе ўстаюць. На сцэну выходзяць Зінаіда Бандарэнка і намесьнік старшыні АГП Аляксандар Дабравольскі. Голас народнай артысткі не згубіў сваёй мяккасьці, нават словы «антыдэмакратычны рэжым» гучаць зь яе вуснаў як страшылка з казкі. А.Дабравольскі асьляпляе залю фірмовай усьмешкай.

Першым слова даецца кіраўніку аргкамітэту кангрэсу Аляксандру Бухвоставу. «Па-беларуску гавары!» — гукнуў нехта з балькона. Прамоўца праглынуў папрок, але й заля не падтрымала абструкцыі. Кангрэс — вялікая навука кампрамісаў, і радыкалаў тут успрымаюць як правакатараў.

У той час як Зінаіда Бандарэнка зачытвае прывітаньне ад віцэ-сьпікера Эўрапарлямэнту Януша Анышкевіча, які гаворыць пра пераемнасьць традыцый БНР і першых гадоў новаабвешчанай беларускай незалежнасьці, у залю ўрываецца Андрэй Клімаў, які здолеў атрымаць двухдзённы водпуск ад «хіміі». Ён вылятае на сцэну з букетам лілеяў, прэзэнтуе яго З.Бандарэнцы і пад авацыю займае месца ў залі.

Сьвятло гасьне, на сцэну выплывае вялікі экран, і да залі зьвяртаецца Павал Севярынец. За ягонай сьпінай — лясны краявід. Менавіта тут, на мяжы краіны, кажа Севярынец, найбольш адчуваеш глыбіню беларускай душы. «І ў гэтай глыбіні душы, як з падзем'я, як стогн — Беларусь чакае…» Наступнае віншаваньне — ад Міколы Статкевіча. Ён кажа жорсткія словы, адрасаваныя тым, хто ставіць пад сумнеў легітымнасьць кангрэсу: «Ня верыце ў перамогу — адыдзіце ўбок».

**Працяг на старонцы 5.**



АЛЯКСЕЙ ГРОМАЎ

**Пераможца выйшаў на ганак зь бел-чырвона-белым сьцягам на плячах.**

### Трыадзінства кандыдатаў

А.Мілінкевіч прапанаваў кіраўніку АГП А.Лябедзьку ўзначаліць Нацыянальны камітэт (ценевы ўрад). Кіраваць выбарчым штабам адзіны кандыдат прапанаваў другому з сваіх ранейшых супернікаў — лідэру ПКБ С.Калякіну.

### Вайтовіч пераацаніў сілы

У газэце «Народная воля» быў надрукаваны зварот руху «За вызваленьне Беларусі ад дыктатуры». У ім было напісана, што каардынатарамі руху будуць у Менску Зьміцер Дашкевіч з «Маладога фронту», а на Гарадзеншчыне — Алесь Зарамбюк, дэпутат Мастоўскага райсавету. Між тым хлопцы, як нам стала вядома, не давалі згоды і чуць ня чулі пра такія ідэі. На якіх жа актывістаў разьлічвае Вайтовіч, калі нават каардынатараў ня мае?

### Мілінкевіч працягне Лукашэнкаў курс

У інтэрвію расейскай службе радыё «Свабода» адзіны кандыдат паабяцаў: «Тое добрае, што было пры Лукашэнку, будзе захаванае. Ён ня даў раскрасьці, і мы не дадамо раскрасьці. Ён выплачваў пэнсіі, няхай невялікія, але ў час, і мы гэта прадоўжым». Але беззаконьня, якое панавала пры Лукашэнку, пры новай уладзе ня будзе, дадаў ён.

### ...але не дае гарантый Лукашэнку

У прамове на Кангрэсе А.Лябедзька паабяцаў Лукашэнку гарантыі асабістай бясьпекі, дэкляраваўшы бясьпеку прэзыдэнцкай сям'і і капіталам — у выпадку, калі той адмовіцца ад улады. Алесь Мілінкевіч палічыў патрэбным паправіць паплечніка на прэс-канфэрэнцыі: «Гарантыі бясьпекі можна даваць толькі таму чалавеку, які не зрабіў злачынства. Калі будзе даказана, што хтосьці зь сёньняшніх кіраўнікоў дзяржавы ўчыніў злачынствы, я не магу даць такіх гарантый».

### ...і гатовы лічыцца з Расеяй

Лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі заявіў у інтэрвію газэце «Московский комсомолец», што «гатовы ўлічваць геапалітычныя інтарэсы Расеі». Інтэграцыя для яго — важна, але незалежнасьць — яшчэ важнейшая. «Бо лепш жыць асобна ў катэджах, чым разам у камуналцы».

### Лябедзьку на перапраўе не мяняюць

Палітрада АГП 5 кастрычніка не прыняла адстаўкі А.Лябедзькі. Ён пагразіў сыходам, калі частка актывістаў партыі збунтавалася супраць вынікаў Кангрэсу. На думку А.Лябедзькі, такія настроі падаграюць лукашысты. Вынікі форуму дэмсілаў ён лічыць справядлівымі, а захаваньне адзінства — галоўнай задачай: «АГП тры гады будавала мост, які злучыў палітычную прастору ў адно цэлае. Мы ня можам з будаўніка ператварыцца ў мінэра».

### Калякін: Хто выйдзе з кааліцыі, той сябе пахавае

С.Калякін мяркуе, што ўрэшце большасьць актыву АГП будзе працаваць у адзінай камандзе. А хто хоча разваліць кааліцыю, той «хоча зрабіць вялікае пахаваньне сваёй партыі, сваіх лідэраў і астатняга. Той, хто хоча дапамагчы Лукашэнку застацца пры ўладзе, той можа думаць такімі катэгорыямі. Бо працаваць мы будзем не на Мілінкевіча, Калякіна ці Лябедзьку, працаваць мы будзем на дэмакратыю ў Беларусі». С.Калякін зазначае, што А.Мілінкевіч – самастойны палітык, беспартыйны, які імкнецца «збалянсаваць інтарэсы ўсіх суб'ектаў кааліцыі».

### «Известия»: Выбар Мілінкевіча лягічны

Уплывовыя расейскія «Известия» — пра вынікі Кангрэсу: «Мілінкевіч не належыць ні да якой партыі. Рашэньне дэлегатаў зрабіць стаўку на новую, незасьвечаную фігуру ўяўляецца цалкам лягічным».

### Пазьняк крытыкуе Мілінкевіча

Зянон Пазьняк у інтэрвію радыё «Свабода» скрытыкаваў А.Мілінкевіча. На думку З.Пазьняка, асабістыя нацыянальныя погляды А.Мілінкевіча ня маюць значэньня: «Гэта палітыка. Чалавек у адной групе зь людзьмі, якія езьдзяць у Маскву (і просяць у Масквы падтрымку — **Рэд.**). І ён не выказваецца з гэтай нагоды. Ацэньваць трэба вось паводле гэтых паводзінаў». Лідэр КХП—БНФ заявіў, што сам мае намер удзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У залі панаваў энтузіязм.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Лідэр «Правага альянсу» падарыў адзінаму кандыдату боты — каб хадзіў ад дзьвярэй да дзьвярэй.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Першыя словы адзінага: «Я прыйшоў на сцэну з сваёю жонкаю, якую завуць Іна».

# «Магу!» —




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Камуністы дэманстравалі гатоўнасьць пераступіць цераз былыя крыўды. На фота: С.Калякін з камсамольцамі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Лябедзька кляўся на сьвятых кнігах ісьці да канца.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Рашэньне Шушкевіча зьняць сваю кандыдатуру дзеля адзінства заля сустрэла авацыяй.

## АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Добра ці кепска, што ад апазыцыі Лукашэнку будзе процістаяць адзін кандыдат?

**Рамуальд Улан,** экс–выдавец «Новой газеты Сморгони»:

Выдатна, што абралі адзінага кандыдата раней, чым у 2001 г. Цяпер дастаткова часу, каб будаваць далейшую стратэгію.

**Анатоль Сідарэвіч**, публіцыст:

Ня ведаю. Я даўно не аптыміст і вельмі асьцярожны ў сваіх высновах. Ніхто ня ведае, што заўтра будзе.

**Аляксандар Вайтовіч**, акадэмік, экс–сьпікер Савету рэспублікі:

Я ня буду даваць такіх адзнак — «добра» ці «кепска». Я проста канстатую, што ёсьць такі факт. Партыйная частка апазыцыі пайшла такім шляхам, яна выбралі такога лідэра. Гэта іх права.

**Гары Паганяйла,** праваабаронца:

Гэта справа карысная: яна дае магчымасьць сканцэнтраваць вялікую колькасьць людзей у камандзе адзінага кандыдата.

**Лявон Баршчэўскі**, намесьнік дырэктара Беларускага ліцэю:

Канечне, добра. Дзе быў адзіны кандыдат, там апазыцыя выйгравала выбары. Як Каштуніца ў Югаславіі.

**Запісаў Аркадзь Шанскі**

## выбар зроблены

# сказаў Мілінкевіч

Працяг са старонкі 3.

Пасьля прывітальных слоў ад гасьцей з Украіны, Расеі (лідэр СПС абяцае тысячу актывістаў у каманду адзінага кандыдата для вядзеньня выбарчай кампаніі, але гэта, бадай, не дазволена законам) надыходзіць час выступленьняў лідэраў партый.

Пасьля Вінцука Вячоркі з Партыі БНФ і Алены Скрыган ад камуністаў на сцэну выходзіць старшыня «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч. «Малады Фронт падтрымлівае Мілінкевіча. Але мы гатовыя працаваць на любога кандыдата, апрача камуністаў!» — крычыць ён сарваным на пікетах голасам. У залі шум, выгукі «Ганьба». Яўна на адрас Дашкевіча, а ня вучняў Маркса. А.Скрыган разводзіць рукамі ад разгубленасьці. В.Вячорка пачынае на сцэне ёй нешта тлумачыць. Падтрымка адзінага кандыдата, кім бы ён ні быў, — галоўны прынцып яднаньня, безь якога кангрэс губляе сэнс.

Сам З.Дашкевіч на радзе «Маладога фронту» галасаваў за падтрымку А.Лябедзькі, і ягоны дэмарш на сцэне служыць чорную службу А.Мілінкевічу. Дарма сустаршыня «МФ» Сяргей Бахун будзе ў перапынку пэрсанальна прасіць прабачэньня ў кожнага з сустрэтых ім камуністаў: «Гэта было прыватнае меркаваньне Дашкевіча, не арганізацыі».

### Ідэйная вэртыкаль

Другі дзень распачаўся з выступаў прэтэндэнтаў. Паводле лёсаваньня, першым трымаў слова А.Лябедзька. Старшыня АГП паабяцаў у выпадку посьпеху на прэзыдэнцкіх выбарах імкнуцца зрабіць Беларусь «нэўтральнай, як Швайцарыя, і заможнай, як Нарвэгія». Прысягу ісьці да перамогі ён прынёс на Бібліі, Канстытуцыі-1994 і томіку твораў Быкава.

Сяргея Калякіна прадстаўляў прафэсар Беларуска-расейскага ўнівэрсытэту з Магілёва Валеры Беразіенка. Камуністы адказалі маладафронтаўцам ударам на ўдар: «Я ўпэўнены, што перадвыбарную кампанію Сяргей Іванавіч арганізуе самым лепшым чынам, а крыкі і размахваньне бел-чырвонымі сьцягамі не дабавяць ніводнаму нашаму кандыдату галасоў». Выступ Беразіенкі быў перарваны сьвістам.

Залагоджваць эмоцыі давялося самому Калякіну. «Мы не такія з вамі моцныя, каб пасварыцца з-за сур’ёзных рэчаў, якія не зьяўляюцца галоўнымі сёньня. Мы мусім сканцэнтраваць намаганьні дзеля таго, дзеля чаго тут сабраліся, — каб вярнуць Беларусь на шлях дэмакратыі», — грымеў ён пад авацыю залі.

Уражвала, што Калякін зусім не гаварыў пра сябе, а выключна пра важнасьць згуртаваньня вакол адзінага кандыдата, хто б ім ні стаў.

Выступ Алеся Мілінкевіча, як і Лябедзькаў, пачаўся зь відэапрэзэнтацыі, адзьнятай на ягонай малой радзіме — у Берштах. «Будзе сур’ёзная вайна, а на вайне не бывае шматуладзьдзя», — сказаў ён. Так ён адказаў на патрабаваньне лідэраў АГП паставіць дзейнасьць штабу адзінага кандыдата пад кантроль органаў, створаных кангрэсам.

На думку Мілінкевіча, лукашэнкаўскай уладнай вэртыкалі трэба проціпаставіць ідэйную дэмакратычную вэртыкаль. Толькі так можна перамагчы. «Хто супраць жалезнай дысцыпліны, хай той за мяне не галасуе», — папярэдзіў ён.

Мілінкевіч кантраставаў з папярэднімі аратарамі. Ён амаль не жэстыкуляваў, гаварыў ня гучна, бяз хатніх нарыхтовак, і яўна хваляваўся. Ён зрабіў акцэнт на традыцыйных каштоўнасьцях — свабода, мова, культура, беларуская школа, прыстойнасьць. «У 1991-м Беларусь стала незалежная. У 2006-м мы здабудзем Беларусі свабоду. Назаўсёды!» — адрэзаў ён у канцы. Заля выбухнула апладысмэнтамі і зрабілася ясна, што Мілінкевіч на «перадвыбарах» сабраў найбольш прыхільнікаў.

### Шушкевіч жартуе

Станіслаў Шушкевіч шмат жартаваў, чым дапамог залі ачысьціцца ад непрыемнага ўражаньня, пакінутага канфліктам камуністаў і маладафронтаўцаў ды недагаворкамі-непаразуменьнямі паміж камандамі Лябедзькі і Мілінкевіча. І, прадэманстраваўшы свае віртуозныя якасьці прамоўцы, ён выклікаў сапраўдны фурор рашэньнем зьняць сваю кандыдатуру на карысьць пераможцы. Заля пляскала стоячы.

Пачаліся прамовы прыхільнікаў кандыдатаў. «Вы ўсе чыталі маё інтэрвію? Я сказаў, што пераможа Мілінкевіч. Але сёньня я выступаю за Анатоля!» — узарваў аўдыторыю Клімаў. Яго падтрымаў Дабравольскі.

Навуковец Валянціна Трыгубовіч агітавала за Мілінкевіча. «Яму закідаюць, што ён не гаваркі. Ды хіба мы выбіраем гарманіста для калгаснай вечарыны?» — пыталася яна.

У цэлым агітатары за Мілінкевіча выступалі значна млявей за канкурэнтаў. Складалася ўражаньне, што каманда гарадзенцаў не рыхтавалася да дэбатаў ці недаацаніла супернікаў.

### Камуністы ламалі стэрэатыпы

А вось агітатары за Калякіна былі падабраныя філігранна. Першай да трыбуны выйшла элегантная кабета, што зрабіла акцэнт на выдатных прамоўніцкіх і чалавечых якасьцях лідэра камуністаў. Другім на сцэне зьявіўся настаўнік з Маладачаншчыны, дэпутат райсавету сп.Бычак. Ягоны выступ на цудоўнай беларускай мове (лепшай за Вячоркаву, дайце веры) абверг стэрэатыпы пра антыбеларускасьць шараговых камуністаў. Заля вітала яго авацыяй.

Камуністы адзінагалосна падтрымалі рэзалюцыю ў абарону беларускай мовы. А С.Калякін паабяцаў авалодаць беларушчынай за два месяцы з дапамогай старшыні Таварыства беларускай мовы Алега Трусава.

### Лябедзька ў ролі Тараса Бульбы

Надышла чарга адказаў на пытаньні. А.Лябедзька выкарыстаў нагоду, каб апраўдацца за ўдзел у камандзе Лукашэнкі. «Калі дэлегаты лічаць, што я яго спарадзіў, прашу вас, як Тарас Бульба, дайце мне шанец...». Зноў авацыя.

С.Калякін быў вымушаны тлумачыць, што сучасныя камуністы — зусім не сталіністы.

Толькі Алесь Мілінкевіч ня меў праблем са шкілетамі ў шафе, таму на пытаньні адказваў упэўнена. «А ці ты можаш?» — напісаў нехта ў адной з цыдулак. «Магу!» — адказаў Мілінкевіч. Магчыма, гэты жарт і перадвызначыў лёс Кангрэсу. Справу вырашаць літаральна некалькі галасоў.

### Вырашалі галасы камуністаў

Нарэшце, галасаваньне. Першы тур. За С.Калякіна аддаюць галасы 152 чалавекі (18,7%), за А.Лябедзьку — 263 (32,3%), за А.Мілінкевіча — 383 (47,1%). 13 чалавек прагаласавалі супраць усіх.

Галоўнае пытаньне другога туру: за каго камуністы? Як «НН» стала вядома, ЦК ПКБ загадзя вырашыла ў выпадку другога туру падтрымаць А.Лябедзьку. З улікам партыйнай дысцыпліны камуністаў гэта схіляла шалі на карысьць АГП.

Пакуль падліковая камісія лічыла, у залі рабілі сабе піяр асобныя дэлегаткі і адзінокія палітыкі. Нарэшце на сцэну выходзіць Сяргей Альфер, намесьнік старшыні АГП. «Альфер сумны — Толік прайграў!» — гаруе мой сусед з чырвоным конікам на лацкане.

«Сярод 809 бюлетэняў выявілі 3 несапраўдныя. 391 голас быў аддадзены за Анатоля Лябедзьку, 399 — за Аляксандра Мілінкевіча». Заля ўзарвалася воплескамі, крыкамі «Жыве Беларусь!», замільгацелі ўспышкі фотаапаратаў — Мілінкевіч падняўся са свайго месца і, вітаючы залю, падняў рукі.

Першыя словы адзінага: «Я прыйшоў са сваёю жонкаю, якую завуць Іна», — патанулі ў апладысмэнтах.

### Першы сярод роўных

Адзіны кандыдат пачаў з выказваньня павагі да канкурэнтаў: «Сёньня я першы сярод роўных. Вельмі спадзяюся на вас усіх — незалежна ад таго, якія ў нас погляды, нацыянальнасьці, якой мовай гаворым, незалежна ад таго, да якога храму ходзім, якія кніжкі чытаем. Толькі ў адзінстве сіла. Я ўпэўнены, што мы пройдзем да агульнай мэты агульным шляхам, у гэтым залог нашай перамогі, у гэтым залог будучыні нашай краіны. Гэта сьвятое — воля, свабода, Беларусь! Жыве Беларусь!»

Словы Мілінкевіча пятнаццаць разоў перапыняліся апладысмэнтамі. Найбольшыя прагучалі пасьля фразы «Я сьвята веру ў перамогу!» Засталося паспачуваць «Краме», якой пасьля сканчэньня Кангрэсу давялося іграць для напаўпустой залі. Большасьць дэлегатаў пакінулі яе ўсьлед за адзіным кандыдатам.

Падчас абвяшчэньня вынікаў было відаць, што А.Лябедзьку нялёгка даецца ўсьведамленьне таго, што ён саступіў. Яго можна зразумець — у любой краіне палітык, які аднойчы прайграў перадвыбары, рэдка калі мае шанец паўтарыць спробу. «Я хачу яшчэ раз пацьвердзіць, што абавязацельствы па кааліцыі мы выканаем, — запэўніў лідэр АГП на прэс-канфэрэнцыі. — Я ня мог прайграць Мілінкевічу. Для мяне пройгрыш быў бы толькі Лукашэнку».

«Я задаволены вынікамі галасаваньня, — кажа Алесь Шчарбак з Шклова, чалец БСДП «Грамада» Казуліна. — Мілінкевіч — свой хлопец, ён беларусам характарам блізкі».

Іна Кулей чакала мужа ля машыны. «Аляксандар — моцны лідэр, ён можа! — сказала яна карэспандэнту «НН». — Ён здольны весьці людзей за сабою. А на мяне, вядома, вялікая адказнасьць, бо ўжо заўтра яму трэба пачынаць працаваць».

Нарэшце, зь бел-чырвона-белым сьцягам на плячах на ганку палацу зьявіўся сам кандыдат. Яго адразу абступілі людзі — старыя, моладзь. Ён цісնуў рукі, адбымаўся, фатаграфаваўся на памятку. І калі ён ужо сядаў у сваё няновае «Пэжо-605», і пакуль жонка праз груд людзей асьцярожна выводзіла аўтамабіль на вуліцу героя рэвалюцыі Лазно, перад палацам аўтабудаўнікоў не сьціхала натхнёнае «Жыве Беларусь!».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Мілінкевіч як аратар

**Мілінкевіч не дэмагог. Гэтым ён розьніцца ад многіх беларускіх палітыкаў. І гэтым падкупае.**

Адзінаццаць гадоў кіраваньня Лукашэнкі паказалі, што яго немагчыма перакрычаць. Два дні кангрэсу давялі, што Мілінкевіч такой мэты ня ставіць.

Мілінкевіч не грымеў, як Калякін, і ня кляўся на Бібліі, як Лябедзька. Ён падкупаў іншым: грунтоўнасьцю і шчырасьцю, нават лёгкім хваляваньнем.

Мілінкевіч робіць тое, чаго Лукашэнка ня ўмее, — вядзе гутарку. Кожная прамова Мілінкевіча — гэта перш за ўсё дыялёг з слухачамі.

Мілінкевіч пачынае размову ці прамову не зь сябе, а з суразмоўніка, і найчасьцей — з падзякі яму. Так было на Кангрэсе і ў шматлікіх інтэрвію падчас яго. Ён дзякаваў настаўнікам, якія сьвяткавалі свае прафэсійнае сьвята, дзякаваў сваім супернікам, дзякаваў прэсе.

За час Кангрэсу Мілінкевіч ні разу не павысіў голасу. Ён размаўляе з трыбуны так, нібы размаўляе з сваімі роднымі. Мілінкевіч прамаўляе не да тэлеаб’ектыва і мікрафона — ён зьвяртаецца да слухача як да сябра, які сустрэўся яму на вуліцы.

Мілінкевіч думае па-беларуску. Беручы пад увагу прысутнасьць замежных карэспандэнтаў, падчас прэс-канфэрэнцыі ён паабяцаў адказваць па-расейску, але, незаўважна для сябе самога, зьбіваўся на беларускую.

Мілінкевіч не размахвае рукамі. Хіба што зрэдку сьціскае два свае вялікія кулакі. Калі Лукашэнка — грубая сіла, дык Мілінкевіч — спакойная сіла.

Сябры па змаганьні кажуць, што за вонкавай мяккасьцю ў Мілінкевічу хаваецца цьвёрды лідэр. Цьвёрды да жорсткасьці, прыхільнік дэмакратычнага цэнтралізму і жалезнай дысцыпліны.

Праз свой немалы рост (190 см) Мілінкевіч зь фірмовай усьмешкай нахіляецца да суразмоўніка. У ім няма ганарлівасьці, але адчуваецца высакародзтва. Чатыры пакаленьні ягоных продкаў былі настаўнікамі.

Мілінкевіч не трыбунны аратар. Ён ня чэша як па-напісанаму. Ён робіць паўзы, спачатку думае, а потым гаворыць. Ён ужывае мінімум рытарычных фігур. Які рэзкі кантраст да бясконцага вісклівага маналёгу, што цягнецца ад 1994 году!

**Алесь Кудрыцкі**

# Лукашэнка здае «Белтрансгаз»?

Працяг з старонкі 1.

Цяпер дзяржава жадае скупіць усе акцыі «Белтрансгазу».

Некалькі гадоў таму калектыў «Белтрансгазу» набыў акцыі падчас чэкавай прыватызацыі па льготнай цане (каля $2). Цяпер намінал складае 2,5 даляра.

Калі 11 кастрычніка «Белтрансгаз» стане дзяржаўным прадпрыемствам, зацьвердзіць гэтае рашэньне мусіць А.Лукашэнка, бо з 1998 г., пасьля прыняцьця прэзыдэнцкага дэкрэту, у краіне ўведзены маратор на рух акцый, набытых на льготных умовах.

**ААТ «Белтрансгаз»** распараджаецца газатранспартнай інфраструктурай Беларусі. Статутны фонд — 1,15 трлн руб.

### ПРА ТОЕ САМАЕ

## «Камсамолка»: Лукашэнка ўсё нам аддасьць

«Расея атрымала рэальны шанц вярнуць Беларусь у сфэру свайго ўплыву. І шанц гэты даў ёй зусім не Аляксандар Лукашэнка, а яго палітычныя праціўнікі, — сьцьвярджае «Комсомольская правда». — Сам ход з вылучэньнем у кандыдаты сьвежай, незаезджанай фігуры (Мілінкевічавай. — **Рэд.**) сьведчыць: за справу ўзяліся прафэсіяналы ў галіне перадвыбарных тэхналёгій». Лукашэнку, піша «Камсамолка», здорава прыперлі да сьценкі. «Ён, вядома, мае 30 працэнтаў цьвёрдай падтрымкі электарату. Гэта яго стабільная база. Але яе можа аказацца недастаткова. Адзіная надзея беларускага прэзыдэнта ў такой сытуацыі — Расея», — мяркуе камэнтатар.

Каб атрымаць падтрымку з усходу, «Лукашэнку давядзецца пайсьці на саступкі». «Лукашэнка ніяк не хацеў прымаць вядомую схему Пуціна «мухі асобна — катлеты асобна» і не дапускаў буйны расейскі бізнэс да акцыяніваньня ключавых прадпрыемстваў рэспублікі, цяпер усё памяняецца, піша «Камсамолка».

## Хай бурда, але свая

Любая колькасьць завезенага ў краіну імпартнага ячменю будзе цяпер разглядацца як карупцыя й нанясеньне страты дзяржаве й сялянству. А.Лукашэнка адмыслова сабраў нараду па пытаньнях загатоўкі ячменю, каб папярэдзіць кіраўніцтва піваварных заводаў аб недапушчальнасьці закупкі ячменю за мяжой. Валавы збор гэтай культуры ў Беларусі ў гэтым годзе склаў 320 тысячаў тон. Цяпер беларускія бровары мусяць закупаць толькі айчынны ячмень.

Спажываньне піва ў краіне расьце (сёлета — на 30%), аб'ёмы экспарту беларускага ячменю за мяжу таксама павялічваюцца. Але айчынныя заводы наракаюць, што буйныя партыі беларускага ячменю не дацягваюць да стандартаў. Дык што ж, будзем піць бурду, затое прэзыдэнцкая праграма імпартазамяшчэньня будзе выканаая.

У Беларусі цяпер 15 піваварняў, праўда, адна зь іх — Мазырская — выпускае цяпер толькі безалькагольныя напоі.

**Яўген Васілеўскі**

**Доля вытворцаў піва ў Беларусі, 2005 год (у адсотках):**

ААТ «Крыніца» — 50,4
ААТ «Лідзкае піва» — 12,4
ААТ «СП ТАА Рэчыцапіва» — 10,0
ААТ «Аліварыя» — 9,2
ААТ «Берасьцейскае піва» — 8,5
ААТ «Полацкае піва» — 3,1
Гарадзенскі бровар — 1,4
Магілёўскі бровар — 1,3
Аршанскі бровар — 1,0
Бабруйская бровар «Сябар» — 0,9
ААТ «Маладэчнапіва» — 0,6
Слуцкі бровар — 0,6
ААТ «Віцебскае піва» — 0,3
СТАА «Дзвінскі бровар» — 0,1

# Новыя правілы паводзін у зоне

Урад бярэ пад кантроль свабодныя эканамічныя зоны.

З 1 кастрычніка ва ўсіх шасьці свабодных эканамічных зонах краіны прэзыдэнцкім указам №262 уведзеныя адзіны прававы рэжым і адзіныя меры адказнасьці за парушэньне ўмоў працы рэзыдэнтаў.

СЭЗы ствараюцца дзеля прыцягненьня інвэстыцый, укараненьня новых тэхналёгій і разьвіцьця імпартазамяшчальных вытворчасьцяў. Цяпер іх шэсьць — па адной у вобласьці. Агульная колькасьць рэзыдэнтаў — 280, найбольш іх у СЭЗ «Берасьце» (98). За першае паўгодзьдзе 2005 г. прадпрыемствы-рэзыдэнты экспартавалі прадукцыі — мэблі, лядоўняў, харчаваньня — на $237 млн. Галоўны рынак збыту — Расея, туды ідзе 79% прадукцыі.

З 1 кастрычніка СЭЗы чакаюць зьмены. Паводле ўказу прэзыдэнта, цяпер падаткі будуць плаціцца ўсімі рэзыдэнтамі зон па адзіных стаўках. Спэцыяльны прававы рэжым — мытныя й падатковыя льготы — будзе пашырацца толькі на прадукцыю ўласнай вытворчасьці рэзыдэнтаў пры ўмове яе рэалізацыі на экспарт і на імпартазамяшчальныя тавары, што прадаюцца ў Беларусі. Сьпіс такіх тавараў мусіць штогод узгадняцца асабіста прэзыдэнтам.

Сёлета ў сьпіс імпартазамяшчальнай увайшлі 169 найменьняў: ежа (рыба й морапрадукты, бульбяная мука і г.д.), упакоўка для прадуктаў, лакі, фарбы, клеі, сродкі абароны расьлін, аднаразовы посуд, сантэхнічныя вырабы, мэтал, тэхналягічнае абсталяваньне.

### ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

**Салігорск будуе шосты руднік**

«Беларуськалій» плянуе ў наступным годзе распачаць будаўніцтва шостага рудніка. Ён будзе невялікай магутнасьці — 1,5 млн тон руды ў год і будзе ўведзены ў 2007 г. Аб'ёмы вытворчасьці цяпер складаюць 8 млн тон у год. Рэсурсы першага й другога руднікоў, якія працуюць з 1963 г., хутка будуць вычарпаныя.

**Візыт прэм'ера Малдовы**

Беларуска-малдаўскі тавараразварот у 2006 г. мае скласьці $200 млн (сёлета — $100 млн). Пра гэта вялася размова падчас візыту ў Менск малдоўскага прэм'ер-міністра Васіля Тарлева. Сёлета ў Менску мяркуецца стварыць «Дом віна» — недзяржаўнае прадпрыемства, пад кантролем якога будзе 75% малдаўскага віна, імпартаванага ў Беларусь.

**Яшчэ аўтобусаў!**

Сёлета «Менсктранс» набыў 170 аўтобусаў, 52 тралейбусы, 8 трамвайных вагонаў і 24 вагоны мэтро агульным коштам 90 млрд руб.

**Чарговы GSM-рэкорд**

Колькасьць карыстальнікаў-абанэнтаў GSM-сувязі ў Беларусі перасягнула адзнаку ў тры з паловай мільёны. На 1 кастрычніка колькасьць абанэнтаў МТС у краіне склала 1 млн 860 тыс., а Velcom — 1 млн 645 тыс. Доля МТС на рынку мабільнай сувязі складае 51,6%, Velcom — 45,6%, «БелСэл» — 2,8%.

**Прагнозы спраўдзяцца**

Рост ВУП чакаецца на ўзроўні ад 9—9,5%, што адпавядае плянам Міністэрства эканомікі, але ў сельскай гаспадарцы рост складзе толькі 3%, запаволіцца рост вытворчасьці спажывецкіх тавараў.

**ЗД**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

**на 6 кастрычніка**

1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 5710,86 рубля
1 ангельскі фунт — 3 794,96
1 швайцарскі франк — 1 657,35
1 латвійскі лат — 3 692,62
1 літоўскі літ — 745,744 56
1 польскі злоты — 654,49
1 расейскі рубель — 75,13
1 украінская грыўна — 424,38

**Паводле Нацбанку**


# Патрабуй сваё!

Многія чытачы скардзяцца, што стала цяжка купіць «НН» у шапіках. Рэч у тым, што дзяржаўным распаўсюдніцкім арганізацыям забаронена павялічваць колькасьць асобнікаў «НН» у продажы. Улады спрабуюць падперці кіем гару — стрымаць нацыянальнае станаўленьне Беларусі. Што рабіць чытачам? Ласкава прасіце кіяскёрак заказваць больш асобнікаў газэты. А таксама — падпісвайцеся! Гэта можна зрабіць на любой пошце. Падпісны індэкс «НН» 63125. Падпіска каштуе 4510 рублёў на месяц. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3440 руб. на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі праўдзівай інфармацыі і вострых камэнтароў штотыдзень. Дык падпісвайся!




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Чытачка «НН» Ксеня Раковіч сёлета паступіла ў Гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа.**

# Лішкі бранятанкавай прадукцыі

У турму трапіў дырэктар Барысаўскага танкарамонтнага заводу, які вінавацілі ў кантактах з рэжымам Хусэйна.

Ваенная калегія Вярхоўнага суду 30 верасьня пакінула бязь зьменаў прысуд, вынесены начальніку Барысаўскага танкарамонтнага заводу Ўладзімеру Сакачу і намесьніку дырэктара па маркетынгу Ўладзімеру Дземяшкевічу. На касацыйнае пасяджэньне прыйшлі толькі сваякі і сябры падсудных. Сакача і Дземяшкевіча на пасяджэньні не было — зь ліпеня яны знаходзяцца ў сьледчым ізалятары.

Беларускі ваенны суд 14 ліпеня прызнаў Сакача і Дземяшкевіча вінаватымі па ч.4 арт.210 (крадзеж у асабліва буйных памерах са злоўжываньнем службовым становішчам, учынены групай асоб па папярэдняй змове), асудзіўшы на шэсьць гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці і забаронай займаць кіраўнічыя пасады цягам пяці гадоў. З кожнага таксама будзе спагнана па 529 млн рублёў на карысьць 140-га рамонтнага заводу за нанесеную матэрыяльную шкоду.

У.Сакач кіраваў рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «140-вы рамонтны завод» з 1991 г. Мае вялікую колькасьць узнагарод, сярод якіх — ордэн «За службу Радзіме», уручаны асабіста Лукашэнкам, і дзяржпрэмію Расейскай Фэдэрацыі. Мае ўзнагароды і Ўладзімер Дземяшкевіч, што прыйшоў на завод 22 гады таму.

Сьледзтва, якое цягнулася два з паловай гады, устанавіла, што на 151-м сховішчы танкарамонтага заводу чатыры гады захоўваліся не пастаўленыя на ўлік 29 патрыманых танкавых рухавікоў. Паводле паказаньняў сьведкаў, Сакач праз Дземяшкевіча выдаў пісьмовае распараджэньне, каб рухавікі не падпадалі пад інвэнтарызацыю. Рухавікі закупілі ў Расеі за 8 млн расейскіх рублёў і прывезьлі ў Беларусь без суправаджальных дакумэнтаў, а праз некалькі гадоў, ужо адрамантаваныя, афармілі па дамове аб купліпродажы за мяжу, у выніку чаго быў атрыманы прыбытак 221 тыс. даляраў. Экспартны кантракт быў узгоднены зь міністэрствамі замежных спраў, абароны, эканомікі і КДБ. Частка атрыманых грошай была пералічана на банкаўскі рахунак заводу, а частка — 187 тыс. даляраў — у бюджэт дзяржавы. Але суд палічыў дзеяньні прадстаўнікоў заводу незаконнымі, зафіксаваў парушэньні ў афармленьні дамовы аб купліпродажы. У матэрыялах сьледзтва не фігуруюць іншыя асобы: «Неўстаноўленая група асоб пад кіраўніцтвам Сакача стварала лішкі бранятанкавай прадукцыі, паходжаньне якой невядомае».

Сакачаў адвакат Леанід Мінчанкаў даводзіў, што рухавікі набываліся, каб выканаць замежны кантракт дзеля прыбытку заводу, а ня дзеля ўласнай выгады. Абарона запатрабавала эканамічнай экспэртызы, адзначаючы, што нельга называць Сакачавы дзеяньні крадзяжом, бо выручаныя сродкі не пайшлі ў ягоную кішэню.

Цікава, што грамадзянскі пазоўнік, прадстаўнік рамонтнага заводу Васільеў, падчас выступу стаў на пазыцыю абароны, паведаміўшы, што прадпрыемства адракаецца свайго пазову: «Увесь завод замёр у чаканьні. Трэба ненавідзець сваю краіну, каб пасадзіць за краты такіх паважаных людзей», — эмацыйна скончыў ён сьпіч. Прадстаўнік пракуратуры Пяцко парыраваў: «Вы кажаце пра пазыцыю кіраўніцтва, а не рабочых заводу».

Сакача ў Бысаве характарызавалі як «моцнага гаспадарніка». Пры ім заробак на заводзе тры гады таму дасягнуў 200 даляраў. Пры гэтым жыў дырэктар танкарамонтнага заводу ня бедна, некаторыя нават кажуць: «у раскошы». Паводле чутак, ён нават меў лецішча ў Крыме.

Пасьля паўгадзіннага абмеркаваньня судзьдзя Валеры Цалко пастанавіў не задавальняць скаргі, пакінуўшы прысуд Сакачу і Дземяшкевічу бязь зьмен. Аднак яны трапілі пад амністыю — тэрмін зьняволеньня зьменшаны на год. «Мы лічым рашэньне суду няправільным, віна Ўладзімера Сакача не даказана. Калі ён пажадае, то будзем абскарджаць рашэньне ў Вярхоўным судзе», — пракамэнтаваў рашэньне Сакачаў адвакат Л.Мінчанкаў.

Сакачаў сын расказвае, што бацьку нялёгка на Валадарцы: «У камэры пад 20 чалавек, за гэты час адзін зь яго камэры павесіўся, а другі вены перарэзаў».

**Сяргей Будкін**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Барысаўскі танкарамонтны завод** (УП «140–вы рамонтны завод») — гасразьліковае прадпрыемства Мінабароны. Заснаванае ў 1948. Займаецца рамонтам танкаў, баявых машын, цягачоў, бронетранспартэраў, а таксама чыгуначнай тэхнікі; вытворчасьцю лесапажарнай тэхнікі. Фігураваў у скандале, зьвязаным з ваеннымі кантактамі Беларусі і Іраку. У Багдадзе быў знойдзены факс на фірменным блянку заводу за Сакачавым подпісам, дзе ішла гаворка пра пастаўкі новай і рамонт старой тэхнікі арміі Хусэйна.

**Уладзімер Сакач**
нар. 1950 у вёсцы Каралін (Зэльвеншчына). Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, пасьля чаго пайшоў на ваенную службу. Прайшоў прыступкі ад намесьніка камандзіра танкавай роты па тэхчастцы да начальніка140–вага рамонтнага заводу. Кавалер ордэна «За службу Айчыне» III ступені за распрацоўку бронемашын «Кобра».

## СЬЦІСЛА

### Была калісьці лаўра

Гаротны стан Куцеінскага манастыра стаў тэмай Першых Куцеінскіх чытаньняў у Воршы. Заснаваны ў 1623 г. праваслаўны манастыр пэўны час меў высокі статус лаўры. На пачатку 1990-х адрэстаўраваная за дзяржаўны кошт мураваная Сьвятадухаўская царква была перададзена адноўленаму манастыру. Аднак у двух былых яго будынках разам з насельнікамі працягваў жыць дзясятак сем'яў. І цяпер у манастыры жывуць дзьве сям'і. Распрацаваны праект рэстаўрацыі і рэканструкцыі кельляў. Але фінансаваньня які ўжо год няма. Сьвятадухаўская царква, выдатны помнік архітэктуры віленскага барока, выклікае ў некаторых царкоўнікаў адмоўныя эмоцыі — быццам бы яна мае ўніяцкі выгляд. Таму й мараць яны яе скалечыць. Дарэчы, распачаліся Куцеінскія чытаньні набажэнствам у гэтай царкве. Цікава, што яго зусім нечакана для прысутных завяршыў адзін зь вернікаў, засьпяваўшы «Магутны Божа».

### Юшкі не пакаштуюць

112 кілаграмаў рыбы было канфіскавана супрацоўнікамі Аршанскай інспэкцыі па ахове расьліннага і жывёльнага сьвету ў двух браканьераў з Барысава. Тыя ноччу амаль пяць гадзін лавілі рыбу з дапамогай электрычнай вуды. Злачынцаў узялі пад варту. Ім пагражае пакараньне ад буйнага штрафу да чатырох гадоў пазбаўленьня волі. Пра браканьераў паведамілі рыбаловы, якія заўважылі, што па Дняпры плывуць здохлыя малькі — яны гінуць масава, а дарослыя рыбы, калі трапляюць пад электраразрад, трацяць здольнасьць да размнажэньня. За электравуду браканьер цяпер прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці Раней жа каралі толькі штрафам.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Лукашэнку Дажынкі, случчакам клопат

Тры месяцы случчакі ў добраахвотна-прымусовым парадку штомесяц пералічвалі ў фонд сьвята, у залежнасьці ад акладу, ад 12 да 20 тыс. руб. Спачатку народ цешыўся, што сьвята пройдзе, а ўпарадкаваны горад застанецца. Аднак колькасьць і арганізацыя спраў, бясконцыя суботнікі і адлічэньні пакрысе сталі выклікаць раздражненьне. Перанос «Дажынак» прынёс яшчэ адзін суботнік зь нядзельнікам у дадатак. Ва ўсіх ёсьць, урэшце, і асабістыя справы, і свая гаспадарка. Таму настрой адналькавы — хутчэй бы перажыць сьвята і зажыць спакойным жыцьцём.

Для каго «Дажынкі» радасьць — гэта злодзеі. Зьнікае шмат чаго: інструмэнт, будматэрыялы, неяк ноччу зьнік КамАЗ з прычапным кранам.

### Слуцкія кукурузьнікі

Гарадзкое насельніцтва масава далучаюць да ўборкі кукурузы. На гэтую справу пасылаюць і школьнікаў з настаўнікамі, і людзей з усіх прадпрыемстваў. Людзі жартуюць, што хутка будуць заробак атрымліваць на заводах, а працаваць у калгасах.

**Сяржук Кут, Слуцак**

### Бывайце, трусовыя шапкі

Канцэрн «Беллегпрам» вырашыў ліквідаваць бабруйскую футравую фабрыку. Сёньня на прадпрыемстве, з улікам базы адпачынку і інтэрнату, працуе 150 чалавек, пераважна жанчыны. Усе яны да 7 лістапада павінны атрымаць поўны разьлік. На сёньня ў Бабруйску 822 працоўныя вакансіі, для жанчын толькі 137.

**Надзея Лісоўская, Бабруйск**

### Дзяржзамова зьела ўсё чыста

Работнікаў сельгасвытворчага прадпрыемства «Імя Дзімітрава» ашукалі. Зьмянілася кіраўніцтва гаспадаркі, і шараговым работнікам было адмоўлена ў выдачы належнага ім паводле калектыўнага дагавору збожжа за сабраны ўраджай. Адмова матывуецца тым, што ў СВК няма збожжа: усё здадзена на дзяржзамову. Проста як пры харчразьвёрстцы…

**Зінаіда Мілешчанка, Круглае**

# Дрыкганты на Малой сцэне

Працяг са старонкі 1.

Займае дух ад асабістай сьмеласьці рэжысэра Ўладзімера Савіцкага: як на такой літаральна малой сцэне можна перадаць маштабны кінэматаграфічны сюжэт? Перадаць, каб мароз па скуры ад пошчаку дзікага паляваньня, вусьціш ад шоргату ў цёмных замкавых лябірынтах? З спэцэфэктамі ўсё ў парадку: сцэна-памост, якая адначасова і замкавая брама, і ходнікі, што калоцяцца ад конскага тупату, і стол, і часам уся Волатава Прорва. Сьвятло, у якім героі зьяўляюцца і зьнікаюць. Касьцюмы-балахоны, што ператвараюць баль правінцыйнае арыстакратыі ў бязьвары натоўп манэкенаў, прывязаных да дрыкгантаў дзікага паляваньня. «Бандыцкія» пальчаткі, чорныя з абрэзанымі пальцамі, на руках прыслужнікаў караля Стаха — нават калі апошнія зьяўляюцца ў зусім бяскрыўдных іпастасях. І — харэаграфія, якая дазваляе рассунуць маленечкі лапік сцэны да памеру верасовых пустак (плястычнае вырашэньне — Яўгенія Кульбачная).

Купалаўцы сьцьвердзілі: пастаноўка «Дзікага паляваньня» на тэатральнай сцэне магчымая. І ўсе свае сілы яны паклалі на адаптацыю тэксту і тэхнічнае яго ўвасабленьне.

Але апроч падлогі, якая раскрываецца, і сюжэту, які ведаеш з кніжкі, хочацца бачыць у пастаноўцы паводле знакавага тэксту — падтэксты, кантэксты, знакі часу. Хочацца чуць падказку Караткевіча, яго адказ на актуальныя пытаньні. Хоць бы нейкі намёк на сёньняшні дзень. Словы пра народ Андрэй Беларэцкі (Раман Падаляка) прамаўляе з пафасам, вартым 1980-х. Па сцэне туляецца малавыразны Дубатоўк (Ігар Дзянісаў), сьледам — Варона (Павал Яскевіч), у якога пасьля фінальнае бойкі на твары зьяўляецца галівудаўская кроў. Але што з таго? Сярод гасьцей маёнтку Балотныя Яліны заўважаецца нейкі «Фларыян Басяцкі з жонкай». Сьмешна, калі гэта жарт. Маналёгі Надзеі Яноўскай, расркладзеныя між акторкай (Ганна Хітрык) і яе лялькай — удалая тэхнічная прыдумка. Але што з тых дробных пэрлаў, апроч падсы для шаноўнае публікі? Што розьніць Надзею Яноўскую ад, скажам, Зоські з «Раскіданага гнязда», пастаўленага ў мінулым стагодзьдзі? У спэктаклі не заўважаецца таго, што бачылася беларускаму воку ў «Тутэйшых» на пачатку 1990-х. Пераасэнсаваньня.

Што такое Дзікае Паляваньне? Гэта ўлада жаху, які паралізуе. Пакуль ты баісься, яно непераможнае. Гісторыя пра яго — адна з тысячы гісторыяў змаганьня чалавека з сваім страхам. Андрэй Беларэцкі рэжысэра У.Савіцкага перамагае свой страх так: знаходзіць Рыгора, хлапчыну ў скуры ваўчынай, і разам яны тоўстымі вяроўкамі вяжуць Дубатоўкаву шляхецкую банду. Што мог бы значыць у наш час спэктакль пра выміраньне шляхты і як зрабіць так, каб ён нешта значыў?

Надзея Яноўская хаваецца ад свайго страху ў вар'яцтва. Амплюа яна падмацоўвае фразамі адсутнай у спэктаклі пані Кульшы. А ратунак знаходзіць, вядома, у каханьні. Фінальная сцэна вартая фільму «Тытанік»: абдымкі, вецер гуляе валасамі й строямі. Ды Капрыё і Кейт Уінсьлет у галоўных ролях. Але гэта яшчэ не канец. Як працяг спэктаклю, глядзіцца авацыя публікі ў маленечкай залі. Любая беларуская імпрэза ў наш час вартая сур'ёзных авацыяў. Разуменьне недайграных акторамі сэнсаў чытаецца на тварах гледачоў. Пасол ЗША ў Беларусі Джордж Крол ідзе да сцэны з кветкамі. Караткевіч ацаніў бы такі фінал.

**Сяргей Мікулевіч**

# Сьціплы шарм стаіцызму

Новы фільм Алега Дашкевіча — пра адзін дзень, пражыты пры рэжыме Лукашэнкі. Піша **Андрэй Расінскі**.

Героі карціны — сам Алег Дашкевіч, трэнэр па боксе, і літаратарка Сьвятлана Курс. Кожны пражывае адзін дзень: праца, турботы, ранішняя кава. Іх штодзённыя справы становяцца люстэркам жыцьця грамадзтва й адбіткам душы.

Сьвятлана адвозіць дзіця ў садок, прымае людзей у якасьці праваабаронцы, піша. Алег навучае суайчыньнікаў боксу, ідзе па восеньскім лісьці, глядзіць тэлевізар.

Трамваем ехаць доўга — у Менску адзіны беларускамоўны садок. А вось так трэба трымаць удар — а так біць.

Героі не гавораць перад камэрай — але мы чуем іхнія галасы.

Аўтар «Маналёгаў» паставіў перад сабой складаную задачу. Перадаць «унутраны маналёг» у дакумэнтальным кіно нашмат цяжэй, чым у мастацкім («Сунічная паляна», «Восем з паловай») ці літаратуры (Іван Карамазаў, Молі Блюм). Зрэшты, аўтар працягвае традыцыі беларускай дакумэнталістыкі («У вайны не жаночае аблічча» Віктара Дашука).

У фільме Дашкевіча кожны з герояў пісаў свой роздум сам. Потым «маналёгі» здымаліся і мантажаваліся паралельна. Завязка, кульмінацыя, развязка не прадугледжваюцца. У выніку такой «нецэнтраванасьці» маналёгі герояў могуць быць завершаныя як хочаш і калі хочаш. Ня ўсім гэта будзе даспадобы.



Баксэр Дашкевіч зьняў фільм пра сябе. На фота кадар зь фільму.

Але фільм заварожвае сваёй стаічнасьцю. Маналёгі Сьвятланы і Алега — гэта маналёгі стоікаў. Беларуская рэчаіснасьць пачатку XXI ст. — калі роднае слова загнанае ў глыбіню душы, час і прастора захопленыя міліцэйскаю формай. Што рабіць? Звыкла й штодзённа рабіць сваю справу. Гэта не пэсымізм, гэта — «загляне сонца і ў наша аконца», назапашваньне сілаў перад рыўком.

**Алег Дашкевіч** (нар. у 1963 у Менску) — трэнэр па боксе, журналіст, рэжысэр. Аўтар фільмаў «Рыцары мары» (1999), «Простыя гісторыі» (2001).

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Знакі волі

У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры адкрылася выстава "слуцкіх паясоў".

На выставе дэманструюцца шыкоўныя залата- і срэбратканыя шаўковыя паясы, зброя, якая адпавядала тым паясам, партрэты стваральнікаў мануфактур па ўсёй былой Рэчы Паспалітай, што выраблялі паясы, людзей, што іх насілі, вобразы сядзіб і палацаў з твораў Напалеона Орды. У невялікай залі сабраны цэльны вобраз эпохі.

Шляхецкі кунтушовы пояс разам з будынкам ратушы ў цэнтры места ўвасабляў сымбаль свабоды і культурнай традыцыі. Паясы мусілі выйсьці з ужытку разам са шляхецкім строем з прычыны абавязковага пераходу да дваранскіх касьцюмаў Расейскай імпэрыі, дзе існаваў напаўвайсковы парадак уніфікаваньня касьцюмаў у службовую форму. Але кунтушовы пояс занадта значыў, каб папросту зьнікнуць. Таму й выраблялася пасьля прыняцьця Канстытуцыі 3 траўня срэбна-зялёныя кунтушовыя паясы: срэбра — воля, зелень — май, вясна. Праз некалькі год, па забароне кунтушовага строя, пояс зрабіўся сымбалем фронды, непадпарадкаваньня. Паясы рэзалі на кавалкі і выкарыстоўвалі паўторна ў дэкараваньні адзеньня сьвятароў. Грамада зьбіралася на малітву ў храме — а перад ёй на сьвятарскіх убраньнях зіхацелі залатым і сярэбраным шытвом знакі свабоды.

Выдатную экспазыцыю падрыхтавалі Ўладзімер Кандрацьеў і Ірына Зварыка.

**Аляксей Хадыка, мастацтвазнаўца**

**Выстава працуе штодня да 13 сьнежня, апроч серады, з 11 да 18-й гадзіны.**

## СЬЦІСЛА

### «Невядомая Беларусь» па-чэску

Чэскае выдавецтва «Dokoran» выдала зборнік эсэ «Невядомая Беларусь». Прадмову да зборніка напісаў Вацлаў Гавал. Выданьню паспрыяла чэская няўрадавая арганізацыя «Людзі ў нядолі». Апрача чэскага, маюць зьявіцца аналягічныя выданьні па-беларуску, па-польску, па-расейску. Сярод аўтараў — Васіль Быкаў, Уладзімер Арлоў, Сяргей Дубавец, Валер Булгакаў. Творы падзеленыя на тры блёкі — «Беларусь вачыма беларусаў», «Беларусь вачыма палякаў» і «Беларусь вачыма расейцаў».

Ідэя выданьня належыць А.Анціпенку й В.Акудовічу. Задача выданьня, на думку сп.Анціпенкі, — зьмяніць адмоўны імідж Беларусі ў сьвеце.

**АШ**

### Сьвята Агінскага над Вяльлёй

25 верасьня ў Залесьсі сьвяткавалі 240-я ўгодкі Міхала Клеафаса Агінскага. У капліцы Агінскіх прайшла імша ў гонар кампазытара й палітыка, выступалі музыкі. На беразе возера быў разгорнуты сьвяточны гандаль. Паўсюль было багата дзятвы, якая радавалася сонцу ды смачнаму марозіву.

Да сьвята з дапамогай Нацыянальнай камісіі UNESCO быў адкрыты інфармацыйны цэнтар у Залескай школе. Пры падтрымцы гэтай арганізацыі налета мае распачацца рэстаўрацыя сядзібы Агінскіх.

**Дар'я Ліс, Залесьсе**

# Фурор Сімаковіч у Варшаве

«Варшаўская восень» — адзін з самых буйных музычных фэстываляў сьвету. Прайшоў ён у 48-мы раз. Задумваўся ён у сярэдзіне 1950-х як фэстываль камэрных жанраў і музычнага тэатру. Ларыса Сімаковіч і «Госьціца» выступілі ў Варшаве ўпершыню, прычым Ларыса — у трох іпастасях: як кіраўніца «Госьціцы», кампазытарка і вакалістка. Яе твор «Зямное і нябеснае» даў назву ўсёй беларускай праграме. Увасобілі яго на сцэне ансамбль «Клясык-авангард» і фольк-тэатар «Госьціца». «Ларыса ўпляла залатую нітачку ў ручнік фэстывалю. Публіка была ў захапленьні», — кажа фагатыст ансамблю Аляксей Фралоў. «Зямное і нябеснае» — твор не рэлігійны. Ён зьвяртаецца да беларускай фальклёрнай спадчыны.

Л.Сімаковіч узяла ўдзел і ў намінацыі «салістка-вакалістка», выканаўшы творы Ашота Заграбяна. «На Радзіме як сьпявачка я незапатрабаваная, а тут мне добра сьпявалася», — гаворыць яна.

Акрамя твораў Л.Сімаковіч, у Варшаве прагучалі таксама кампазыцыі Яўгена Паплаўскага.

**Сяргей Будкін**


# Новы «ARCHE»




**ПЁТРА РУДКОЎСКІ** Нацыянальны дыскурс і лібэральны мардабой. Пасьляслоўе да дыскусіі пра мову «Нямецкай хвалі»
**МІКОЛА КАЦУК** Нявінныя фокусы незалежнай сацыялёгіі
**ЮРЫ ЧАВУСАЎ** Рэвалюцыя і антырэвалюцыя
**МІХАСЬ ТЫЧЫНА** Весткі з паралельнага сусьвету
**АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА** Дабраслаўёныя гарбачоўскія часы
**АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ, ДЗЯНІС НАРЭЛЬ** Сымон Якавюк: адраджэнец, спэкулянт, манархіст і савецкі дывэрсант
**ВІКТАР ЖЫБУЛЬ** Футурыст Пятрусь Броўка
**АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ** Уся праўда пра горад Бобер
**ГАБРЫЕЛЬ ГАРСІЯ МАРКЕС** Каханьне падчас халеры

**Пытайцеся ў кнігарнях**

# «Ксты» і дуліна ў кішэні

Пасьля непрыхавана слабой «Дуліны ад Барадуліна» зьявілася геніяльная senilia «Living Кстоў». Дзьве апошнія кнігі Рыгора Барадуліна паставілі рабром пытаньне аб прыродзе яго таленту. Піша **Аляксандар Фядута**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Некалі таварыш Жданаў А.А., цёзка аднайменнага ўкраінскага гораду, якому справядліва вярнулі імя Марыупаль, гаварыў пра паэтку Ганну Гарэнку: «Ці то манашка, ці то распусьніца, а дакладней распусьніца і манашка, у якой распуста зьмяшаная з малітвай. Такая Ахматава зь яе маленькім, вузкім асабістым жыцьцём, нікчэмнымі перажываньнямі і рэлігійна-містычнай эротыкай...» Так гэты высокапастаўлены чытач характарызаваў творчасьць аднаго з найлепшых лірыкаў XX ст. Сёньняшнія беларускія Марыупалі (то бок Жданавы), накшталт таварыша Скобелева et cetera, жданаўскім красамоўствам не валодаюць. Інакш бы ўжо з добрых месяцаў пяць галасілі пра Барадуліна, не выходзячы са жданаўскай сыстэмы каштоўнасных каардынат. Сам вінаваты быў бы Барадулін. Даў нагоду. Спачатку выйшла кплівая, яскрава аранжавага колеру кніжка «Дуліна ад Барадуліна». Кніжка непрыхавана слабая — найлепшае, што ў ёй было, — гэта дызайн Генадзя Мацура. Але «Дуліна», уласна кажучы, і прэтэндавала ўсяго толькі на статус, заяўлены ў назьве, — была, так сказаць, увасобленай у кніжнай форме насыценнай газэтай радыё «Свабода», галоўнымі героямі якой зьяўляюцца самі супрацоўнікі радыё, іх сябры (у будучыні, мабыць, справа можа дайсьці і да сваякоў). Цікавымі такія зборнікі эпіграм робяцца толькі пасьля сьмерці іх аўтараў і кананізацыі апошніх.

**І спаткаўся з кобрай Скобла,**
**І спытаў,**
**Ці ў шкуры цёпла.**
**Кобра Скоблу не сказала,**
**Вяла джала паказала.**
**Ведала, якія ў Скоблы**
**Словаў лютасныя сьцёблы...**

Вядома, дзякуй аўтару, які забясьпечыў уласную эпіграму яшчэ і сьцісьлым (дарэчы, вялым, як кобрына джала) расказам пра тое, хто такі гэты самы Скобла, паколькі інакш чытацкая аўдыторыя гэтай эпіграмы звузілася б да неймаверна малой велічыні блізкіх і сяброў адрасата. Рыфмы яшчэ могуць захапіць (у аўтара гэтай рэцэнзіі, трэба прызнацца, кола рыфмаў на слова «Скобла» значна бяднейшае), але сама эпіграма ад гэтага больш значным творам ня робіцца. І такіх «скоблападобных» эпіграм у «Дуліне» — больш за палову. Добра хоць адрасаты іх трохі больш вядомыя — накшталт Барыса Кіта ці Анатоля Вялюгіна. Нягледзячы на шум, узьняты ў прэсе, адчуваньне было такое, нібыта паэта Барадуліна больш не існуе, а яго зьмяніла нейкая папсовая фігура, быццам у насьмешку з Паэзіі ўзьнесеная на вяршыню славы. Які час — такія паэты, якая чытацкая аўдыторыя — такія і куміры. Час здрабнеў і глядзіцца ў

Пакуль беларускія чытачы ня будуць ведаць псалмапеўца Барадуліна лепш, чым Барадуліна–эпіграматыста, Нобэлеўскай прэміі мы ня ўбачым.

люстэрка, якім зьяўляецца ўжо не Барадулін, а які-небудзь Бадак. Але рэч у тым, што практычна сьледам за «Дулінай» выйшаў у сьвет іншы барадулінскі зборнік — «Ксты», які аб'яднаў тэксты, так сказаць, духоўна-рэлігійныя. Тыя «Ксты», адзетыя ў сьветла-блакітную сутану, зьвярстаныя не дзівосным кніжным дызайнэрам, а нейкай ня надта сьціплай дамайшматстаночніцай (яна ж карэктарка, яна ж рэдактарка, яна ж на фатаграфіях побач з паэтам, яна ж...), дэманструюць паэзію зусім іншай якасьці, чым франтаватая апэльсінавая «Дуліна».

**«Ты белы воўк», —**
**Сказала мне**
**Да незабыту незабытая,**
**Якую я**
**Ні з кім ня зблытаю**
**Ні пры сьвятле,**
**Ні пацямне.**
**Разгублена перапытаў,**
**Які ён, белы воўк,**
**Тлумачыла:**
**«Я шэрага цябе ня бачыла,**
**Ты белым не сягоньня стаў».**
**Упрочкі рушыла сама**
**Самою —**
**Недаверу хрэсьніца.**
**«Ты белы воўк» —**
**Мая зіма**
**Чорнапраталінкаю весьніцца.**

У Веліміра Хлебнікава быў белы крумкач, які сымбалем адзіноты спусьціўся ў яго геніяльна-прароцкія запісы. Барадулін знаходзіць паэтычную паралель у белым воўку, старым, ня здольным ужо паляваць, але чароўным прыгажосьцю мудрай і велічнай старасьці. Ён лякнічны ў гэтых сваіх вершах-senilia, старэчай лірыцы, як быццам сьпяшаецца давыказацца, датлумачыць тое, што чамусьці дагэтуль засталося незразумелым.

**Ці патрэбен ты сам сабе,**
**Як спытацца ў сябе самога?**
**Ці даўно ён зерне дзяўбе?**
**Чалавек, як гузак на ілбе,**
**Нечакана ўскочыць, каб зьнікнуць.**
**Ад сябе хто зможа адвыкнуць,**
**Можа, й будзе патрэбны сабе...**

Адчуваньне такое, нібыта і «Дуліна» гэтая самая, адкрышталізаваўшыся ў мацураўскай вытанчанай форме, спатрэбілася старому Барадуліну, каб не прывыкаць да сябе самога — як кантраст у дачыненьні да Вечнасьці, адлітай у жорсткіх радках нябесна-воблачнага зборніка «Ксты».

**Чую, Як абрываюцца карані**
**Ад цішыні глыбіні.**

Ці:

**І зоркі, й мы**
**З адной сяўні, й адзін**
**Зярняты сейбіт высяваў шчымліва.**
**Каму застацца небу на ўспамін,**
**Каму ляцець,**
**Як пыл цяжкога мліва...**

Пасьля выхаду зборніка «Ксты» ў прэсе загаварылі пра вылучэньне Барадуліна на Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры. Ня будзем абмяркоўваць рэальнасьць гэтай узнагароды для Дзядзькі Рыгора. Быкаву, куды больш «раскручанаму» ў сусьветным маштабе, і тое давялося пра «Нобэль» толькі марыць... А вось пра сам фэномэн вылучэньня Барадуліна варта сказаць пару слоў. У мяне асабіста няма сумненьняў: Барадулін — найбуйнейшы зь сёньня жывых беларускіх паэтаў, фэльдмаршал паэтычнай арміі Беларусі. Але выйдзіце на двор і папрасіце звычайных, не абцяжараных палітыка-філялягічнымі турботамі чытачоў успомніць некалькі барадулінскіх радкоў. І калі гэтыя чытачы не акажуцца блізкімі і сябрамі якога-небудзь Скоблы, то пачнецца прыпісваньне Барадуліну мноства вершаў — ад «Зоркі Вэнэры» і да «А я лягу-прылягу...». І ўсё гэта будуць цудоўныя вершы, але — не барадулінскія. Таму што «Зорку Вэнэру» напісаў не Барадулін. А Багдановіч. І «А я лягу-прылягу...» таксама напісаў не Барадулін. А Гілевіч. А Барадулін напісаў мноства цудоўных, адточаных, літаратурна бездакорных вершаў. Якіх ня ведае народ. Зрэшты, народ у нас не чытае ня толькі Барадуліна. І тыя, хто пісаў апошнія вершы пра Барадуліна і яго «Дуліну», у масе сваёй таксама, здаецца, сапраўдных барадулінскіх вершаў не чыталі. Яны ня ведаюць яго любоўнай лірыкі, лірыкі філязофскай — а значыць, беларускі народ ня ведае свайго народнага паэта. І таму кожны раз, калі ў прэсе думаюць пра «Нобэль» для найлепшага беларускага паэта, думаюць: «А, гэта той, што «Дуліну» напісаў!..» Бо раскрутка зборніка вершаў, у якім «дзядзька Рыгор» выступае суаўтарам Бога, была значна меншай, чым раскрутка яго радыёэтэрнай фігі, так нясвоечасова выцягнутай старым з кішэні.

**Бачу вочы Твае,**
**Хоць Цябе я ня бачыў ніколі.**
**Чую голас Твой вышні,**
**Хоць ніколі ня чуў я Цябе.**
**Гэтак вязень сьляпы**
**Бачыць вочы забытае волі,**
**Гэтак чуецца голас, зьнядзелены**
**Немай мальбе.**
**А Табою малюся,**
**А Табою сьмялею й баюся,**
**А Табою дазволены жыць,**
**Паміраю й жыву,**
**А Табой паддаюся,**
**А не паддаюся спакусе,**
**А са страхам і верай**
**На плаху Тваю**
**Я кладу галаву.**

Зразумела, што псалом складаней запомніць, чым эпіграму накшталт:

**Кіпіць натхненьне ў чыгунку.**
**Вядзецца гаспадарка плянава,**
**І пішуць тэксты Лучанку**
**Усе — Ад Лукшы да Лук'янава.**

Ці — у найлепшым выпадку — яшчэ што-небудзь, у «Дуліну» гэтую самую не ўвайшоўшае, пры былых бл...яў і былых кадэбістаў. Але да тых часоў, пакуль беларускія чытачы ня будуць ведаць псалмапеўца Барадуліна лепш, чым Барадуліна — кпліўца і эпіграматыста, Нобэлеўскай прэміі па літаратуры мы ня ўбачым. І зусім не таму, што ў нас дрэнныя паэты. Дрэнныя чытачы.

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

# Крэпасьць Івана Жахлівага



ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

У 1563 г. войска Івана Жахлівага ў часе Інфлянцкай вайны разрабавала Полацак. Цар бязьлітасна расправіўся з абаронцамі ды патапіў у Дзьвіне тры тысячы габрэяў. А каб умацавацца на акупаванай тэрыторыі, панабудоўваў на стратэгічных дарогах крэпасьцяў — Сокал, Усьвят, Казьяны, Туроўля, Сітна… У 1579-м Сьцяпан Батура, вярнуўшы Полацак, папаліў і ўсе крэпасьці Івана Жахлівага.

Усяго за кілямэтар ад вёскі Малое Сітна, на паўвысьпе паміж Палатою й возерам Ізмок, можна ўбачыць старажытнае замчышча — рэшткі абарончага валу, унутраны ляндшафт фартэцыі, ямы чорных капальнікаў… і яшчэ каменную пліту, на ўзор надмагільнае — цытую на мове арыгіналу: «В 1563 г. во время Ливонской войны здесь была построена крепость Ситно, которая явилась местом крупных сражений русской армии. Охраняется государством».

Вось так. Прыйшоў Батура, даў высьпятка акупантам — а праз чатыры з гакам стагодзьдзі ўдзячныя нашчадкі ўшанавалі тут «месца буйных бітваў расейскага войска».

Для мясцовых жыхароў «крэпасьць» — прадмет асаблівага гонару. А як жа! Наш цар, наша войска… *Наша крэпасьць!* На замчышчы спрабуюць адкапаць нейкія падмуркі, водзяць сюды з экскурсіямі заезджых і рэгулярна шукаюць скарбы.

Ад тае Сітны амаль нічога не засталося. Крэпасьць была драўляная й згарэла цалкам, людзей у ёй было няшмат, дый за 16 гадоў XVI ст. ці мог хтосьці з салдат схаваць свае грошы на чужой для іх зямлі?

Рэч ня ў гэтым. У кожнай беларускай мясьціне ёсьць свая «крэпасьць Івана Жахлівага». Капішча імпэрскага культу, свой манумэнт гістарычнай хлусьні. Свой апорны пункт акупантаў. Дзесьці гэта музэй Суворава, дзесьці капліца Пятра І, у Полацку — кірмаш «Стралецкі», паўсюдныя помнікі Леніну й адноўленыя «лініі Сталіна». Гэтыя фарпосты, расстаўленыя па беларускай зямлі, утвараюць цэлую сыстэму духоўнае акупацыі.

Вось і ў Сітне крэпасьць Івана Жахлівага дагэтуль (праз 440 гадоў!) спраўна функцыянуе, стаіць на варце імпэрскага міту ў галовах вяскоўцаў. І паглядзіце — які забясьпечвае кантроль над розумамі!

Колькі эўрапейскага вы знойдзеце ў гэтай вёсачцы амаль у самым цэнтры Эўропы? Дзясятак акуратных палісаднікаў, некалькі спадарожнікавых талерак ды пару іншамарак у супрацоўнікаў лясгасу?.. А вось спадчына азіятчыны скрозь і ўсюды. Самадурства начальнікаў ды рабства народу, павальны алькагалізм ды разваленыя платы, кволае земляробства ды дзікае зьбіральніцтва, сьмецьце, качэўніцкі мат і, у дадатак да ўсяго, пачуцьцё гонару за нашага цара Івана Грознага, які ў XVI ст. вось на гэтым самым месцы даў дыхту нейкім там ворагам расейскага народу. Дзе яшчэ ў Эўропе вы ўбачыце перапоўненыя бакі для сьмецьця проста на могілках? Драпежніцкую вырубку нясьпелага лесу, якому яшчэ расьці й расьці, на экспарт за капейкі?

Мае гістарычныя выкладкі пра *нашага Сьцяпана Батуру*, выгнаньне стральцоў і спаленьне Сітна сталі для вяскоўцаў грымотамі сярод яснага неба. Іван Грозны — захопнік?.. Зрабаваў Полацак?.. Крэпасьць — чужая?

Кажуць, на замчышчы, дзе стаяла крэпасьць Сітна, маюць будаваць царкву. Цудоўны адказ капальнікам і рабам няяснай імпэрыі: «Шукайце ж найперш Царства Нябеснай праўды яго, а ўсё астатняе дасца вам» (Мацьвея 6:33). Бо толькі Бог можа заняць у душах вясковых беларусаў тое сьвятое месца, якое стагодзьдзямі акупаваў прывід вялікай імпэрыі. Адно толькі хацелася б, каб набажэнствы спраўляліся панаску. Каб не раздавалі там, як у Пакроўскай царкве ў Полацку, чарнасоценных лісткоў пра «плян Далеса для СССР», сьвятасьць Вялікай Русі ды сусьветную сіяніцкую змову. Бо тады гэта будзе проста аднаўленая Крэпасьць Івана Жахлівага.

Каб такога ня здарылася, у 2006-м абавязкова трэба перамагаць!

*в. Малое Сітна*



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Пад Бярозаю адчыніліся могілкі салдатаў вэрмахту. Сюды звозяць парэшткі з усёй Берасьцейшчыны. На адкрыцьці сустрэліся пераможаныя і пераможцы. Першыя прасілі дараваньня, другія не трымалі зла.**

СЬЦІСЛА

**Звальняюць Віктара Борыса**

Капітана міліцыі **Віктара Борыса** зьбіраюцца звольніць з Гарадзенскага РУУС, як паведаміла 4 кастрычніка ягоная сястра Анжаліка. На яе думку, яму помсьцяць за дзейнасьць сястры і за подпіс пад лістом да Лукашэнкі ў абарону Саюзу палякаў.

**Марыніч абскарджвае**

Палітвязень **Міхаіл Марыніч** 4 кастрычніка падаў скаргу на рашэньне турэмнай камісіі, якая адмовіла яму ў датэрміновым вызваленьні.

**Штраф за карыкатуры**

Суд Першамайскага раёну Менску 23 верасьня аштрафаваў рэдактара газэты «Згода» **Аляксея Караля** й яго намесьніка **Аляксандра Зьдзвіжкова** на 100 базавых велічынь (2,55 млн руб.) кожнага «за распаўсюд у СМІ загадзя лжывых зьвестак». Падставай сталі каляжы, надрукаваныя ў газэце.

**Ператрусы ў Віцебску**

24 верасьня міліцыянты правяліператрус у 24-гадовага будаўніка **Ўладзіслава Анішчанкі**: у роспытах яны цікавіліся дзейнасьцю незарэгістраванай арганізацыі «Зубр». 26 верасьня на вуліцы міліцыянты затрымалі актывістаў КХП — БНФ **Уладзімера Плешчанку** й **Аляксандра Салаўяна**, правялі іх асабісты надгляд. У Плешчанкі знайшлі ўлёткі. 29 верасьня правяліператрус у беспартыйнага **Юр'я Купрыянава**.

**Суды ў Берасьці**

Берасьцейскі абласны суд 26 верасьня не задаволіў скаргі прафсаюзнага актывіста **Валянціна Лазарэнкава** й кіраўніка берасьцейскай філіі РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт» **Ігара Маслоўскага** на рашэньне раённага суду: у жніўні іх пакаралі штрафамі за арганізацыю сэмінару.

28 верасьня гэты ж суд не задаволіў скаргу актывіста ПКБ **Анатоля Новіка**: яго аштрафавалі на 40 б.в. (1 млн 20 тыс.) за правядзеньне партыйнага сходу, які быў кваліфікаваны як несанкцыянаваны сход.

**Канец «Курьера из Борисова»**

Калегія гаспадарчага суду Менскай вобласці 27 верасьня адхіліла касацыйную скаргу ТДА «Прэс-сэрвіс» — заснавальніка недзяржаўнай газэты **«Курьер из Борисова»**. Прадпрыемства абскарджвала судовае рашэньне ад 24 жніўня наконт ліквідацыі.

**Справа Скрабца**

Палітвязьня **Сяргея Скрабца** 27 верасьня перавялі ў турэмны шпіталь па стане здароўя. 3 кастрычніка пракуратура закончыла расьсьледаваньне ягонай крымінальнай справы: экс-дэпутата вінавацяць у незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці, вымантачваньні крэдытаў і падрыхтоўцы да даваньня хабару ў буйным памеры.

**Горадня: франтавыя зводкі**

**Гарадзенская філія БНФ** пры канцы верасьня атрымала паведамленьне, што да 30 верасьня павінна заплаціць 1 млн 440 тыс. руб. судовых пошлін. Пошліны былі ўскладзеныя пасьля пройгрышу суду наконт высяленьня арганізацыі з памяшканьня.

Суд над **Янам Романам** адбыўся 28 верасьня: яго аштрафавалі на 50 б.в. (1 млн 275 тыс.) за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Такой арганізацыяй судзьдзя Натальля Козел палічыла зарэгістраваны прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці.

Намесьнік пракурора Ленінскага раёну Горадні Аляксандар Абрамовіч 29 верасьня афіцыйна папярэдзіў **Анджэя Пісальніка**, што той ня можа прадстаўляцца галоўным рэдактарам штотыднёвіка Саюзу палякаў Беларусі «Głos znad Niemna».

15 верасьня Вярхоўны суд адмовіў наглядной скарзе актывіста прафсаюзу РЭП **Ю.Курганскага**. Гарадзенец абскарджваў рашэньне адміністрацыйнай камісіі наконт штрафу за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак і «злоўжываньне працэсуальнымі правамі».

**Галадоўкі**

Прадпрымальніцы зь Берасьця **Любоў Разановіч** і **Любоў Лаўруковіч** 28 верасьня спынілі галадоўку пасьля кансультацый зь іншымі прадпрымальнікамі. Чыноўнікі аблвыканкаму абяцалі вырашыць спрэчныя моманты.

29 верасьня спыніў галадоўку **Мікалай Аўтуховіч** у Ваўкавыску: Прэзыдыюм Вышэйшага гаспадарчага суду скасаваў рашэньні ўсіх судовых інстанцый і накіраваў ягоную справу на перагляд.

Галадоўшчыцы з Ваўкавыску **Натальлі Няборскай** 30 верасьня дактары прапанавалі легчы ў шпіталь, бо ў яе пагоршыўся стан здароўя. Жанчына адмовілася.

**Пінская прэса**

Намесьнік старшыні Пінскага гарвыканкаму Аляксандар Канеўскі, паводле зьвестак ГА «БАЖ», 29 верасьня на нарадзе з супрацоўнікамі гарвыканкаму забараніў даваць інфармацыю супрацоўнікам мясцовай недзяржаўнай газэты **«Мясцовы час»**. Мясцовае аддзяленьне РУП «Белсаюздрук» адмовілася падпісваць дамову на распаўсюд выданьня.

**Нягоды «Народнай волі»**

Газэта **«Народная воля»** 30 верасьня атрымала ліст ад «Менаблсаюздруку» з адмовай ад далейшага распаўсюджваньня. У дакумэнце сьцьвярджаецца, што газэта карысталася паніжаным попытам.

**Затрыманьне ў Барысаве**

У Барысаве 25 верасьня затрымалі 19-гадовага актывіста грамадзкай ініцыятывы «За чысты Барысаў!» **Андрэя Маласая**, які распаўсюджваў расклад беларускіх перадач тэлеканалу «Euronews».

**Штраф «БДГ»**

Суд Кастрычніцкага раёну Менску выпісаў **«БДГ. Деловая газета»** 50 млн руб. штрафу і журналісту **Сяргею Сацуку** — 5 млн на карысьць былога супрацоўніка АМАПу Сяргея Бядрыцкага. Справа тычылася артыкулу «Рэклямная акцыя» ў №70 за 20 траўня 2003 г., дзе расказвалася пра крымінальную справу, адным зь фігурантаў якой быў пазоўнік.

**Штрафы ў Пінску**

29 верасьня Пінскі суд аштрафаваў актывіста БСДП («Грамада») **Сяргея Касьцюковіча** на 20 б.в. (510 тыс. руб.) Яшчэ чатыры актывісты партыі атрымалі папярэджаньні. Падстава — затрыманьне партыйцаў 7 жніўня ў офісе фірмы «Паляшук», што было кваліфікавана як «несанкцыянаваны сход».

**«Прессбол» у судзе**

Галоўная бухгальтарка Вучэльні алімпійскага рэзэрву **Сьвятлана Рамановіч** падала пазоў супраць недзяржаўнай газэты «Прессбол» на 14 млн 510 тыс. руб. за артыкул, які напісала біятляністка Сьвятлана Парамыгіна. Узімку «Прессбол» прайграў пазоў міністру фінансаў Мікалаю Корбуту, выплаціўшы 40 млн. рублёў кампэнсацыі.

**АШ**

# Мэка кантрабандыстаў

Семдзесят гадоў таму ў Ракаве віравала зусім іншае жыцьцё. Цэнтар гміны Маладачанскага павету быў найбуйнейшым цэнтрам кантрабанды на польска-савецкай мяжы. Менавіта ў Ракаве, гэтай малой беларускай Адэсе, жыў славуты кантрабандыст, шпіён і пісьменьнік **Сяргей Пясецкі**. На вулках Ракава сустрэнеш і нашчадкаў настаўніка Рагойшы з Казікам Пясецкам з «Народнага альбому».

Мястэчка Ракаў знаходзіцца за 40 км на Захад ад Менску, у Валожынскім раёне ля шашы Менск—Вільня. Семдзесят гадоў таму ў Ракаве віравала зусім іншае жыцьцё. Цэнтар гміны Маладачанскага павету быў найбуйнейшым цэнтрам кантрабанды на польска-савецкай мяжы.



Баяніст «Народнага альбому» Сяржук Ахрамовіч прымярае бурнос Юзіка, які хацеў жыць у Савецкім Саюзе.

### «Прынясі ты мне злату вавёрку»

Ствараючы «Народны альбом», Міхал Анемпадыстаў ня ведаў, што ў 1930-я гады ў Ракаве працаваў сапраўдны настаўнік Кастусь Рагойша, які пісаў вершы. А сям'я прафэсара Вячаслава Рагойшы і сёньня мае сядзібу ў Ракаве. Імя пісьменьніка Пясецкага, песьняра памежжа, стала вядома «народнаальбомшчыкам» таксама пасьля стварэньня «Альбому». Але «Народны альбом» стаў своеасаблівым разьвіцьцём гэтых аповесьцяў.

«Кантрабандысцкі» раман Сяргея Пясецкага «Каханак Вялікай Мядзьведзіцы» (1937), дзеяньне якога адбываецца ў 1920-я гады ў Ракаве, пакуль па-беларуску ня выдадзены. На працягу раману яго героі па ўсёй мяжы ад Стоўпцаў да Радашкавічаў носяць у Саветы тавар — панчохі, сьпірт, скуры. Праводзяць праз мяжу «фігуркі» — уцекачоў з Савецкага Саюзу. Дробныя рэчы носяць у «бандажах» — так яшчэ надаўна вазілі сьпірт у Польшчу, перавязаўшы цела скотчам. «Злоту вавёрку» і «срэбну лісіцу» прыносілі ў адваротным кірунку — з Саветаў, і дзеўкі добра ведаюць, што гэта не ўпаляваны зьвер, а жаргонная назва тавару. Узімку прапіваюць увесь заробак, зазіраючы ў бутэльку (хлопцы п'юць шклянкамі, жыды — чаркамі); сустракаюцца зь дзеўкамі, наведваюць бардэль (у Ракаве іх было два), трапляюцца памежнікам, уцякаюць з-пад варты, зноў ідуць за мяжу, а калі надакучвае «сумленная» праца — адбіваюць тавар у канкурэнтаў-кантрабандыстаў. У кнізе апісана ўся інфраструктура — жыды, якія даюць «хлопцам» на рэалізацыю тавар, і геаграфія «малін» ледзь ня ў кожным хутары па савецкі бок.

Сузор'е Вялікай Мядзьведзіцы суправаджае галоўнага героя Уладка ва ўсіх шляхах. Зоркам ён надаў жаночыя імёны, а седзячы ў савецкай турме, даведаўся ад злодзеяў, што тыя лічаць сямёрку сваёй шчасьлівай лічбай. На Каляды, калі дзяўчаты варажылі, наваражыў і Ўладак. Фігурка, адлітая ім з волава, была… Вялікай Мядзьведзіцай, якую ён, паводле варажбы, возьме за жонку.



У музэі Фэлікса Янушкевіча захоўваецца сьвяточны ўбор ракаўскай прыгажуні.

### «Ён з-за кратаў дахаты ўсё адно ўцячэ»

Сяргей Пясецкі ў Ракаве займаўся ня толькі кантрабандай, але і працаваў на польскую разьведку. Ён добра быў знаёмы зь мясьцінамі па абодва бакі мяжы — яшчэ ў 1921 г. партызаніў у «Зялёным дубе». Аб шпіёнскай працы ён і напісаў сваю першую кнігу — «Пяты этап» (1934) — седзячы ў польскай турме. Літаратурны дар прачнуўся на сёмым годзе «адседкі», калі Пясецкі прачытаў абвестку ў газэце аб літаратурным конкурсе. Кніга была канфіскаваная турэмнай цэнзурай.

«Вялікай Мядзьведзіцы» пашанцавала больш — яна выйшла за межы турмы і праславіла аўтара, яго нават вызвалілі на чатыры гады раней тэрміну па просьбе вядомых польскіх літаратараў. І калі раней ягонай асобай цікавіліся паліцыя, сьледчыя і судзьдзі, дык цяпер — выключна выдаўцы й рэпартэры, напіша ён пазьней у аўтабіяграфіі. Пяць гадоў Пясецкі адседзеў у адзіночных камэрах (у турме Пясецкі знаходзіўся з 1927 па 1937 г.), тройчы быў кіраўніком турэмных бунтаў. Першае, што ён зрабіў на волі, — даслаў пасылкі з харчамі і тытунём таварышам па камэры. У Італіі быў зьняты тэлевізійны сэрыял, мастацкія фільмы паводле кантрабандысцкага раману зьняты ў Італіі і Польшчы.

### Простыя рэчы

Аб былой славе «кантрабандысцкай сталіцы» сьведчыць мноства экспанатаў, сабраных у прыватнай галерэі братоў Янушкевічаў. Сёньня гэта самае знакамітае месца мястэчка. Толькі керамікі там перахоўваецца больш за 1700 адзінак. Ракаўцы захоўвалі ў сваіх хатах усё. У адных старых нават партрэты імпэратара Мікалая II і ягонай жонкі правіселі над ложкам усё жыцьцё… А гаспадар галерэі мастак Фэлікс Янушкевіч з дакумэнтаў і ўспамінаў сваякоў апавядае гісторыі, кожная зь якіх вартая цэлага раману.

У музэі сабраныя колькі прыкладаў ракаўскай моды даваеннага часу, сярод якіх — мужчынскі бурнос і жаночы палітон з каўнерам з хахулі. Уборы хлопцаў і дзяўчат, іх гальштукі, панчохі і лякіраваныя туфлі падрабязна апісвае Пясецкі, а добры густ і ўвагу да моды геніяльна адчуў Міхал Анемпадыстаў: штуршком да напісаньня «настаўніка Рагойшы» сталі стылістычна бездакорныя касьцюмы да фільму «Чужая Бацькаўшчына», якія праставаў Міхась Раманюк.

### Lomir zech iberbetn

На сваім гародзе, будуючы дом, Янушкевічы знайшлі гаршкі з закапанай маёмасьцю — жыд па імені Ёсель Краснасельскі, чый дом стаяў на гэтым месцы, пры набліжэньні немцаў закапаў усё сваё майно. У мястэчку ходзяць легенды пра восем скрыняў золата, закапаных жыдамі. У Ракаве было столькі золата, што аж да 1960-х гадоў на рынку разьлічваліся выключна золатам, кажа гаспадар. Сёньняшні рынак у Ракаве — найслыннейшы мясны базар Беларусі.

Сёньня мястэчка Ракаў мае статус вёскі. Храмы тут не руйнаваліся, а Фэлікс Янушкевіч упэўнены, што Ракавам апякуецца Панна Марыя. Паводле легенды, сьляпы чалавек сустрэў каля крыніцы Маці Божую. Яна сказала яму напіцца — і ён пачаў бачыць. Крыніца і сёньня на тым месцы — пры ўезьдзе ў горад, і вада зь яе, паводле легенды, дапамагае хворым на вочы.

У Ракаве знаходзіцца адзіная, пэўна, у Беларусі плошча Вітаўта — у двары галерэі. Проста перад домам — помнік Вітаўту, зроблены Фэліксавым братам, скульптарам Валяр'янам Янушкевічам.

А пра тое, што вопыт продкаўкантрабандыстаў ды прафэсійных бандытаў вывучаецца, сьведчыць факт: першае выданьне «Вялікай Мядзьведзіцы» Фэлікс Янушкевіч знайшоў ва ўпраўленьні чыгункі ў Дрысьвятах, а легенды пра банду Боўбеля жывыя ў Ракаве да сёньня.

**Аліцыя**
**Фота аўтара**



Ракаў. Міхал фатаграфуе дачку Стэфку.



Кася Камоцкая, Алег Дземідовіч (зьлева), Міхал Анемпадыстаў і Сяржук Ахрамовіч на ганку ракаўскай школкі.



Помнік на габрэйскім цьвінтары, зроблены з млынавага каменя.

У Менску выйшла па-беларуску аповесьць Сяргея Пясецкага (1901—1964) «Запіскі афіцэра Чырвонай Арміі». У кнізе аспіваюцца падзеі 1939—1945 гадоў у Заходняй Беларусі.

# Мікола Статкевіч: «Пад выбары мяне ізалююць»

У Баранавічах цяпер модна рамантаваць мікрахвалёўкі ў Міколы Статкевіча.
Піша **Руслан Равяка**.

«Рамбыттэхніка» ў Баранавічах знаходзіцца на адной з самых старажытных вуліц гораду, частка яе мае базальтавы брук, што сустракаецца ў Беларусі толькі тут. Працоўнае месца Міколы Статкевіча знаходзіцца на першым паверсе.

Падыходжу да камяніцы і грукаю ў вакно. Пакой застаўлены разнастайнай тэхнікай — ад пыласоса, які бачыў Хрушчова, да найноўшай мікрахвалёўкі. Чакаюць сваёй чаргі на рамонт. Размаўляючы, сп.Мікола корпаецца са старым відэамагнітафонам. Каб ажывіць яго, не хапае адной дэталі, якую ўжо замовілі ў Менску. Усе прыстасаваньні для рамонту — прылады, паяльнік ды шрубоўкі — пазычаюць у калег ці прыносяць з хаты.

Працоўны дзень пачынаецца а 8-й, з 13-й да 15-й — абед. Абед павялічаны да дзьвюх гадзін дзеля таго, каб Статкевіч даехаў да кватэры бацькі, якому патрабуецца догляд. Заканчваецца праца а 18-й, а 19-й ён мусіць быць на месцы адбыцьця пакараньня — «хіміі».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Папраўчая ўстанова адкрытага тыпу знаходзіцца ў чатырохпавярховым цагляным будынку, палова першага і чацьвёртага паверху якога аддадзены пад заводскі інтэрнат. Рабочыя і «хімікі» жывуць амаль у адных умовах, толькі ў вязьняў на вокнах — краты. Але «хімія» не інтэрнат. За дзень адбываецца шэсьць праверак. Калі ходзіш на працу, трапляеш на тры. Першая — а 6-й. Усе вязьні выстройваюцца на калідоры. Міліцыянт зачытвае прозьвішча, а «хімік» павінен выйсьці са строю і назваць імя і імя па бацьку. Пасьля вяртаньня з працы — праверка а 19-й ды перад адбоем а 22-й. Каля дзьвярэй на вуліцу перад выхадам на працу трэба зноў назваць сваё прозьвішча ды атрымаць працоўны табэль. Па сканчэньні працы начальнік у табэлі павінен адзначыць, колькі гадзін ты адпрацаваў, па вяртаньні аркуш здаецца дзяжурнаму «хіміі». Спазьненьне з працы пагражае пакараньнем. «Самае цяжкае — самому вяртацца ў вязьніцу», — уздыхае Статкевіч.

Сп.Мікола спачатку жыў у пакоі на сем чалавек, потым перавялі ў лепшы — на чатыры. Хлопцы трапіліся прыстойныя. Пасьля перасяленьня ў пакоі пераклеілі шпалеры, зьбіраюцца фарбаваць падлогу, Статкевіч прынёс стары бацькоўскі тэлевізар, на дзьверы паставілі новы замок. Суседзі працуюць да 21 гадзіны, таму ў палітыка ёсьць час, каб пачытаць ці нешта напісаць. Большасьць «хімікаў» у Баранавічах — гэта хлопцы, якія па-дурному трапілі сюды праз бойку, алімэнты ці дробны крадзеж.

Начальства на «хіміі» пастаянна прыгадвае Івашкевіча. Палітычныя асуджаныя прыносяць кіраўніцтву папраўчай установы толькі дадатковы клопат — розныя праверкі й вялікую ўвагу грамадзкасьці ды замежнікаў.

Статкевіч кажа, што адчуваецца моцная падтрымка звонку. Увесь час тэлефануюць, прыяжджаюць сябры, палітычныя дзеячы ды журналісты зь Менску. Нядаўна быў амбасадар Нямеччыны Хэкер — размаўлялі зь ім у кабінэце дырэктара. Наведваюць мясцовыя журналісты, сябры партый і грамадзкіх арганізацый. Заходзяць вэтэраны нацыянальнага руху, былыя эсбээмаўцы. Гэтыя людзі, адседзеўшы за Сталіным, добра ведаюць, што любая дапамога, нават спагадлівае слова, важныя падчас такіх выпрабаваньняў.

Затое, паводле словаў Статкевіча, вельмі назаляе ўвага органаў, якія правяраюць шмат і парознаму. Спачатку па вяртаньні з працы міліцыянты спрабавалі пачуць пах алькаголю і вельмі расчараваліся, дазнаўшыся, што палітык кроплі ў рот не бярэ. Цяпер кантралююць знаходжаньне ў бацькі. Маёр міліцыі заходзіць быццам бы выпадкова на кватэру старога чалавека альбо прыходзіць у нядзелю, калі палітвязень сустракаецца з жонкай і дачкой. Найбольш непрыемныя часы ў выходныя — калі трэба знаходзіцца ў будынку «хіміі». Паводле слоў сп.Міколы, для яго налепш было б сядзець недзе далей ад гарадзкога тлуму, міліцэйская начальства — каб менш дакучлівага нагляду. Севярынцу наадварот, відаць, лягчэй сядзелася б у горадзе — бліжэй да цывілізацыі, людзей. Але ці ўлада ўсё пралічыла, ці лёс так склаўся — кожны патрапіў на найбольш непрыемнае месца. «Бліжэй да выбараў мяне, хутчэй за ўсё, ізалююць, — прагназуе лідэр сацыял-дэмакратаў. — Каб чаго не справакаваў. Мы з Паўлам паказалі, што можам павесьці за сабою людзей на плошчу. Гэтага баяцца найбольш». Статкевіч ня ведае, якім чынам гэта адбудзецца. Магчыма завядзеньне крымінальнай справы — справакаваць бойку на «хіміі» проста. Да такой высновы прыводзіць выпадак, што адбыўся напярэдадні. Сп.Мікола ішоў да крамы «Радыётэхніка», амаль адразу па выхадзе з працы за ім паплёўся, хістаючыся, нейкі п'янтос. Па супрацьлеглым баку вуліцы ішоў міліцыянт. Праз пару кварталаў п'яны чалавек падскочыў да Міколы, паспрабаваўшы прычапіцца. Адначасова міліцыянт пачаў пераходзіць вуліцу на іх бок. Каб не справакаваць бойкі, Статкевіч адразу скіраваўся да абароны закону: «Я да яго не чапляюся». Пасьля гэтых слоў п'янтос адразу працвеперазеў.

Перамога на прэзыдэнцкіх выбарах, на думку Статкевіча, досыць рэальная. Але яна адбудзецца толькі на плошчах. Патрэбен лідэр, які павядзе за сабою народ на вуліцу і пойдзе з гэтым народам да канца: «Наш зь Севярынцам прысуд — яскравы доказ таго, што ўлада баіцца менавіта такога варыянту падзей».


ИУОТ № 2 УДИН МВД
Республики Беларусь по Брестской области
ИСХ. №
Спецкомендатура ____ 200 г.
« » Л.ОСН. « » Л.ПРИЛОЖ.
26

ТАБЕЛЬ №

ОТРЯД № 7031

Фамилия Статкевич
имя Николай о. Викторович
Место работы «Рембыттехника»
Специальность радиомеханик, 10.2005 г.

| Дата | Часы работы | Отработано часов (прописью) | |
| --- | --- | --- | --- |
| 01.10 | 8⁰⁰-15⁰⁰ | Пять | |

Всего выхододней ____ прогулов ____
Заработная плата в ____ м-це
____ руб. ____ коп.
Табельщик ____ наимен. (подпись)
Начальник ____ наимен. (подпись)

**Рэжым дня Міколы Статкевіча**

5.30 — пад'ём.
6.00 — праверка.
8.00 — пачатак працоўнага дня.
9.00 — праверка.
13.00—15.00 — перапынак на абед, наведаньне бацькі.
18.00 — канец працоўнага дня.
19.00 — праверка пасьля вяртаньня ў інтэрнат.
22.00 — адбой.

**Лісты Міколу Статкевічу**
можна пісаць на адрас:
ПУАТ№2
вул.Пралетарская,32
Баранавічы, 225320

# Усё такое незапаранае

З ілюзіямі ды маянэзам крутых дызайнэраў Уладзя Скамарошчанкі і Насьці Несьцярэнкі знаёмілася **Тэда Лі**.

Дома ў Вовы, Насьці і Шышачкі паціху загінаецца быт, і аб яго каварны рыф там можа разьбіцца любы човен. Затое сьцены апранутыя ў вялікія яскравыя карціны, а на галаве ў Насьці — новая фарба для валасоў. Дзяўчынка з поўначы і сын гарадзенскіх мастакоў разам жывуць і працуюць. Іх кампутары стаяць на небясьпечна блізкай адлегласьці, такой, што, здаецца, можна час ад часу перапаўзаць адно да аднаго на стол.

Калі паглядзець на іх гаспадароў, магчымымі здаюцца любыя вар'яцтвы. Згадаўшы пра голад, яны пачынаюць варыць суп і адначасова фатаграфаваць яго, скардзячыся на ката Шышачку, які бессаромна загаджвае ўсю хату і зьяўляецца самай нахабнай чорнай мордай на Зямлі. За гарбатай Вова адчыняе бясконцыя тэчкі са сваімі працамі на кампутары і распавядае пра творчасьць, Бэрлін, маянэз, Веранiку Круглову і Хібіны. Насьця, страляючы па віртуальных самалётках, пастрэльвае ў нас хітрым поглядам з-за свайго стала. Час ад часу яна ўпрошвае Шышачку ня жэрці кампутарныя драты і далучаецца да Вовавых аповедаў.

### Праца, якая зьела час

Выбавіць Насьцю з Вовам у горад на вечаровыя гулі апошнім часам стала немагчыма. Увесь час праглынае бясконцая праца, а адпачынак, паводле тлумачэньняў Вовы, цяпер найлепш атрымліваецца ў цішыні. У той вечар, калі я прыехала да іх са сваімі пытаньнямі, Вова з Насьцяй доўга раіліся, ці ехаць на электронную вечарынку. І абое вырашылі, што ня варта, хоць з Насьцяй я пазнаёмілася менавіта на такой імпрэзе. На пытаньне, чым такім *важным* яны займаюцца, Вова кажа:

— Мы — крутыя дызайнэры. Так і напішы. Мы займаемся дызайнам усяго: ўэб-дызайнам, паліграфіяй, выконваем усе рэклямныя паслугі.

Кола замоўцаў у *крутых дызайнэраў* велізарнае. Плякаты, паказальнікі, лістоўкі, лягатыпы, пакецікі, этыкеткі ў іх замаўлялі хлебазавод і маргарынавы завод, абутковая крама, банк, галерэя расьлін, друкарня, БРСМ і чорт ведае хто яшчэ. Насьця і Вова ўсіх не прыпомняць, тым больш што замовы хутка зьмяняюць адна адну, некаторыя выконваюцца сумесна, некаторыя — паасобку.

— Усе гэтыя дзяржаўныя канторы, розныя заводы, — абураецца Вова, — жывуць па старых саўковых стандартах. Яны арыентуюцца на пакупніка з гэткімі ж густамі, у іх адсутнічае ўсялякае ўяўленьне пра эўрапейскі рынак, пра магчымасьці дызайну.

— Мы можам прыдумаць вельмі крутое, моднае, прыкольнае афармленьне, — кажа Насьця. — Іншая рэч, што яны прыкольнага не разумеюць.

Апошнім часам ў Вовы і Насьці шмат замоваў розных прадуктовых пакункаў (скрыначкі для печыва, пакецікі для маянэзу). Раней яны ніколі гэтым не займаліся, а цяпер нечакана падвярнуліся такія прапановы.

— Людзі нейкія — дубы, — наракае Насьця, — галоўнае — купіць і зьесьці, а ў што гэта запакавана, увагі не зьвяртаецца.

Таму і дызайн замаўляецца самы прымітыўны. Незразумела толькі, навошта тады яго ўвогуле мяняць?...

Бываюць больш творчыя замовы. Напрыклад, афішы, флаеры на вечарынкі. Іх замаўляюць тусовачныя чувакі для ўласнага задавальненьня.

Самы лепшы заказчык, на думку крутых дызайнэраў, — той, які разумее, што нічога не разумее, і дазваляе ім спакойна выконваць сваю працу.

— Чаго ты пытаесься пра гэтую бытавуху? — злуе на мяне Вова. — Гэта ж зусім не цікава. Лепш пра творчасьць пагаварыць.

І я ўжо баюся яго не паслухацца.

### Фатаграфія і Бэрлінская свабода

— У мяне ў тым пакоі малюецца карціна, — прамаўляе Вова загадкавым голасам.

Сёлета ён заканчвае акадэмію. Малюе «па-жывому» цяпер вельмі рэдка. Усё праз працу. Хаця цікава і алеем, і на кампутары. Усё захапляе.

А яшчэ Вову захапляе фатаграфія. Сказаць, што ў яго гэта хобі, язык не павернецца.

— Я раней плёнку ў дзень фатаграфаваў, — кажа ён. — Набываў крыху папсаваныя чорна-белыя плёнкі і «Зэнітам» здымаў. Быў час, нават зарабляць гэтым спрабаваў — фатаграфаваў рок-гурты. Але цяпер здымаю толькі дзеля мастацтва і дзеля сябе. Ня трэба мне, каб усе крычалі, які я зашыбенны мастак, і адвальвалі мне кучу грошай за гэта.

Нядаўна ў Менску ў «Goete gallery» адбылася выстава яго партрэтаў, летась і пазалетась Вовавы фатаздымкі выстаўляліся ў Бэрліне. Пра Бэрлін у яго засталіся адметныя ўражаньні:

— Уяўляеш, там у цэнтры гораду стаіць пяціпавярховы дом, ён увесь належыць мастакам. Там майстэрні, галерэі, салёны, ёсьць бар і танцпляцоўка. Тусуюцца ў асноўным людзі мастацтва: дызайнэры, мастакі, акторы, можа быць. І ўсё, што там адбываецца, такое свабоднае, «незапаранае». А ў Беларусі свабоды катастрафічна не хапае, яна існуе толькі на нейкім лякальным узроўні.

Нашу схему станаўленьня мастака Вова лічыць жудасна калгаснай. Усе гэтыя стэрэатыпы «скончыў акадэмію — выставіўся ў Палацы мастацтваў — стаў крутым мастаком» такія саўковыя, што і гаварыць пра гэта сумна.

— Можна стаць супэрпрафэсіяналам, нідзе не вучыўшыся. А можна скончыць акадэмію і быць поўным г…

Вова і Насьця рана ці позна адсюль зьедуць. Для пачатку плянуюць у Піцер. Ехаць жыць у Эўропу стрымлівае моўны бар'ер.

— Я добра ведаю толькі беларускую мову, — усьміхаецца Вова. — У расейскай зусім непісьменны.

### Чалавек унутры воблака

— Людзей, у якіх ёсьць шмат сродкаў, звычайна стрымліваюць іх абавязкі, — апавядае Вова. — Яны маюць шмат магчымасьцяў, але ня могуць скарыстаць і палову. Як было б файна, калі б можна было рабіць тое, што хочацца. Можна было б паехаць куды-небудзь на два гады, жыць там, займацца творчасьцю, адтуль падарожнічаць, а пасьля зьехаць у новае месца, мяняць краіны, умовы… Але мне цяпер гэта ўяўляецца проста нерэальным. Я думаю, ва ўсім сьвеце няшмат людзей, якія сабе дазваляюць так жыць.

Адзін рай на Зямлі Вова мне выдаў — гэта горы Хібіны на Кольскім паўвостраве. Разам са студэнтамі акадэміі ён там быў два разы. Адпачываў ад кампутараў, глытаў цішыню і фатаграфаваў усё навакольле. Кажа, што Насьця ня вельмі захапляецца гарамі.

— Там цывілізацыі няма, — тлумачыць яна.

— Бачыш гэтую фотку, — гартаючы фатаздымкі, Вова спыняецца на адным. — Гэта я залез на вяршыню і фатаграфаваў суседнюю гару, якая патанула ў воблаку. Праз хвіліну я ўжо сам быў унутры яго.

### Рэкляма ўласных ілюзій

Сярод замоваў, якія дызайнэры рыхтуюць для кліентаў, і работ, якія ўжо дайшлі да спажыўца (маянэз, алей і соўсы ў вова-насьцістых пакетах можна набыць у любой краме), праскокваюць зусім адвязаныя рэклямы і афішы, і адразу хочацца спытацца:

— А гэта некуды пайшло?

— Гэта толькі для сябе, — кажа Вова. — Вось такія фантазіі.

«Vialiki biełaruski circus», — напісана на афішы, якая мусіла б вісець на будынку менскага цырку замест кагосьці там «на льду»: «Клоўны нападаюць, трымайся, хто можа».

— Але наш цырк цяпер не дазволіць сабе такіх афіш. Усё мусіць быць кандова, як за Саветамі.

Наступная афіша запрашае патусіць у абстрактны начны клюб «О-клаб», у якога нават ёсьць свой значок, а не хапае зусім крыху — памяшканьня, музыкі ды тусоўкі. На Вовавай рэкляме «Гарызонту» — тэлевізара для ўсёй сям'і — перад тэлекам сабралася сям'я: Вераніка Круглова, Алезіс зь дзіцем, нейкія бабуля зь дзядулем.

Дарэчы, зь Веранікай Кругловай у Вовы з Насьцяй свае дачыненьні. Былушы ў Нямеччыне, гэтыя двое начавалі ў сьпявачкі дома. Сярод фотапартрэтаў Вовы, якія выстаўляліся ў Менску, — два Веранічыны. Дарэчы, дызайн усіх дыскаў «Kriwi», перавыданьне якіх рыхтуецца ў найбліжэйшы час, робіць Вова. Ён нават паказаў мне свае мінімалістычныя напрацоўкі.

На кухні Насьця загаворвае пра тое, што ніяк не выкраіць часу, каб пашыць паліто. Вова адразу нагадвае, што ня шкодзіла б пашыць і яму, і тлумачыць:

— Насьця — супэрмодны дызайнэр, не загружаны аніякімі канонамі.

Ад Насьці з Вовам я сыходжу зь дзіўным настроем і падарункам у кішэні. Засмучаная тым, што ім не даюць распраўляць крылы напоўніцу, і радасная праз тое, што такія «крутыя наварочаныя супэрдызайнэры» *ўвогуле* ёсьць.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Атэістычны рэванш

Ці ж маўчаньне праваслаўных і каталіцкіх ярархаў Беларусі, калі ўлады душаць Эвангельскую царкву, гэта справядлівасьць у дачыненьні да самога Хрыста? Піша **Пётра Рудкоўскі**.

*І, паклікаўшы іх, загадалі ім*
*зусім не прапаведаваць*
*і не вучыць у імя Ісуса.*
*Але Пётар і Ян сказалі ім у адказ:*
*«Памяркуйце, ці справядліва перад*
*Богам — слухацца вас болей,*
*чым Бога?»*
***Дзеі Сьвятых Апосталаў***
***4:18—19***

«Абсяг рэлігійнае талеранцыі нашае дзяржавы няўмольна памяншаецца», — кажа Вячаслаў Ганчарэнка, пастар пратэстанцкай суполкі «Новае жыцьцё». На фоне апошніх падзей — ліквідацыі ўладамі ажно дзьвюх цэркваў, Беларускай эвангельскай і Эвангельска-рэфармацкай, пазбаўленьня царквы «Новае жыцьцё» культавага будынку — выказваньне пастара выглядае даволі памяркоўным. Мабыць, трэба казаць не пра памяншэньне абсягу талеранцыі, а пра ўстойлівую дыскрымінацыю пратэстанцкіх супольнасьцяў і нават пра наяўнасьць у краіне добра распрацаванай стратэгіі ліквідацыі пратэстанцкіх рэлігійных традыцый. Традыцый, якім — прыгадайма — пад пяцьсот гадоў.

Рэпрэсіўныя захады супраць эвангелістаў пачаліся ў Беларусі даўно. Ужо ў траўні 2001 г. беларускія эвангелісты зьвярнуліся да ўсіх хрысьціянаў з просьбай аб малітве, бо ў айчынных мас-мэдыя пачаліся нападкі на Эвангельскую царкву. Нярэдка можна было сустрэць у дзяржаўных СМІ азначэньне «сэкта» ў дачыненьні да пяцідзясятнікаў, часам яны прыраўноўваліся да сатаністаў. Тры гады таму ўлады пачалі сыстэматычны перасьлед удзельнікаў малітоўных спатканьняў, што арганізоўваліся — зь вядомых прычын — у прыватных кватэрах. Так, у красавіку 2003 г. была аштрафавана пэнсіянэрка Ганна Лукашэня у Баранавічах за тое, што ў яе хаце адбываліся набажэнствы, а празь месяц аштрафавалі за тое самае інваліду Яўгенію Савашчэню. «Праваахоўнікі» нярэдка зрывалі эвангельскія богаслужэньні, запалохваючы пры гэтым ні ў чым не вінаватых вернікаў.

Вышэйзгаданыя факты варта зьвязаць зь іншымі. Ня так даўно, як пісала «НН», дамініканцы арганізоўвалі гістарычна-археалягічны летнік. У сувязі з нашым выездам у мясцовасьць Канюхі на Ваўкавышчыне да нас паступіў ад мясцовых уладаў сыгнал: *ніякага прапаведаваньня, ніякага спяваданьня, ніякіх публічных богаслужэньняў!* (Тады міжволі ўсплыла ў памяці рэпліка апосталаў Пятра і Яна: «Трэба слухацца болей Бога, чым вас».) Іншы прыклад з уласнага досьведу. У 1998 г. на Гарадзеншчыне праходзіў дзіцячы летнік, арганізаваны Каталіцкай царквой. У пэўны момант ад уладаў паступіў загад выключыць з праграмы любыя рэлігійныя мерапрыемствы — ранішнія малітвы, ружанец, імшу. У лістападзе 2002 г. два каталікі — Ігар Закрэўскі і Сяргей Пескін — былі арыштаваны за публічны пратэст супраць новага закону аб рэлігіі, які быў прыняты ў парлямэнце і падпісаны прэзыдэнтам у кастрычніку 2002 г. Прыгадайма, што гэты закон прызнаны Кестанскім інстытутам «найбольш рэпрэсіўным у Эўропе».

Але гэта ўсё яшчэ «кветачкі» ў параўнаньні з тым, што ўчынілі ўлады ў дачыненьні да Беларускай аўтакефальнай царквы ў ліпені 2002 г. Тады за дзень да асьвячэньня царквы ў Пагранічны (Берастывіцкі раён) зьявіліся ўзброеныя міліцыянты, потым прыбылі бульдозэры і цалкам разбурылі царкву.

Як усё гэта трэба інтэрпрэтаваць? Няма сумневу, што нядаўнія рэпрэсіі супраць эвангелістаў трэба разглядаць як праяву антыхрысьціянскае арыентацыі беларускага рэжыму. Як заўважыў аднойчы пяцідзясятніцкі біскуп-асыстэнт Навум Саханчук, рэпрэсіі ў дачыненьні да розных канфэсій трэба зьвязваць больш з атэістычным рэваншам, чым з імкненьнем падтрымаць праваслаўе. Гэтае меркаваньне пацьвердзіў і адзін з ананімных праваслаўных дзеячаў, які ў інтэрвію «Forum 18» адзначыў, што новы рэлігійны закон (што дзейнічае з кастрычніка 2002 г.) насамрэч ніяк не скіраваны на тое, каб пратэжыраваць праваслаўную царкву Маскоўскага патрыярхату. «Сёньня атэісты кажуць, што гэты закон — супраць сэктаў, але насамрэч яны чакаюць толькі таго, каб пачаць перасьледаваць кожнага верніка», — гаворыць той самы праваслаўны дзеяч.

Такім чынам, усе абмежаваньні свабоды сумленьня трэба разглядаць як праяву «хрысьціянафобіі» або нават «хрыстафобіі», якая мае камуністычна-савецкі радавод і раз-пораз ажывае ў дзяржаўных структурах. Гэта рудымэнты таго самага *ваяўнічага атэізму*, які так доўга і настойліва пустошыў людзкія душы, прышчапляючы прынцыпы *нянавісьці* — клясавай, сьветапоглядай і ідэалягічнай. (Ваяўнічы атэізм трэба старанна адрозьніваць ад сьветапогляднага атэізму як аднаго з магчымых спосабаў сьветаразуменьня.)

Патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт падчас міжнароднай канфэрэнцыі «Хрысьціянства і ўзаемапранікненьне духоўных каштоўнасьцяў у Эўрапейскай супольнасьці», што адбылася 10 сьнежня 2004 г., сказаў: «…еднасьць Сьвятое Царквы зьяўляецца хрыстацэнтрычнай: у цэнтры яе безупынна знаходзіцца Богачалавек, Госпад наш Ісус Хрыстос, Які «ўчора і сёньня, і давеку Той самы» (Габрэяў 13:8). (…) У сёньняшніх умовах асаблівую актуальнасьць набывае ня толькі дыялёг хрысьціянскіх канфэсій, але і дыялёг прадстаўнікоў іншых рэлігій — тых рэлігій, якія вызнаюць Адзінага Бога Стваральніка». Вельмі падобныя разважаньні можна прачытаць і ў вакольніку Яна Паўла II «Ut unum sint» (прысьвечаны еднасьці хрысьціян).

У сувязі зь сёньняшняй бядою эвангелістаў варта паставіць пытаньне, наколькі праваслаўныя і каталікі застаюцца вернымі экумэнічным дэклярацыям. Ці не зьяўляецца маўчаньне праваслаўных і каталіцкіх ярархаў перад абліччам цалкам відавочнай несправядлівасьці ў дачыненьні да Эвангельскай царквы адначасова несправядлівасьцю ў адносінах да самога Хрыста? Ці не аспрэчвае гэтае маўчаньне веру ў хрыстацэнтрычны характар Сьвятое Царквы, пра які гаварыў экзарх Філарэт, і ці ня гвалціць яно ідэі «ut unum sint» (хай будуць адно) Яна Паўла II? Калі нарэшце экумэнізм перастане быць зборнікам дэклярацый, а стане неадлучным элемэнтам хрысьціянскага жыцьця?




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Радыё «Сталін»

Калі я пачула ад сябра, што Эўракамісія прыняла рашэньне аб вяшчаньні на Беларусь па-расейску, заплакала ад бясьсільля. Піша пісьменьніца **Ева Вежнавец**.

Цяжка давесьці непрактычнасьць гэтага рашэньня людзям, якія прывыклі да панятку «эфэктыўная палітыка». Ланцужок, на іхні погляд, счэпліваецца так: перадача выходзіць на расейскай мове — яе разумеюць усе — усе дэмакратызуюцца. А далей дэмакратычная нацыя сама вырашае, што ёй рабіць з мовамі.

Але аксамітныя рэвалюцыі ва Ўсходняй Эўропе былі ня столькі сацыяльнымі, колькі *рэвалюцыямі годнасьці*. Этнасы рабіліся нацыямі, а нацыі не маглі стаяць на каленях і радавацца таму, што давалі. І беларусы здолеюць ацаніць такія абстрактныя рэчы, як грамадзянскія свабоды й правы чалавека, толькі калі да канца станунць нацыяй.

У іншым выпадку мы маем справу з насельніцтвам — сукупнасьцю простых людзей. А нашто простаму чалавеку абстракцыі — мова, гісторыя, спадчына, гонар, сьвядомасьць, правы, свабоды? У яго ёсьць усё, што патрэбна: мір, стабільнасьць; дзяржбюджэт у прафіцыце, ураджай уга-га, ВУП расьце; бытавую тэхніку, эўрарамонт, мабілкі, аўто, дачу бальшыня могуць сабе дазволіць. Адукацыя й мэдыцына — даступныя. На пахаваньне (!) кожнаму грамадзяніну Беларусі дзяржава выдзяляе $200 дапамогі. Чалавек ахутаны дзяржавай, бы коўдрай. А што пад коўдрай халаднавата й паветра сьпёртае — дык ня ў казку ж патрапілі. Гляньце, што робіцца ў сьвеце, — страшна тэлевізар уключыць! А ў нас ціха, пабожна і многа духоўнасьці — «Дажынкі», «Славянскі базар», «День белорусской письменности» (так і пішуць).

Чым радыё «Эўра» заахвоціць беларусаў да дэмакратыі? Тым, што немцы жывуць лепей? Дык на тое ж і немцы! Як для беларусаў, мы і так добра жывём, ніколі так не жылі. Што, пры ВКЛ? Дзе тое княства, і што нам да «лабусаў»?

Эўропа мае падтрымаць беларускую мову, сьвядомасьць і культуру. Калі яны хочуць мець справу з вольным народам, а ня з тым, што ёсьць цяпер.

Дарэчы, Лукашэнка і кумпанія аказаліся значна разумнейшыя за эўраспадарства — яны пасьлядоўна, няспынна, нястомна вытручваюць з масавай сьвядомасьці мову й гісторыю. За адзіннаццаць гадоў у гэтым кірунку не было ніводнай саступкі, ні ценю ваганьня або непасьлядоўнасьці — ад рэфэрэндуму 1995 г. да ператалумачваньня сэнсу Незалежнасьці, да абезыменьваньня праспэкту Скарыны. На Ганебным рэфэрэндуме галоўны вораг няволі быў вызначаны беспамылкова.

Уласная мова й культура — тое самае, што ўласная валюта з нацыянальнымі героямі на купюрах. Нацыя зарабляе, купляе і плаціць, жыве для сябе і на свае.

Што толку, што ў нас 17% людзей маюць вышэйшую адукацыю, а ў заходніх суседзяў па 9—10%? У іх людзі працуюць на ўласны дом, а ў нас і дому няма, значыць «быць месцу гэтаму пусту».

Хто з «нацыяналістаў» здолее растлумачыць такія рэчы нашым суродзічам, савецкім беларусам, якія нас успрымаюць як кот бляшанку, прывязаную да хваста? Насельніцтва гэтага не разумее. Дастаткова, каб разумела эліта.

Мы прывыклі з павагай і зайздрасьцю глядзець на Захад — як на лепей уладкаваны сьвет. Апошнія рашэньні Эўракамісіі зрабілі гэты погляд больш горкім, але й больш мудрым.

Шкада, але «ні цар, ні царэвіч, ні кароль, ні каралевіч, ні шавец, ні герой» нас ня вызваляць. Усё давядзецца рабіць самім, а самі мы вялікія маруды, няхутка ўправімся.

## Да спадара Сіліцкага

Далучаюся да Вашага пратэсту супраць рашэньня радыёстанцыі «Нямецкая хваля» вяшчаць на Беларусь выключна на расейскай мове. Я ўжо паслаў на радыёстанцыю свой пратэст 20 ліпеня. Прашу далучыць мой подпіс да іншых.

**Валянцін Грыцкевіч,**
**доктар культуралёгіі,**
**старшыня рады Беларускага грамадзка-культурнага аб'яднаньня ў Санкт-Пецярбургу**

# Бібліятэка пры могілках

Будаўніцтва найноўшае Нацыянальнае бібліятэкі прывядзе да стварэньня новага цэнтру Менску. Піша **Гары Куманецкі**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Архітэктура ня толькі адлюстроўвае тэхнічныя дасягненьні нацыяў, але й інсьпіруе іх. Там, дзе зьяўляецца, напрыклад, храм — туды ж працярэбяць урэшце й дарогу. Самая буйная будоўля XXI стагодзьдзя ў Менску вядзецца ў чыстым полі, далёка ад цэнтру, ля «Маскоўскага» аўтавакзалу, па дарозе ў аэрапорт.

Парадаксальная сытуацыя — галоўная скарбніца ведаў і культуры выносіцца на ўскраіну сталіцы, а ў цэнтры будуюцца гіганцкія аўтастаянкі й паркінгі.

Папярэднія пакаленьні дойлідаў імкнуліся як мага болей цэнтрычна скампанаваць Менск. Раней сэрцам гораду была ратуша й галоўныя сьвятыні цэлай краіны, вакол якіх групаваліся найлепшыя кнігарні, бібліятэкі, тэатральныя залі, музэі. Пасьля апошняе вайны задача стала яшчэ больш яснаю, хоць канфігурацыя менскага цэнтру была дэфармаваная — ім фактычна стаў кавалак Сталінскага праспэкту ад Дому ўраду да ЦК КПБ. Далей разьляглізя зялёныя зоны, трансфармаваныя на пачатку 1970-х у шыкоўны «Водна-зялёны дыямэтар». Цэнтар Менску набыў ясны, зразумелы й імпазантны сталічны выгляд. Тут месьціліся найвышэйшыя ўлады, найбуйнейшыя бібліятэкі й музэі, найгалоўнейшыя інстытуцыі навукі й культуры, найлепшыя крамы. Гэткім ён і ўвайшоў у падручнікі й даведнікі па архітэктуры ў якасьці найвышэйшага дасягненьня савецкага горадабудаўніцтва.

Лягічна было б разьмясьціць галоўны аб'ект агульнанацыянальнае значнасьці ў межах трохкутніка перасячэньня лініяў мэтрапалітэну (з улікам пэрспэктывы будаўніцтва трэцяе яго чаргі). Відавочна, што Нацыянальная бібліятэка выдатна ўпісалася б у ансамбль Паркавае магістралі (Машэрава-Пераможцаў), узмацніўшы ролю гістарычнага й гэаграфічнага цэнтру. Яе гмах было б відаць і зь Верхняга гораду, і ад Цэнтральнае плошчы, і на ўсю пэрспэктыву вуліцы Леніна ад праспэкту. Але цяперашнія ўлады не хацелі дзяліцца славаю з папярэднікамі. Таму й вырашылі інача́й...

З пабудоваю новага будынку Нацыянальнае бібліятэкі панятак «цэнтар Менску» ізноў размываецца. Вынесены на Старабарысаўскі тракт новы цэнтар гораду імкліва будзе разьвівацца дзякуючы густой і зручнай сетцы транспарту. Там, дзе таньнейшыя зямля й нерухомасьць. Адтуль прамая дарога вядзе ў аэрапорт, пад носам — навюткі аўтавакзал і мэтрапалітэн. Ёсьць сучасныя крамы, могілкі, храмы, паркі, мэмарыялы, нават помнік Скарыну. Раскідзаны да кальцавое шашы новы цэнтар гораду цалкам зьменіць свае сацыяльныя, культурныя й транспартныя повязі. Размываецца панятак *цэнтру гораду* як месца *інтэлектуальнага* абмену, сустрэчаў і кантактаў людзей пэўнага адукацыйнага цэнзу й культурных запатрабаваньняў.

Тэндэнцыя вынасу з цэнтру сталіцы музэяў і тэатраў прасочвалася ўжо раней. Між тым стары Менск зь недабудаванымі музэямі й закрытымі на доўгія рамонты тэатрамі патанае ў курдыме выхлапных газаў. Мала каму прыйдзе да галавы пашпацыраваць сёньня зь дзіцём па Нямізе. Несупынныя спэкуляцыйныя гульні тут зь нерухомасьцю ўрэшце зробяць яго непрывабным і для інвэстараў.

У сацыяльным, культурным і экалягічным сэнсе старасьвецкі цэнтар Менску дэградуе. Цэнтрам жа прыцягненьня найноўшай беларускай сталіцы становяцца станцыя мэтро «Маскоўская», аўтавакзал «Маскоўскі» й Маскоўскія могілкі. Тамака паўстае адзіны на ўсю краіну гмах кнігазбору — замест тысячы па ўсёй краіне. Там імкліва разрастаецца новая сацыяльная інфраструктура. Але пакуль у гэтым раёне нарасьце інтэлектуальны патэнцыял, спатрэбяцца доўгія гады, калі не пакаленьні.

# Пакідаючы Бабілён

Найбольш непрыемная рыса беларускай сытуацыі — што і ўлады, і насельніцтва жывуць у спыненым часе сярэдзіне 1970-х. Гэта тады была патрэба ў бібліятэцы. Піша **Андранік Антанян**.

Гэтым летам часьцей, чым звычайна, у стужках беларускіх навін фігуравала бібліятэчная тэма — узьвядзеньне новага будынку Нацыянальнай бібліятэкі. Здавалася, звычайная справа: лета — пара адпачынкаў, напружанасьць палітычнага жыцьця спадае, а рэпартэры — таксама людзі, і жыць ім трэба. Во і стракацела бібліятэчная тэма ў загалоўках навін: «Ратвэйлеры ахоўваюць будоўлю», «Крымінальная справа ў дачыненьні да былога дырэктара будоўлі», «Нацыянальная бібліятэка працягне працу ў старым будынку», «Сьмерць на галоўнай будоўлі краіны». І гэтак бясконца. Не зьдзіўлюся, калі тыя ратвэйлеры на радасьць рэпартэраў каго-небудзь пакусаюць. Навіны патрабуюць ахвяраў — ня меней за мастацтва.

Апанэнты будоўлі ня маюць асаблівых аргумэнтаў супраць. Прэтэнзіі палягаюць у эстэтычнай плоскасьці да нязграбнага праекту і да валюнтарысцкіх мэтодых будаўніцтва. Апалягеты будоўлі — калі не стагодзьдзя, то, прынамсі, дзесяцігодзьдзя — таксама аргумэнтаў не прыводзяць, мармычачы пад нос пра «храм кнігі» і «мёд мудрасьці». Але ні адны, ні другія ня могуць дазволіць сабе прызнацца ў тым, што гэтая бібліятэка ў гэтай краіне нікому не патрэбная.

Парадокс — пра «мёд мудрасьці» і «храмы кнігі» гавораць адэпты ўладаў, якія дзень за днём цягам дзесяцігодзьдзя не саромеюцца дэманстраваць свае крайне антыкніжныя настроі. І дэманструюць іх рэгулярна. Новабеларускія эліты ад кніжнай культуры далёкія. Прыклады таго, як улады ставяцца да кніжнай культуры, шукаць доўга ня трэба: можна прыгадаць і загубленыя літаратурныя часопісы «Бярозка» ды «Першацвет», якія ў канцы 1980—1990-х сталі стартавай пляцоўкай для многіх літаратараў маладога пакаленьня, і цяперашні «ЛіМ». Пагартайце дзеля блезіру падшыўкі гэтага тыднёвіка за 1980-я, і жаданьне раўняць яго зь сёньняшнім адпадзе.

Урэшце, дзесяцігадовы дробязны і цынічны прэсінг Саюзу пісьменьнікаў — арганізацыі, што аб'ядноўвае людзей, якія ствараюць кнігі. Наколькі добра яны пішуць — справа дзясятая, тым больш што іншых пісьменьнікаў у нас, здаецца, няма. Бяз працы гэтых людзей і гэтай арганізацыі дзейнасьць бібліятэкараў нівэлюецца да функцый прыбіральніц, у чые задачы ўваходзіць выціраньне пылу з кніжных паліц. Магчыма, ахопленыя радасьцю навабуду бібліятэкары разумеюць усё гэта, але ніякіх сьлядоў гэтага разуменьня на паперы яны не пакідаюць. Як і не выяўляюць яны разуменьня таго, што бяз добра наладжанай і прадуманай прапаганды чытаньня, якой у Беларусі ніхто толкам ніколі не займаўся, самыя багатыя і добраўпарадкаваныя кнігазборы трацяць любы сэнс.

Бібліятэкараў можна зразумець: наяўныя плошчы сапраўды зацесныя для Нацыянальнай бібліятэкі. Аднак калі раптам улады вырашаць цалкам задаволіць апэтыты бібліятэкараў на плошчы пад кнігасховішчы, то ў горадзе ні на што іншае не застанецца ні вольных сродкаў, ні прасторы. Яшчэ адна праўда ў тым, што з прыходам у чытальныя залі новых тэхналёгій — ксэракапіяваньня, электронных каталёгаў, магчымасьці замаўляць кнігі праз Інтэрнэт — значна скараціўся час, які чытач у сярэднім праводзіць у бібліятэцы. Ну а магчымасьць без асаблівых высілкаў азнаёміцца з кнігамі ў электронным выглядзе наагул робіць публічную бібліятэку не такой і неабходнай для чытачоў.

Можна доўга спрачацца пра плюсы і мінусы такога разьвіцьця падзей. Урэшце, ніхто не прымушае верыць у прагрэс. Аднак трэба рыхтавацца да таго, што гэтыя тэндэнцыі праз пару гадоў будуць вельмі заўважныя і ў Беларусі. Пра гэта бібліятэкары ведаюць ня горш за нас. Але выгляду не падаюць. Бо найбольш характэрнай і непрыемнай рысай сучаснай беларускай сытуацыі зьяўляецца тое, што і ўлады, і насельніцтва старанна спрабуюць павярыць у тое, што на дварэ сярэдзіна 1970-х і час удалося спыніць назаўсёды. З гэтай веры і растуць праекты накшталт новага будынку бібліятэкі, для якой ужо ніколі не будзе чытачоў, і пабудовы гіганцкай тэлевежы ў часы, калі ўвесь сьвет — і БТ разам зь ім — пераходзіць на лічбавы фармат вяшчаньня. Адсюль расьце і замілаваньне ансамблем «Сябры» (які ў свае часы разглядаўся слухачамі як нязграбная копія «Песьняроў»), і цьвёрдае пераканьне ў тым, што Павал Якубовіч па сёньняшні дзень зьяўляецца першым стылістам краіны, на якога мусіць раўняцца кожны журналіст.

Для чытача ў мяне ёсьць усяго адна добрая навіна: калі-небудзь гэты Бабілён самападману ўсё ж будзе разбураны. Не ацалее і яго бібліятэка.

# Муха + Вец

Тысячы гадоў таму Муха і Вец зьліліся ў адно, злучыўшы на вякі Пружаны, Кобрын, Жабінку і Берасьце. Экспэдыцыя на роварах пяці выкладчыкаў Берасьцейскага тэхнічнага ўнівэрсытэту прайшла раку ад Пружанаў да Берасьця. Піша **Анатоль Гладышчук**.

### Закаханыя пад старой аптэкай

Мухавец пачынаецца на мяжы паміж Эўропай паўночнай і Эўропай усходняй. Гэтай мяжой можна лічыць водападзел Балтыкі і Чорнага мора. Вец выцякае з урочышча зь нябеснай назвай Буг, ля вёскі Ляжайка на Пружаншчыне. Урочышча Вялікае Дзікае — за пяць кілямэтраў ад вытокаў Вецу — жывіць вадой Ясельду, што ўпадае ў Прыпяць. Сёньня Вец і Муха — каналы.

Ля Малых Якавіч Муха і Вец збліжаюцца на далікатна інтрыгуючую адлегласьць, каб затым «абняцца» ў Пружанах ля былой старой аптэкі. Некалькі год назад над гэтым месцам і паставілі скульптуру юнака і дзяўчыны, што абдымаюцца.

Першым прыпынкам на нашым шляху былі па-эўрапейску дагледжаныя Пружаны.

Паводле адной з вэрсій, назва гораду паходзіць ад балцкіх прусаў, што ў свой час пасяліліся тут. Мясцовыя ж жыхары гавораць «Пру́жана», выводзячы назву ад слова «прудзіць».

### Палацык і «разбуранае гняздо»

Галоўнай славутасьцю Пружанаў зьяўляецца «палацык», што ўражвае сваёй параднасьцю — адзіны на сёньня над Мухаўцам выпадак адноўленае старадаўняе сядзібы.

Сучасны выгляд «палацыку», у якім месьціцца краязнаўчы музэй, быў нададзены выпускніком Дэрпцкага ўнівэрсытэту, удзельнікам паўстаньня 1863 г. Валенціем Швыкоўскім. Пасьля паразы паўстаньня Швыкоўскі вымушаны быў эміграваць у Бэльгію, дзе працаваў садоўнікам, вярнуўся ды зноў прыцягваў працаваць дзеля дабрабыту Пружанаў.

Зрабіўшы невялікае кола, мы заехалі ў вёску Доўгае — радавое гняздо Крашэўскіх. Валенці Швыкоўскі і аўтар 600 тамоў твораў — даробак, варты кнігі рэкордаў Гінэса — Юзаф Крашэўскі былі швагрsucc, жанатымі на родных сёстрах.

Невялікі дом Крашэўскіх у Доўгім колісь славіўся каштоўнымі навуковымі, мастацкімі і мэмарыяльнымі зборамі. Тут захоўвалася больш за тысячу лістоў Касьцюшкі, Юзафа Панятоўскага, Юльляна Нямцэвіча, у бібліятэцы — першыя выданьні твораў А.Міцкевіча, у зборах меліся слуцкія паясы, мініятуры на пэргамэнце XIV—XV ст., старадаўняя зброя. Усё гэта згарэла разам зь сядзібай у гады Першай сусьветнай.

Седзячы на руінах ацалелага падмурку дому, мы моўчкі глядзелі на раскіданыя навокал камяні. Здавалася, што гаворка ідзе не пра прыгожы куток Берасьцейшчыны, а пра нешта з вобласьці фантастыкі.

### Крашэўскія, Дзяконскія

Увечары мы дабраліся да старадаўняй сядзібы ў Каштанаўцы, больш вядомай як Чахец. Там і разьбілі лягер у прыгожым парку. Да нашай гутаркі далучыўся кіраўнік Пружанскага раёну Аляксандар Юркевіч.

Размова ішла пра нашу гісторыю, захаваньне пазасталай багатай спадчыны. Сышліся на тым, што без карэннага зьмяненьня стаўленьня да гістарычнай спадчыны наўрад ці ў найбліжэйшы час можна зьмяніць сытуацыю. Слушныя пастановы прымаюцца, аднак мэханізм іх рэалізацыі недасканалы. Трэба мяняць заканадаўства, ствараць новую турысцкую інфраструктуру, арыентаваную на ўнутраны рынак. Бо ўсе старадаўнія сядзібы — і не толькі яны — будуць *неадкладна* запатрабаваны.

Пахмурнай раніцай наступнага дня парк здаваўся яшчэ больш грандыёзным. Такой вышыні ствалы дрэваў нячаста пабачыш. Аснову парку складае лістоўніца польская, завезеная з Латвіі ў 1830-х. Сёньня дрэвы дасягнулі вышыні 40 мэтраў, маючы дыямэтар ствала 80—106 см. Па прадукцыйнасьці лісьця іх можна хіба параўнаць зь лістоўніцамі Сукачова знакамітага Ліндулаўскага гаю пад Пецярбургам. Нічога падобнага больш у Беларусі няма. Але побач з паркам — разбураны сядзібны дом з выразаным на ім мясцовым дасьціпнікам надпісам: «Рэстаран. Бармэн граф Дзяконскі». Капітальныя сутарэньні дому Дзяконскіх дагэтуль служаць сховішчам бульбы. Усё, што засталося ад велічнага калісьці дому.

### Такая вось мэліярацыя

Чыгуначная магістраль Берасьце—Масква ў раёне Пружанаў робіць нелягічны «рэвэранс» у бок гораду. Гэта было зьвязана з наведваньнем найсьвятлейшымі асобамі Расейскай імпэрыі ў Белавескай пушчы. На станцыі Аранчыцы яны перасаджваліся зь цягніка ў карэты і па царскай дарозе праз Белы лясок ехалі ў рэзыдэнцыю ў Белавежы.

Мясьціны ўздоўж ракі ад чыгункі да Маскоўскай шашы раней лічыліся непраходнымі. І цяпер нашы ровары зарываюцца ў пясок, таму прыходзіцца часьцей перамяшчацца нагамі. Шырокае рукатворнае рэчышча каналу Мухавец побач, але ён увесь зарос травамі, і вада зьбіраецца ў ім толькі каля шлюзаў, ствараючы казачныя, пастаянна зьменлівыя карціны зь зялёнай раскі. Шырокая і доўгая даліна каналу праглядаецца да самага краю далёкага лесу, але нейкая ціша вісіць над усёй поймай.

Пчаляр з Аранчыц, гаспадар добра замаскаванага пчальніка на ўзьлесьсі, на пытаньне пра раку і жыўнасьць у ёй сумна адказаў: «Якая гэта рака, труба вадасьцёкавая!» Спрачацца ня будзем, без мэліярацыі не абысьціся — патрэбны пашы, сенакосы, палі, але ці патрэбна такая мэліярацыя? Дарэчы, першае мэліяраваньне земляў у басэйне Мухаўца яшчэ ў XVI ст. пачала згаданая ўжо каралева Бона Сфорца.

Першае мэліяраваньне земляў у басэйне Мухаўца ў XVI ст. пачала каралева Бона Сфорца.

### Хутар Вайсады

Доўгі час нам ніхто не сустракаецца. Спадарожнікі без сымпатый пазіраюць у мой бок — абедзенны час даўно выйшаў, — і я далёка адрываюся ад групы, каб ня чуць «камплімэнтаў» на свой адрас. Нарэшце з-за павароту вырастае хутар. Я імчуся да адзінокай постаці ў агародзе, якая, прыняўшы мяне праз баулы на багажніку ровара за карабейніка, крычыць і махае рукамі, што ёй нічога ня трэба. Але, даведаўшыся пра нашыя сапраўдныя мэты, спн.Лідзія аказваецца гасьцінняй гаспадыняй. Яна тут жа паляцiць, накрыўшы абрус у двары, гатаваць нам ячню. Аказваецца, мы знаходзімся на хутары Вайсады блізу першага значнага прытоку Мухаўца — Дахлаўкі.

Мы абедаем, слухаючы гаспадыню хутару. Раней тут было 18 хутароў, пасьля хрушчоўскага перасяленьня ў буйныя вёскі ацалела тры. Дапамаглі верталёты — ім быў патрэбен арыенцір для заходу на запасны аэрадром.

«Ракі даўно ўжо няма, нават камары сябе пачалі паводзіць



**Мухавец** — правы прыток Бугу. Даўжыня — 123 км. Утвараецца ад зьліцьця каналізаваных рэчак Муха і Вец пад Пружанамі. Рака называецца каналам Мухавец. У яе ўпадаюць рачулкі Дахлаўка, Жабінка, Трасьцяніца, Асіпоўка і Рыта, канал Дняпроўска–Бускі. Суднаходная ад Кобрыну да Берасьцейскага порту.

**Першая згадка пра Кобрын** адносіцца да 1287 г. Назву атрымаў ад прытоку Мухаўца Кобрынкі. З 1404 да 1519 г. быў цэнтрам Кобрынскага княства, што ўзьнікла ў выніку падзелу ўладаньняў князя Фёдара Ратненскага — сына вялікага князя літоўскага Альгерда. У 1589 г. яму было нададзена Магдэбурскае права і герб — шчыт з выявай Божай маці і сьвятой Ганны.

**Раней тут было** 18 хутароў, пасьля хрушчоўскага перасяленьня ў буйныя вёскі ацалела тры. Дапамаглі верталёты — ім быў патрэбен арыенцір для заходу на запасны аэрадром.



**Экспэдыцыя на чале з Анатолем Гладышчуком (другі зьлева) на хутары Вайсады.**



**На фота: экспэдыцыя ля Пружанскага палацыку.**

**Першыя згадкі пра Пружаны** адносяцца да 1433 г. Да 1519 г. яны належалі Кобрынскаму князству, затым каралеве Боне Сфорцы і яе дачцэ Ганьне. Яна дала гораду Магдэбурскае права, пячатку і герб (1588).

па-іншаму. Раней вясной пагудуць тут і зьнікнуць. А цяпер менш зрабілася, але нейкія раззлаваныя і ўсё лета ля хутару таўкуцца. Няма куды адлятаць», — са скрухай кажа спн.Лідзія.

### Дбайны лясьнік

Бамаўскае возера ўзьнікла падчас будаўніцтва аўтамагістралі — спатрэбіўся пясок. Гэтае месца адпачынку і рыбалкі — удалы рэгулятар вады і ў самім Мухаўцы. Яно назапашвае яе, калі вады навокал шмат, і паступова аддае, калі адчуваецца дэфіцыт вільгаці. Кароткі ўчастак ад прытоку Дахлаўкі да возера — адзіны некрануты на ўсім працягу Мухаўца.

Каралеўскі канал зьяўляецца старой закінутай часткай воднага шляху з Дняпра да Бугу, пабудаванага ў 1848 г. На ім дагэтуль часткова захаваліся берагавыя палосы — бакавыя ўмацаваньні берагоў.

Мы яшчэ зь вечара пабачылі чысьціню вакол возера, але былі прыемна зьдзіўлены, калі раніцай да нас пад'ехаў мясцовы лясьнік і ветліва папрасіў пакінуць пасьля сябе парадак. Мы падзякавалі яму за такі напамін і назіралі яшчэ нейкі час, як ён з рыдлёўкай не сьпяшаючыся абышоў возера, пагутарыў з кожным рыбаком і спакойна паехаў па сваіх лясных справах.

### У гонар каралевы Боны

Некалі ў Кобрыне ў месцы ўпадзеньня Кобрынкі ў Мухавец існаваў княскі замак. Каля 1497 г. апошні кобрынскі князь Іван Сямёнавіч пабудаваў Спаскі манастыр. З таго часу захаваўся адзін будынак. Мы на некаторы час затрымліваемся ля драўлянай Сьвята-Мікалаеўскай царквы й мураванага Аляксандра-Неўскага сабору, якія, як брама, адкрываюць агляд на абодва бакі зусім іншага Мухаўца — паўнаводнага і шырокага. Адсюль ён суднаходны. Побач у яго ўпадае канал Бона, названы ў гонар легендарнай беларускай каралевы.

Дняпроўска-Бускі канал, куды ўваходзіць рака Мухавец ад Кобрына да Берасьця, — складаная гідратэхнічная сыстэма. Ад шлюза №12 на Прыпяці і да Берасьця — 146 кілямэтраў з гідравузламі, напорнымі дамбамі, каналамі, якія жывяць вадой, і іншымі збудаваньнямі. Значнай часткай вады канал і разам зь ім Мухавец папаўняецца праз Белаазёрскі канал, што жывіцца верхняй Прыпяцьцю праз Валяўскае і Белае азёры. Белае возера — адзіны выпадак у Беларусі, калі дзяржаўная мяжа паміж Беларусьсю і Украінай ідзе праз сярэдзіну возера. Выходзіць, сваю частку вады і забіраем.

### Рака жыцьця

Ад Кобрына да Навасадаў Мухавец трымаецца справа ад аўтастрады на Берасьце. На гэтым участку няма ніводнага моста цераз раку ці паромных пераправаў — яны перашкаджаюць суднаходзтву.

У вёсцы Чаравачыцы нам сустрэлася баба Вера, што басанож жвава ішла да ракі. Мы селі ў лодку, і кабета весела ўзялася за вясло: «Летась старшыня калгасу выдаваў дачку замуж. Царква на другім баку ў Чаравачыцах, таму нявесту перапраўлялі лодкай цераз Мухавец. На зваротнай дарозе яна па рацэ раскідвала кветкі — усё фатаграфавалі. Такія прыгожыя фатаграфіі выйшлі». Навакольную прыгажосьць — іх штодзённае жыцьцё — мясцовыя жыхары заўважаюць толькі на фатаздымках.

Перад сваім упадзеньнем у Буг Мухавец робіць фінт і раздвойваецца на два рукавы — правы і левы. Берасьце ўзьнікла тысячу год назад менавіта на мысе ля яе левага рукава. Можа, у сямейныя справы Мухі і Вецу ўмяшалася маленькая і зусім забытая берасьцейская рачулка Угрынка, і, пасварыўшыся, Муха і Вец разышліся, саступіўшы прыгожае месца для старажытнага гораду.

Калі да Берасьця заставалася зусім драбяза, у падарожжа ўмяшалася навальніца, што хутка ішла нам насустрач. Падмочаны дажджом фініш ніяк не паўплываў на наш настрой. Праз нейкі час мы зноў накіруемся на роварах да чарговай берасьцейскай ракі.

**Здымкі аўтара**

*Пружаны—Доўгае—Кобрын—Берасьце*

# Там, дзе пачынаецца Нёман

Ці ведаеце, дзе пачынаецца Нёман? У магічным месцы, дзе злучаюцца тры ракі, — Лоша, Уса і Нёманец. У 1882 г. часопіс «Klosy» пісаў, што тут кожная з рэк перастае існаваць сама па сабе — іх няма. Мясцовыя жыхары ад гэтага «няма» і далі назву вялікай рацэ — Нёман. У такіх месцах звычайна стаяць цэрквы — вытокі рэк валодаюць незвычайнай жыватворнай сілай. Назвы вакол адпаведныя: фальварак Сьвяты двор, былое паганскае капішча Сьвятагор'е.

А ці ведаеце, што тут, у Наднёмане, побач з вытокам беларускае ракі ў XIX ст. жыў чалавек, якога паважала ўся Эўропа? Якуба Наркевіча-Ёдку як аўтара геніяльных мэтодык электраграфіі і электратэрапіі шанавалі мэдыкі, а яго лекцыі слухалі ў Францыі, Італіі, Аўстра-Вэнгрыі.



Тут захаваліся рэшткі палацу Ёдкаў, у якім круглы год гучала Эолава арфа. На адной зь вежаў былі нацягнуты струны, яны й стваралі чароўную музыку, калі вецер дакранаўся да іх. Па багатым садзе нясьпешна гулялі паўліны. Паспрабуйце дакрануцца да лістоўніцы, што засталася тут з тых часоў — і ўбачыце іх.

Імя Наркевіча-Ёдкі вярнуў у 1988 г. Уладзімер Кісялёў, калі ў сэрыі «Нашы славутыя землякі» выйшла яго кніжка «Прафэсар электраграфіі і магнэтызму». Сёлета зроблены яшчэ адзін крок да вытоку Нёману — вялікая мастацкая кніга, амаль на 300 старонак, якую напісаў Дзьмітры Вінаградаў — «Сьлед пагаслай зоркі». Ад яго мы даведаліся, што існуюць распрацоўкі турыстычных маршрутаў па гэтых месцах — коннага і воднага. Сапраўды, колькі усяго тут можна ўбачыць і колькі пачуць.

На даху паўразбуранага палацу **(на фота)** Наркевіча-Ёдкі зьвіў гняздо бусел. А беларусы добра ведаюць, што гэта значыць.

**Кацярына Юркевіч, Менск**

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

# Хто прэтэндаваў на «Нобэля»

Паляк **Рышард Капусьціньскі** быў уключаны ў сьпіс сёлетніх кандыдатаў на атрыманьне Нобэлеўскай прэміі па літаратуры. Назіральнікі лічаць, што сёлета ўзнагароду маглі атрымаць літаратар-дакумэнталіст, філёзаф ці літаратуразнавец.

У пагалосках паўтараюцца тыя самыя імёны, што і ў папярэднія гады: амэрыканцы Філіп Рот і Джойс Кэрал Оўтс, альбанец Ісмаіл Кадарэ, Амас Оз з Ізраілю, швэдзкі паэт Томас Транстромэр. Шмат хто з назіральнікаў, аднак, спадзяваўся, што сёлета Швэдзкая акадэмія зробіць усім прыметную несправядлівасць, аддаючы ўзнагародай іншы род літаратуры, чым паэзія ці проза.

«Зьяўляюцца выказваньні, што Акадэмія хоча пашырыць сфэру кніг, якія ўзнагароджваюцца. Гэта можа азначаць, што дарога да літаратурнай Нобэлеўскай прэміі адкрываецца для такіх пісьменьнікаў, як польскі рэпартэр Рышард Капусьціньскі», — лічыць Эва Бонэр, дырэктар швэдзкага выдавецтва «Бонэр».

Працяглы час Нобэлеўская прэмія па літаратуры прызначалася паэтам ці празаікам. Аднак з завяшчаньня Альфрэда Нобэля гэтага зусім не вынікае, там няма ніякіх абмежаваньняў у пляне літаратурных жанраў, якім аддаюць перавагу патэнцыяльныя кандыдаты на ўзгароду. Больш за тое, у гісторыі Нобэлеўскай прэміі па літаратуры былі выпадкі, калі ўзнагароджваліся іншыя літаратурныя жанры, чым паэзія і проза: напрыклад, у 1950 г. «нобэля» атрымаў Бэртран Расэл, а праз тры гады — Уінстан Чэрчыль за гістарычныя працы.

«У гісторыі Нобэлеўскай прэміі апошніх год дамінуе «эстэтычная» літаратура. Але літаратура мяняецца, і Нобэлеўская прэмія эвалюцыянуе разам зь ёй. Можа, настаў час Нобэлеўскай прэміі для літаратуры факту», — сказаў AFP Гарацыё Энгдаль, прэзыдэнт Швэдзкай акадэміі.

**gazeta.pl**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**
вул.Валадарскага, 16, пак.200
227–88–41

**Пункты прыёму падпіскі:**
вул.Жукоўскага, 5, корп.1
224–32–03
вул.Раманаўская Слабада, 9
200–83–04
вул.Кашавога, 8
230–29–20

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224–03–76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284–83–59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232–46–23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227–11–92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243–16–30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235–63–11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288–30–20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232–45–10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247–30–15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233–74–88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255–80–71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278–77–61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264–06–42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227–75–55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203–82–39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234–27–25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231–03–28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284–31–06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223–81–66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271–87–21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255–57–20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243–16–83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264–36–33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295–05–74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227–08–52 |
| № 26 | пр.Скарыны, 113 | 264–22–91 |

**Шапікі:**
№18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 «Маскоўскі»
№198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298 пр.Машэрава, 75/1
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24

## Вадзім Болбас

МЭЛЁДЫЯ ПРАГІ

На Карлавым мосьце музыка іграе на шклянках.
У ваду апускаючы пальцы, мэлёдыю лёгка вядзе.
Віруе натоўп. Тут кітайчык, румын, тут гішпанка.
Ты музыку тую ніколі ня чуў і нідзе.

Мэлёдыя кропляў і шкла, ты пра што нагадала?
Мо гэтак сьлявае вада пад байдаркі блiскучым вяслом?
Мо скрыпка вясельная гэтак калісьці сьпявала,
Мо сьпевы дзяўчат над вадою з купальскім вянком?

Ды не! Гэты сьпеў ні на што, ні на што не падобны.
Ў ім чуеш ты Моцарта, Брамса, Гліера, ліцьвінаў дуду.
Камусьці яна нібы стогн невыносны, жалобны,
А можа, то чыйсьці ўспамін пра былую бяду.

Пад воплескі публікі падаюць–звоняць манэты,
Вітае музыку спагадліва, шчыра чульлівы народ.
А я ўспамінаю Сыса, сьпеў чароўны Забэйды
І даўні–далёкі за вёскай дзяўчат карагод.

Бубны крышнаітаў. З касьцёлу уздыхі аргана,
Пад вежай надбрамнай гітара–гішпанка фляменка пяе.
На Карлавым мосьце празрыстая музыка шклянак.
Да самага скону цяпер не забыць мне яе.

*Прага—Йіглава—Прага*

## Алесь Курсевіч

***

Заўсёды,
а можа,
ніколі, але
штохвіліну.
Напэўна,
а можа,
і не, але
назаўжды.
Рухома,
а можа,
паволі, але
палымяна.
З табою,
а можа…
Але.

***

Крыж,
Крык,
Край.
Кропля
Крыві —
Кранай!
Колер
Кратаў —
Капай!
Кавалак
Крыўды —
Карай!
Крыж,
Крык,
Край.

***

Сонца ў крыжах —
Нібы сьлёзы ў вачах
Маёй Беларусі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Фанаты зборнай Беларусі цешацца голу, забітаму ў вароты італьянцаў.**

Палынавы пах —
Быццам стомлены жах
Маёй Беларусі.
Зоры ў начах —
Нібы страчаны шлях
Маёй Беларусі.
Сонца ў крыжах —
Быццам сьлёзы ў вачах,
Быццам стомлены жах,
Быццам страчаны шлях
Маёй Беларусі.

***

лісьце зьлятае ўвосені
падае як імжа
голасна штосьці просіцца
голас кажа: «мяжа»

лісьце зьлятае ў Горадні
цокае ды ляціць
я паміраю у Ўроцлаве
прагнучы трошкі пажыць

лісьце зьлятае надоечы
болей няма калі
пішу sms–ы стоячы
тварам да ўсходу зямлі.

## Сяржук Каліноўскі

***

Калі цераз слова прыпынак,
Калі ты ня ведаеш сэнсу,
Нічога, нічога, наш дружа,
Галоўнае — мова у сэрцы!

## Юрась Нераток

НЕХТА ІДЗЕ

Нехта ідзе,
Толькі ў цішы грукочуць абцасы.
Гулкай хадзе
Канкурэнтаў абшар не дае.
Быццам кладзе
На жалезную лесьвіцу прасы.
Нехта ідзе —
Не сьпяшаецца і не злуе.

Нехта ідзе.
Час спыніўся, расьцёкся ў бясконцасьць.
У чарадзе
Смутных ценяў — ні цел, ні выяў.
Ён не зь людзей —
Ад яго не знайсьці абаронцаў.
Нехта ідзе
Ні па справах, ні дзеля забаў.

Нехта ідзе.
Ён ня мае ні страху, ні гневу.
Не ліхадзей,
І дабро — не яго іпастась.
Ён не ўпадзе
На зямлю і ня ўздымецца ў неба.
Нехта ідзе,
І ня будзе паўзьці і лятаць.

Нехта чужы
І да болю і жудасьці блізкі.
Быццам вужы,
Распаўзаюца думкі насьпех.
На рубяжы
Дзьвюх дылем мосьцік існасьці хісткі.
Лесам — крыжы:
Вечны могільнік альф і амэг.

Крокі бліжэй…

## Зьміцька Станіч

ТРЫ ЛІСТЫ ДА TANICZ

***

Ранак. Рана на тваім небе.
Кава на стале стыне.
Ложак пад табой ня стогне —
зь лёгкасьці тваёй і ўпартасьці.
Мова немаўляткі — рухі вейкамі,
вынаходка анёлаў
(а мо мятлікаў).
Прыкрываю вочы. Рана. Раніца.
Кава на стале стыне.

***

Немаркотнае, хай непяшчотнае,
я мяркую, нават дзівоснае.
Калі тлустае ды калі поснае —
усё жыцьцё.
Твае мары, мая каханая,
морам шчэдзкім закалыханыя.
Я дзіўлюся, хінуся к выспачцы
Олянд, Божа мой, — да тваёй зямлі…

«Аб адным я мару — каб выспацца, —
шэпчаш мне, — на астатнія дні…»

***

Мы пражылі пяць месяцаў
у каханьні і спрэчках —
я перастаў піць,
ты закахалася ў Швэцыю.
Сьпесьціла маю мову
да аксамітнай ноты,
я стаю цяпер на мяжы —
зусім ужо край нямоты.

Не празьмернасьць,
а паўната —
супольнасьць адно галосных.
Буду цяпер стракатаць
конікам у балоце
і стракацець ракой,
каб толькі той tone — ня move…

Любая, растлумач
мне сэрца сваё на белмове.

## Норма Бэліні

СЬЛЁЗЫ ЗАДАВАЛЬНЕНЬНЯ

Мае сьлёзы ня пахнуць адчаем,
Не аплакваюць цяжкую долю.
Ў іх, напэўна, няма неспакою —
Толькі трошкі салодкага болю,
Толькі гукі самотнае песьні,
Што сьпяваю ў халодным пакоі.
Мае сьлёзы ня льюцца ракою,
Бы ў «шэдэўрах» бразыльскага «мыла».
Ў іх, здаецца, няма ані солі,
Ані горычы неспатольнай…
Ў іх пакутнае задавальненьне
І мажорнага суму ноткі.
Мае сьлёзы ня пахнуць нэўрозам,
А крыху патыхаюць хлёркай.

НЭАРЫТАРЫЧНАЕ

Не для таго нас нараджалі,
Каб сёрбаць піва на вакзале!

## Мікола Яўмененка

ДЗЬВЕ СЯСТРЫЧКІ

Сядзяць сястрычкі дзьве, бы тыя дзьве галубкі,
Варкуюць–размаўляюць ні аб чым.
Падмаляваныя прыгожыя іх губкі
Жадаюць цалавацца ўначы
Ці са сваім законным мужам, яшчэ вартым,
А не — тады зь любоўнікам сваім
Ці проста з знаным хлопцам і ня надта ўпартым,
Абы ня значылась хлусьня за ім.

## Яня Шаўчэнка

СЬВЯТА КАХАНЬНЯ

Сонца і радасьць. Летняе раньне.
Ён і яна на дарозе. Спатканьне.
Наогул, банальная ў сьвеце падзея…
Позіркі. Сьмех. Грукат сэрцаў. Надзеі.
Сонца і радасьць. Шчасьце. Жаданьне.
Месяц і зоркі. Сьвята каханьня.

*Вучаніца СШ №9,*
*Наваполацак*

# Баяніст Лукаш

апавяданьне

**АРЦЁМ АРАШОНАК**

Я прачнуўся а пятай гадзіне вечара і адлучана ўтаропіўся ў нябесна-блакітную столь; нерухома ляжаў, захінуты ў насрозь прамоклае ад уласнага поту пакрывала, быццам немаўля ў пялюшках, і беспрычынна плакаў. Пасярэдзіне спальні, быццам матрос на пратэзах, у такт майму арытмічнаму сэрцу тупаў усімі чатырма канцавінамі стол, на якім у глыбокім тазіку праз лазуркавае мроіва плыла шкляная мадэмуазэль «Марціні» ў абдымку з пузатым, як швайцарскі сыравар, збаном. На плеценых крэслах спалі палюбоўнікі — мае скураныя штаны, ільняная кашуля і дзявочыя трусікі. Люстра глядзела на ўсю гэтую багемную гуртавуху сваім пустым срэбраным вокам. Я па-гудзінеўску вызваліў рукі з баваўняных уціхамірвальнікаў і дакрануўся да рамкі партрэта, які вісеў над галавой. Прыгадаць прозьвішча мастака аказалася немагчыма — клапатлівая сьвядомасьць апошнія дні рабіла іньекцыі забыцьця. Першы тыдзень было балюча, другі — ня памятаю, трэці — мною занялася яшчэ і нянька-падсьвядомасьць.

Ад змрочных думак ратаваў толькі папскі крыж напаўструхнелай шыбы. Я яшчэ раз зірнуў на партрэт, потым на стос фаліянтаў, на бронзавую фігурку Авіцэны і ў думках, ня зводзячы з алейнага падвойніка вачэй, запытаўся: «Спадар антыквар, колькі вы дасьцё мне за гэтую калекцыю кніг?»

«Выкіньце ўсё на сметніцу, гэта не каштуе і даляра!» — пачулася з падваконьня.

«Вы зьдзекуецеся зь мяне… Учора забралі срэбраны адбітак «Мяшэчніцы»… Гэта нахабства! Нахабства! На… х…»

Я маланкава скінуў пакрывала на падлогу, разьюшана расчыніў фрамугу, і піраміда з папяровых блёкаў чалавечых ідэй павалілася ў цёмнае прадоньне вуліцы. Букіністычныя рарытэты глуха плюхнуліся ў лужыну. Спужаная чарговым маім прыпадкам муха ўзьляцела з мармурова-халоднай бульбіны, села на бляшаны рукамыйнік і малітоўна склала пярэднія лапкі.

Я схапіў акамянелы клубень і шпульнуў следам на крамністапопельны тратуар. Унізе пачулася лаянка і валтузьня — бяздашнікі пачалі сварыцца з-за дарункаў, што нечакана зваліліся ім з прытулку мрояў, потым праклёны цёткі Марты зь першага паверху, яе цяжкія крокі, керхеканьне і шкадаваньне. Я зачыніў акно і прыглушыў сьвятло. На хвіліну надышло супакаеньне, якое раптоўна ператварылася ў суцэльную безвыходнасьць. Ндужае цела зноў укрылася буйным потам, але я, хістаючыся, дачыкільгаў да стала, праглынуў жменю заспакаяльнага і прыпаў вуснамі да мадэмуазэль «Марціні».

Ліпеньская цеплыня разьлілася па астэнічным целе. Жыцьцярадасная, інтымна-прыцішаная мэлёдыя саксафаніста гучала ў гарачым, як начны клюб, чэрапе. Тленная абалонка цяпер кіравалася боскай, гарманічнай мэлёдыяй, якая пераносіла мяне ў самае сакральнае пасьля ложка месьцейка — ванны пакой. Сам-насам з унітазам чалавек прымае выгляд багамольца або мысьляра, але, як ні круці, позу вечнасьці чалавек прымае толькі ў купальні. Калі ванна напоўнілася, я закінуў у ваду водарных мядзьведзяк з марской солі, расслабіўся і заснуў. Абудзіла мяне а дзясятай гадзіне вечара поліфанічная сымфонія №40 Вольфганга Амадэя Моцарта, якая, дзякуючы вынаходзтву партатыўнага тэлефона, ператкарала салён затхлага аўтобуса ў сталічную філярмонію, а местачковы кірмаш — у элітны клюб знаўцаў клясычнай музыкі. Я узяў тэлефон ручніком, націснуў на пімпку і прыклаў да вільготнага вуха.

— Алё…

— Серж, прывітаньне, — на другім баку пачуўся прыемны дзявочы голас. — Чаму не заходзіш? Ты мне не тэлефанаваў?

— Прывітаньне… Заходзіў… Раніцай тэлефанаваў, — я спрабаваў гаварыць бадзёра, але ўрэшце прамямліў нейкую лухту: — Твой брат сказаў, што…

— Які брат? Ты што, не пазнаў мяне? Серж! — у голасе пачулася ўстрывожанасьць. — Няма ў мяне ніякага брата. Гэта я, Лёля…

— Лёля? — мляво перапытаў я. — Ах, так… Прабач…

Сьвядомасьць, як раўнівая сядзелка, упарта хавала ад мяне фатаздымкі ўспамінаў, баючыся, што я зноў пачну захапляцца, абагаўляць усё летуценнае, замест таго каб піць горкую мікстуру жыцьця.

— Нарэшце… Успомніў…

— Я вельмі рады чуць твой голас, даражэнькая.

— Слухай, ты не захварэў? Што з тваім голасам? — занепакоенасьць узрасла.

— Учора выступаў ва ўнівэрсытэце…

— Якім унівэрсытэце?! Учора была нядзеля! — крыкнула Лёля, а потым заплакала. — Ты зноў пачаў піць? Што цябе можа выратаваць ў гэтым жыцьці?

— Каханьне.

— Што ты ў ім разумееш, чэрствы прайдзісьвет? Ты думаеш, толькі табе аднаму цяжка? Ты мог бы мне проста патэлефанаваць…

— Супакойся, даражэнькая, супакойся. У каханьні я разумею,



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

што толькі ты для мяне адзіная і самая пяшчотная; таму я не жадаў нагрувашчваць сваімі праблемамі тваё дабрадзейнае сэрцайка. Я не забыў нашай серады…

Я хлусіў, бо шкадаваў Лёлю, хлусіў, бо ў нядзелю мог толькі ад аднаго яе пацалунку расплакацца, як трохгадовы хлапчына. Яна б абавязкова спытала, што здарылася, і мне трэба было б расказаць, як маю маці не пускаюць да мяне празь мяжу, як на маіх вачах машынай зьбіла сабаку, як тры галерэі запар адмовілі мне ў інсталяцыях і яшчэ тысячу дробязяў, якія маглі параніць ласкавае, але не па маладосьці хворае сэрца маладой латышкі.

— Я адчуваю сябе шчасьлівым толькі з табою, — прадоўжыў я, — і мне неабходна сустрэцца. Неадкладна.

— Ты прыйдзеш толькі дзеля мяне? — голас Лёлі гучаў усьцешана.

— Канечне. Мне неабходна паведаміць табе нешта вельмі важнае.

— Ты вельмі мілы… Я абавязкова прыйду. Дзе мы сустрэнемся?

— Клюб «С» на Ратушнай плошчы, апоўначы.

— Вельмі файна. Я буду чакаць цябе, каханы.

— Я цябе таксама. Цалую і надзейна абдымаю. Да сустрэчы.

Паклаўшы трубку, я хуценька прыбраў свой пакой, пагаліўся, схапіў з камоды партманэт і выйшаў з кватэры. На першым паверсе мне сустрэлася цётка Марта, фігура якой у масянжовым сьвятле калідору нагадвала нерасфарбаваную матрошку.

— Добры вечар, спадар Сяржук! Куды вы сабраліся ў такое ветранае надвор'е?

— Добры вечар, цётухна Марта! Пайду крыху прагуляюся… мне нешта кепска на душы.

— Вы сябе зусім не шкадуеце! Ну зусім!..

— Кіньце, цётухна Марта! Калі я буду сябе шкадаваць цяпер, у старасьці я буду шкадаваць, што шкадаваў сябе ў маладосьці.

— У вас заўсёды знойдзецца адказ, — з разгубленай усьмешкай прамовіла цётка Марта і, ужо зьбіраючыся разьвітацца, запыталася: — А кнігі павыкідвалі навошта? Такія цудоўныя кнігі! І на вуліцу! Дзякуй богу, я пасьпела, бяздашнікі б парасьцягалі іх сабе на самакруткі.

— Бяздашнікам яны больш патрэбныя або гандляркам семкамі. Быццам вы зрабіліся б шчасьлівай, калі б прачыталі ўсю клясыку сьвету? Ці ваш муж кахаў бы вас гэтак палка, як і раней, ці ў адначасьсе ва ўсім сьвеце запанавала б справядлівасьць і чалавекалюбства? Усе гэтыя ісьціны, перапісаныя мільёнамі графаманаў, вядомыя здаўна… — мне зрабілася сьпякотна, было цяжка дыхаць. — Досыць. Нешта я зноў разгарачыўся. Лепей скажыце, ці ня знойдзецца ў вас пары таблетак заспакаяльнага і парасона? Гляджу, лівень можа пачацца!

Цётка Марта, разумеючы ўсю юнацкую максымізаванасьць маіх слоў, па-сваяцку ўсьміхнулася і цярпліва, са шкадобаю, прамовіла: «Для цябе ў мяне знойдзецца ўсё. Ой, які ты схуднелы! Не жадаеш гарбаты?»

— Дзякуй вялікі! Потым неяк…

Забраўшы парасон і разьвітаўшыся з гаспадыняй, я збочыў з Магілёўскай вуліцы і павольна пакрочыў па брукаванай дарозе. У некаторых дамах гарэла сьвятло, яшчэ пахла вячэрай і салодкай гарчыцай. Была без дваццаці дванаццатая. На Тэатральным мосьце, каля помніка Пушкіну, мяне ледзь ня зьбілі двое маладых вэлясыпэдыстаў. Я вылаяўся на іх, але яны прамаўчалі і пашпарылі яшчэ шыбчэй. Абмінуўшы бухгальтарскую школу і піўны намёт «Мікалаеўскае», ля галерэі я ўбачыў Андрэя Духоўнікава, які здаля махнуў мне рукой і зьнік разам з гуртам нямецкіх мастакоў у сваім мастацкім атэлье.

Зь Лёляй мы сустрэліся на брукаваным кругляку Ратушнай плошчы, як дзьве стрэлкі на гадзіньніку ратушы, акурат апоўначы. Па дахах забарабаніў золкі дождж, але дэпрэсіі, што часцяком восеньскімі вечарамі зацякала ў душу, як у вадасьцёкавую трубу, цяпер не было. Яе цыганскім посьвістам адганяў вецер разам зь бясконцым табуном воблакаў за далягляд думак пра *Адзіную*.

Шчанячае скуголеньне падваротняў заглушалі парцаланавыя званы на барочнай вежы, якія зьнізу здаваліся часткамі разьбітага вечнасьцю месяца. Пастаяльцам невялічкага гатэлю, што месьціўся на правым баку плошчы, магло падацца ў васковым сьвятле ліхтароў, што дзьве вытанчаныя фігуркі верасьнёўскіх бестурботнікаў застылі ў пацалунку па волі рэжысэра яванскага тэатру ценяў. Адзіны агеньчык гарэў у акенцы дому Давіда Сімановіча. Вецер падзьмуў мацней, і Лёля прытулілася галавой да маіх грудзей ды ледзь чутна прашаптала: «Мне вусьцішна…»

Я разгарнуў парасон, абняў прадроглую дзяўчыну і суцешыў: «Супакойся, усё будзе добра. Хадзем у клюб, табе трэба сагрэцца».

Мы спусьціліся па шэрых прыступках у магічны скляпок клюбу «Daugava». Тут панаваў настрой бестурботнасьці і хатняя цеплыня, якія дапамагалі забыцца пра ліхтугу і будзённасьць. Наведвальнікаў не было, ды-джэй Аляксандрас зьехаў на выходныя да сваякоў у Рэжыцу. Стос яго кружэлак ляжаў на нікеляваным крэсьле і нагадваў, што гаспадар хутка вернецца. Маладжавы бармэн з срэбранымі завушніцамі, заўважыўшы мяне яшчэ здалёк, шчыра абрадаваўся, а потым сарамліва-какетліва махнуў мне рукой.

— Прывітаньне, Артур! — адказаў я. — Знаёмся, гэта Іяланта — непаўторная і пяшчотная жанчына Сусьвету, якую я кахаю.

— Вельмі прыемна, — дзяўчына працягнула сваю мініятурную далоньку.

— Нарэшце, Серж, ты знайшоў блізкага чалавека…

— Артур, ты пачынаеш раўнаваць? — жартаўліва запытаўся я.

— Што ты! Ты зусім не шкадаваў сябе апошнія тыдні. Дый

**Працяг на старонцы 20.**



**Арцём Арашонак** — выпускнік філялягічнага факультэту Віцебскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Ляўрэат конкурсу маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай. Аўтар «Arche» і «Дзеяслова». Жыве ў Віцебску.

# Баяніст Лукаш

Працяг са старонкі 19.

клініка ўзьдзейнічае на… — тут ён асёкся, зразумеў, што хапнуў лішняга, перавёў позірк зь мяне і прадоўжыў: — Узьдзейнічае на занятых людзей, я чуў, вельмі станоўча.

— Напэўна… А як ты маесься?

— Дрэнь справы, — Артур манерна абапёрся на локаць і цяжка ўздыхнуў. — Мяне кінуў Леанард…

— Гэты стары? Знойдзеш сабе іншага каханка, а ня гэтага сівога архітэктара. Ты ж не жывеш у дзевятнаццатым стагодзьдзі, як Чайкоўскі ў правінцыйным, артадаксальнам горадку, — супакойваў я. — У клюбе бывае шмат народу, усё будзе добра. Вось убачыш…

— Добра… — працягнуў Артур, — але ж я ня геній. Мне вельмі цяжка знаёміцца самому…

— Затое ты гатуеш самыя чароўныя express кактэйлі. Гэта лепей за словы…

— Я ня ведаю, што мне рабіць…

— Забудзь усё і зрабі нам дзьве «Тропікі».

Мы занялі зь Лёляй невялічкі сталок, які месьціўся на ўзвышэньні наводдаль ад барнай стойкі, каб не выслухоўваць новай споведзі небаракі-гея, і запалілі. Праз хвіліну нам прынесьлі замову.

— Серж, будзеш замаўляць што-небудзь яшчэ? — гасьцінна пацікавіўся Артур.

— Прынясі нам дзьве піцы зь вяндлінай і каву, — адказаў я, а потым, паразважаўшы, дадаў: — Калі што-небудзь спатрэбіцца, я цябе паклічу.

Артур вярнуўся за стойку, пастаяў хвілін пяць, а потым зьнік на складзе.

— Тут вельмі ўтульна, — пачала Лёля.

— Табе падабаецца?

— Так. Ніколі тут не была.

— Вып'ем за цябе, — узьняў я свой фужэр.

— І за цябе!

Мы выпілі.

— Ведаеш, я вельмі шчасьлівы, што магу быць побач з табой, — амаль па літарах выціснуў я зь сябе.

— Што я чую? Сержык!

— Я шчасьлівы, — паўтарыў я. — Проста я не такі шматслоўны, як ты!

— Гэта я даўно заўважыла. Ведаеш, Серж, мне сёньня здалося, што ты вельмі адзінокі, таму вырашыла патэлефанаваць.

— Дзякуй, ты вярнула мяне з таго сьвету. Не адзінокі… Я проста рыхтаваўся сказаць табе самае галоўнае… — я сумеўся.

— Што ты хацеў сказаць?

— Ты вельмі добрасардэчная…

— Нарэшце ты адчуў… Дабрыня робіць безнадзейнага чалавека шчасьлівым…

— Яшчэ я хацеў сказаць, што я цябе кахаю!

— Я цябе таксама…

Іяланта пасунулася бліжэй і паклала свае цнатлівыя рукі мне на плячо. Я абняў яе і асьцярожна пацалаваў у вусны. Яна правяла далонькай па шыі, потым палашчыла гладка паголеную шчаку і прыціснулася да мяне ўсім целам. Надышло аглушальнае забыцьцё…

На імгненьне мы перавялі позірк, за стойкай зноў маркоціўся Артур, а ў куце пасмоктваў піва вусаты цыган ў фэтравым капелюшы і раскладваў па стосах дробныя купюры. Побач на скуранай канапе, як стомлены гулямі хлапчук, драмаў вялізны, з бліскучымі мэдалькамі і званочкамі баян. Ён час ад часу цяжка ўздыхаў, але музыка спагадліва глядзеў на яго са сваёй залатазубай усьмешкай і супакойваў: «Ну пачакай, хутка пойдзем!»

— Дзядзечка Лукаш! — павітала незнаёмца Лёля.

— Іяланта! — узрадаваўся цыган і ўзьняў капялюш. — Што ты тут робіш?

— Хадземце да нас, дзядзечка Лукаш!

— Не… Дзякуй… — незнаёмец думаў, што будзе перашкаджаць, але пасьля маіх упрошваньняў урэшце згадзіўся.

— Дзядзя, пазнаёмся — гэта Сяржук, я табе шмат расказвала пра яго, — не сунімалася Лёля. — Серж, а гэта мой дзядзька. Пасьля таго як я зьбегла ад свайго татачкі-алькаголіка, ён мне самы блізкі чалавек.

— Вельмі прыемна, — быў мой адказ. — Я ведаю аднаго баяніста, якога трапіна краіны кліча бацькам, другая маўкліва слухае, а трэцяя бяжыць ад яго мажорных мэлёдый у цішыню… Вы зусім іншы чалавек, спадар Лукаш…

— Мне таксама прыемна пазнаёміцца з вамі… з табой, Сяржук… Кліч мяне проста дзядзечка Лукаш.

— Добра, дзядзечка Лукаш, — я ўсьміхнуўся, — ведаеш, калі ў Лёлі няма нікога больш блізкага, чым ты, я хацеў бы прасіць згоды на вянчаньне ў цябе…

— А Іяланта сама згодна? — і ён зірнуў на сваю прыёмную дачку.

Дзяўчына расчырванелася і ледзь чутна прамовіла: «Так…»

— Я не пачуў, — жартаўліва перапытаў Лукаш.

— Так, — гучней адказала Лёля.

— Ня чую, — не сунімаўся баяніст.

— Так, я згодная, — на ўвесь бар пракрычала мая каханая. Артур спагадліва ўсьміхнуўся ў наш бок.

— Глядзі, — зьвяртаючыся да мяне з усёй сур'ёзнасьцю, пачаў дзядзечка Лукаш, — даю табе год. Калі на працягу гэтага часу падманеш мяне…

— Не падману, — запэўніў я. — Стрымаю свае слова.

— Вясельле будзем гуляць у мяне, — Лукаш перавёў свой позірк на Лёлю. — Памятаеш, я табе расказваў пра хутар каля возера Сялява?..

— Так… І ты яго набыў? — не хаваючы радасьці, ускрыкнула Лёля.

— Пакуль не, але ўсе паперы ўжо амаль гатовыя для дамовы… Больш ні слова пра гэта… Нікому… А цяпер трэба адзначыць вашы заручыны. Бармэн, дзьве «Сьлівавіцы» і фужэр «Рэйнскага»!

Артур прынёс заказ.

— Паслухай, Артур, — зьвярнуўся я. — Будзь маім сьведкам на вясельлі.

— Ты мяне запрашаеш?

— Канечне, што за дурное перапытваньне?

— Выдатна. Гэта адзіная добрая навіна за сёньняшні дзень…

— Потым эмоцыі, Артур, — перапыніў яго я. — Вазьмі што-небудзь сабе і сядай да нас, сёньня ў цябе ўсё роўна няма наведвальнікаў.

Цяпер за сталом нас сядзела чацьвёра.

— Жадаеце, я сыграю вам цудоўную рэч? Перамогу гармоніі над хаосам! — прапанаваў Лукаш. — Такату і фугу рэ мінор Баха!

— Ня трэба. Лепей сыграй «Се Que» Джоні Холідэя, — прапанавала Лёля.

Лукаш іграў ад душы, спрытна перабіраючы пальцамі па чорнабелых пімпачках, у такт падціваючы сабе на цыганска-французскай трасянцы. Калі ён скончыў, мы зааплядзіравалі.

Далей гучалі расейскія рамансы, стары добры рок, душэўнапростыя напевы нарвэскіх пастухоў і румынскія дойны. На некалькі гадзін усе забыліся пра свае праблемы і слухалі магічныя пералівы баяна.

А чацьвёртай гадзіне ўсе стаміліся; я пайшоў праводзіць Лёлю, а дзядзечка Лукаш вярнуўся ў сваю маленькую кватэрку каля вакзалу.

Разьвітваючыся, я пацалаваў Лёлю ў яе чуйныя вуснчкі і паабяцаў, што заўтра мы паедзем на цягніку ў Пецярбург.

— Добра… Заадно трэба будзе забраць у цябе мае трусікі… — крыху стомлена ўсьміхнулася яна.

— Я буду ў цябе апоўдні.

Але апоўдні Лёля не зьявілася, і я, адчуўшы нядобрае, неадкладна памчаў да яе. Перад домам я ўбачыў машыны міліцыі і хуткай дапамогі. На душы пачаўся дзікі неспакой, які ўзмацніўся, калі я падняўся на трэці паверх. Дзьверы ў кватэру былі расчыненыя, вакол сабраўся маўкліва-шэры натоўп.

— Прапусьціце мяне, — закрычаў я.

Людзі расступіліся.

Двое людзей маўкліва зашпільвалі чорны мяшок.

— Чакайце.

Я падбег бліжэй. Міліцыянт хацеў мяне спыніць, але яго напарнік схапіў яго за рукаў.

У цэляфанавай абалонцы ляжала Лёля і ўсьміхалася мармуроваабыякавымі вуснамі ўсяму бяздушнаму сьвету: я шчасьлівая, я кахаю! Я пацалаваў яе, маланка на мяшку зашпілілася. Я адвярнуўся, гарачыя сьлёзы пакаціліся па маіх шчоках.

Пазьней мне паведамілі, што яна памерла ў сьне ад сардэчнага прыступу. Ёй не было і дваццаці.

Ня буду апісваць свае дзевяцімесячнае знаходжаньне ў псыхіятрычнай лякарні, там таксама, як і на волі, знаходзіцца, паводле Джорджа Бэрнарда Шоў, вар'яты. Артур вярнуўся да Леанарда і зьехаў зь ім у сталіцу. Адзіныя, хто мяне наведвалі, — цётка Марта і дзядзька Лукаш.

Ён мяне і забраў пасьля выпіскі да сябе. На фэрме я вучыўся і дапамагаў яму рыхтаваць коней для карнавалаў і скачак.

На старым крэсьле стаяў баян, які Лукаш цяпер браў вельмі рэдка і граў адну-адзіную мэлёдыю «Се Que» Джоні Холідэя.



АДАМ ГЛЁБУС

## Сучасьнікі

### Стопард і Фаўст

Пераніцоўшчык тэкстаў Шэкспіра Том Стопард папрасіў не запісваць нашую размову. Вельмі слушнае было пажаданьне, бо прысутныя журналюгі, кшталту Закурэйчыка & К$^0$, моцна сказілі ў сваіх пазьнейшых запісах сутнасьць выказваньняў спадара Стопарда. Драматург Том Стопард, як і кожны, хто працуе з тэкстам, вельмі сур'ёзна ставіцца да запісанага і надрукаванага слова. Іншая рэч — сУчасныя журналісты, якім, збольшага, дастаткова слова сказанага, слова прамоўленага ў электронных сродках масавай інфармацыі. Вось хоць бы ўзяць сказ, які я пачуў: «Мы — драматургі — падпісалі пагадненьне з Фаўстам!» Хутчэй за ўсё, Том-пераліцоўшчык абмовіўся. Пагадненьне з доктарам-авантурыстам Фаўстам, схільным да вытанчанай пэдафіліі, — малавартасны дакумэнт. Мяркую, Стопард мусіў сказаць пра пагадненьне з Мэфістофэлем, пра змову з д'яблам. У такім разе, было б лягічна згадаць пра магілы тэатральных дзеячаў, што доўгі час знаходзіліся за межамі хрысьціянскіх кладоў. Але я на свае вушы пачуў пра пагадненьне з Фаўстам, якога ніхто ніколі не заключаў, з-за непатрэбнасьці, акрамя д'ябла, канечне.

*09.09.2005, 12:29*

### Кашкурэвіч і казакі

Патрапіў я пад дождж. Шпацыраваў з Хведарам Кашкурэвічам па праспэкце Незалежнасьці, расказваў пра геапаэтычны праект стварэньня рэспублікі Казакстан са станіцаю-сталіцаю ў Растове, пра ўсё яшчэ касьцюмаваную самаідэнтыфікацыю казакаў, якія ня маюць у Расеі аніякай аўтаноміі, пра падзел Расеі на расейскі Поўдзень і расейскую Поўнач… Гаварыў-гаварыў і не заўважыў, што вымак наскрозь. Прыйшоў дахаты, гарачы душ прыняў, гарбаты з малінамі выпіў і спаць лёг, а ў сьне з тым жа ж Хведарам-дударом напіўся гарэлкі, каб пасьля дажджу сагрэцца і не захварэць. Прачнуўся я ў кепскім стане, нібыта гарэлку піў ня ў сьне, а самой сапраўднасьці, і ў дадатак — прастужаны прачнуўся. Нашто было пад верасьнёвым даждажом гуляць? Няўжо дзеля атрыманьня казакамі доўгачаканай дзяржаўнасьці?

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

***

Дабіваюся ад Стася (унука) адказу на тое, чаму ён зноў залез у мой кампутар, хоць абяцаў ня лезьці?.. Ён пакрыўджана і ўпарта маўчыць. Амаль крычу, каб не маўчаў, бо нічога нельга растлумачыць маўчаньнем, растлумачыць нешта можна толькі словамі! Не дабіўшыся ніякіх слоў, сядаю працаваць, спрабую аднавіць тэкст, які Стась выпадкова зьнішчыў. Сам ён зьбягае ў лес — як заўсёды, калі крыўдуе.

Плюю на тэкст, іду шукаць… Знаходжу за валунамі, працягваю мезенец: «Добра, міравая. Гары ён гарам, той тэкст, вунь і безь яго колькі ўсяго ў сьвеце…» Малы чапляецца сваім мезенцам за мой, але замест «Мірыся, мірыся і болей ня бія» чую ў адказ: «Растлумачыць словамі можна толькі словы».

***

Спрабую давесьці Стасю, якое дзіва — паэзія, але слухаць пра дзіва паэзіі ён не ў настроі. Тым самым і мяне з імпэту зьбівае, таму прамаўляю то нейкую няўцяміцу, то банальнасьць… Маўляў, усе і ўсё — цені і пыл, а паэзія — вечнасьць. Нязгасны чалавечы дух.

Мы ідзём узьлескам, сьцяжынаю ўздоўж мора, над якім, апускаючыся, палымнее і, здаецца, вось-вось падпаліць ваду вечаровае сонца. Стась спыняецца, глядзіць на мяжу вады і полымя, пытае: «А сонца пагасьне?..» Адказваю, што калі-небудзь абавязкова — як і ўсялякі агонь. Як і ўсё…

Малога гэта не засмучае. Ну, пагасьне дык пагасьне… Ён ідзе далей так, як вядзе яго сьцяжына, скача-падскоквае і, выналодзячы рытм руху, раптам рыфмуе, падскокваючы: «Што для чаго, калі сонца пагасьне навек, што для чаго напісаў хоць адзін чалавек?..»




WWW.CELEBRITY-EXCHANGE.COM

# Бэкхэм як люстэрка

Цяпер важна ня як спартовец гуляе, а як ён выглядае.

Напачатку быў Дэвід Бэкхэм. Першы футбаліст — ікона поп-культуры. Сёньня свае Бэкхэмы ёсьць ужо ў Расеі, Румыніі, Украіне. Арыгінал, зразумела, толькі адзін. Тайляндцы нават паставілі яму помнік — залатую статуэтку ля ног Буды ў сьвятыні ў Бангкоку, у месцы, прызначаным для ніжэйшых боствaў.

Рэгулярны кліент салёнаў прыгажосьці (на галаве ў яго ў розныя часы красаваўся іракез, коскі і бліскучая лысіна), за выключэньнем дробных інцыдэнтаў не заўважаны ў скандалах, жонку Вікторыю Адамз, экс-зорку «Спайс Гёрлз», кахае да сьмерці. Паводле ўласнага прызнаньня, прымярае яе споднюю бялізну. Ідэальны тата, хоць сынам даў дзіўныя імёны — Бруклін, Рамэо і Круз.

Не займаецца палітыкай, абыходзіцца бяз рэзкасьцяў — ідал унівэрсальны, які пазіраў нават з вокладак выданьняў для гомасэксуалістаў. Толькі вось у футбол Бэкхэм гуляе ўсё слабей. Нічога! За межамі футбольнага поля ён зарабляе значна больш. І дае зарабляць іншым. Пакой у японскай гасьцініцы, у якім футбаліст жыў падчас чэмпіянату сьвету, пасьля яго выезду быў забраніраваны на два гады наперад.

### Андрэй Шаўчэнка

Асоба эксклюзіўная. Гуляе ў «Міляне», але заўважыць яго можна ня толькі на стадыёне «Сан-Сыра», але і на подыюме (Мілян — сталіца моды) у строях ад Армані. У Кіеве ён адкрыў уласную краму дарагога адзеньня. Ягоная жонка Крысьцін — былая амэрыканская мадэль і колішняя партнэрка Пэрсыльвія Бэрлюсконі, сына прэм'ер-міністра Італіі. Прэм'ер — адначасова ўладальнік клюбу «Мілян».

### Адрыян Муту

Узор плэйбоя. Два гады назад разводзіўся з румынскай акторкай Аляксандрай Дыну, потым сустракаўся з кучай мадэляў і тэлевядучых розных нацыянальнасьцяў, урэшце ажаніўся з дамініканкай Кансуэлай Матас.

Усё таму, што Муту перажывае цяжкі пэрыяд. Калі з італьянскай «Пармы» ён перайшоў у лёндanскі «Чэлсі», румын быў сталым кліентам начных клюбаў, наведваў іх з імпэтам маньяка, аж пакуль ня быў дыскваліфікаваны на сем месяцаў за ўжываньне какаіну.

### Сяргей Аўчыньнікаў

Мянушка «Бос» раскрывае характар 35-гадовага варатара маскоўскага «Лякаматыву». Ён славуты агрэсіўнасьцю на полі, матам крые ўласных калег. Тлумачыць, што абаронцы «самі аб гэтым просяць, бо гэта дапамагае ім сканцэнтравацца». Сваімі паводзінамі ён здабыў сабе статус зоркі. На подыюм Аўчыньнікаў не гадзіцца, але ўсё новыя яго прычоскі прыводзяць у замяшаньне цырульнікаў, якія вымушаны капіяваць іх на галовах тысяч расейскіх заўзятараў.

Посьпехі расейскай зборнай на полі досыць сьціплыя. Таму, каб урававаць Сяргееву рэпутацыю, ягоная жонка Інга пасьля леташняга прайгранага матчу з Нарвэгіяй прыняла рашэньне распрануцца перад камэрай і ўгаварыла сфатаграфавацца ў голым выглядзе восем іншых футбалісцкіх жонак. «А як інакш я магла ім дапамагчы?» — тлумачыла свой учынак жонка «Боса».

І праўда, што зь іх яшчэ ўзяць?

**Паводле gazeta.pl**

## НАД ШУМАМ ДЗЁН

# Што сказаў бы Гедымін?

Перад ад'ездам у Вільню набыў «Звязду». На першай паласе — вялікая фатаграфія Лідзкага замку зь вершнікамі. У горадзе праходзіў рыцарскі фэст «Замак Гедыміна».

Сымптаматычна: «паўзём на каленях» у Расею, паралельна ўздымаючы на шчыт імя літоўскага князя і выдаючы «Энцыкляпэдыю ВКЛ». Гэта наш фатум — стаяць вякамі раскірачанымі паміж Літвой-Польшчай і Ўсходам?

У самой Літве дыскутуюць, ці не падзелена яна між двума сьветамі. У бэстсэлеры тамтэйшага Арлова — гісторыка і тэлевізійнага шоўмэна Бумблаўскаса «Гісторыя даўняе Літвы» паўстае пытаньне: які правільны шлях Літвы — на Захад ці на Ўсход, разам з праваслаўным сьветам? А мо трэ было заставацца паганцамі?

24 верасьня Літва адзначала Дзень балцкага адзінства. Адзначала Х Міжнародным фэстывалем агнявой скульптуры — насупраць Гедымінавай крэпасьці, у Горным парку, дзе стаяў калісь легендарны Крывы замак.

Агнявая фэерыя была грандыёзнай рэмінісцэнцыяй на паганскія матывы. Спачатку над Вяльлёй, пры Міндоўгавым мосьце, выклалі арнаментальныя фігуры розных боствaў, пасьля на суседнім востраве блíснулі першыя агні фаервэрку. Гэта загарэліся Яныс і Усыньш — латыскія міталягічныя пэрсанажы. Пакуль салома тлела, на Крывую гару наплываў люд. У адрозьненьне ад Ліды, Вільня абышлася бязь ятак з шашлыкамі і півам. І магу прысягнуць, сьвята здаволіла віленчукоў бязь піва.

…Сем фігур з дрэва і саломы ўспыхвалі пад даўнія літоўскія сьпевы і танцы. Воўк, Зубр, Валадар — сем міталягічных постацяў успыхваюлі і паміралі, згасаючы. Аздаблялі фэерыю два дудары, адзін зь якіх — Тодар Кашкурэвіч.

…Апошнім успыхнуў Ажыс, Казёл, — спачатку гарачы струмень пайшоў зь яго пашчы, затым бліснуў хвост, наліліся чырвоным вочы. Датляваў Зубр, і публіка, узрушаная, неахвотна пакідала сьвятыя «крывыя» пагоркі. Сьвята ў Вільні, у адрозьненьне ад большасьці беларускіх фэстаў, было культурнай падзеяй, творам мастацтва.

Гедымін казаў: кожны мае права верыць у сваю праўду, і хай ён яе пільнуецца, а мы будзем трымацца свайго. Так ён абмяжоўваў Літву ад настойлівых місіянэраў, што лезьлі з усіх бакоў.

Цяпер Вільня можа пахваліцца талеранцыяй: тут над каталіцкаю катэдраю разгортваецца паганская містэрыя, побач блішчаць купалы праваслаўных сьвятыняў, на Завальнай чуваць сьпеў з сынагогі. І гаварыць па-расейску або па-беларуску тут ня лічыцца ганебным, хоць дзяржаўная мова адна.

А між тым Літва мае сваю і дзяржаўную палітыку, і пэўную сьветаглядную арыентацыю, якую можна назваць ідэалёгіяй. У рамках гэтае ідэалёгіі магчымае шматгалосьсе — кожны будзе пачуты. Іншая рэч, ці яго меркаваньне будзе ўлічана.

У нас нікога ня слухаюць, але робяць выгляд, што ўлічваюць некаторыя меркаваньні. Так зрэдку ў краіне, гісторыя якой пачынаецца з 1944 г., дазваляюцца сярэднявечныя фэсты, пра якія нават пішуць газэты. Пішуць як пра сьвяты духоўнасьці, у сапраўднасьці — піва і шашлыка. Ці такога ўшанаваньня варты нашы продкі? Даруйце ўжо за гэткае банальна-патаснае запытаньне.

**Тадэвуш Новак**

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Тры мэдалі

Беларускія спартоўцы вярнуліся з чэмпіянату сьвету па грэка-рымскай барацьбе, што прайшоў у Будапэшце, з трыма мэдалямі. Золата заваяваў Алім Сялімаў (вагавая катэгорыя 84 кг), дзьве «бронзы» — Сяргей Арцюхін (120 кг) і Вольга Хілько (63 кг).

### Сярод пяскоў эгіпецкай зямлі

Беларуская каманда заняла 12-е месца на V этапе Кубку сьвету па ралі-рэйдах у Каіры — «Ралі фараонаў». З 37 экіпажаў дыстанцыю (2,3 тыс. км) пераадолелі толькі 23, астатнія незваротна згінулі ў пясках. Перамогу сьвяткаваў сумесны француска-бэльгійскі экіпаж, вугорцы — другія.

Цяпер у плянах беларусаў — удзел у сусьветным ралі Парыж—Дакар, што стартуе 31 сьнежня.

### Хварэем за беларусаў

4 кастрычніка прайшло лёсаваньне групавога турніру Кубку УЭФА. Найцікавейшай выглядае група «С», дзе поруч з бэрлінскай «Гертай» і француcкім «Лянсам» згуляюць генуэская **«Сампдорыя»** з нашым форвардам Віталём Кутузавым, бухарэсцкая **«Сьцяўа»** галкіпэра зборнай Васіля Хамутоўскага, швэдзкі **«Хальмстад»** паўабаронцы Дзяніса Сашчэкі.

Маскоўскі **«Лякаматыў»**, колеры якога абараняюць Сяргей Гурэнка і Сяргей Амельянчук, у групе «В» пазмагаецца з каталёнскім «Эспаньёлам», сыцылійскім «Палерма», дацкім «Брондбю» і «Макабі» з Пэтах-Цiквы (Ізраіль).

**«Дынама»** (Бухарэст) галкіпэра Ўладзімера Гаева ўтварыў квінтэт «F» разам з «Марсэлем», «Хэрэнвэнам», баўгарскім «Леўскім» і ўладальнікам Кубку УЭФА-2005 маскоўскім ЦСКА.

І нарэшце, **«Дняпро»** (Днепрапятроўск), у якім не апошнюю скрыпку грае форвард моладзевай зборнай Сяргей Карніленка, будзе гуляць у групе «D» зь нідэрляндзкім «АЗ», ангельскім «Мідлсбро», швайцарскім «Грасхопэрам» і баўгарскім «Літэксам».

### Ня наш дзень

Юнацкая футбольная зборная Беларусі (U-17) ня трапіла ў наступны этап адбору да чэмпіянату Эўропы. Беларусы абышлі славенцаў, але саступілі Галяндыі і Даніі.

**AP, belta.by, gazeta.pl**

ІНФАРМАТАР

# Стрыптыз-бары і караоке ў сталіцы




## Стрыптыз

**Клюб «City»**
пр.Ф.Скарыны, 11 (гатэль «Менск»)
209–90–94
Эўрапейская кухня, эратычнае шоў.
18.00—04.00

**Бар «Dolls»**
вул.Старажоўская, 15а
239–16–16, 234–12–48
Эўрапейская кухня, стыптыз-шоў.
20.00—6.00

**Клюб «Лягуна»**
пр.Пушкіна, 39
257–37–80, 252–69–46

**Рэстаран «Мэркурый»**
вул.Мірашнічэнкі, 55
261–26–11
Эўрапейская кухня, шоў, стрыптыз, ТБ.
12.00—05.00

**Кафэ «Сям'я»**
бульвар Трактарабудаўнікоў, 5/8
230–44–10
Беларуская кухня, жывая музыка, шоў, стрыптыз.
10.00—23.00

**Клюб «Х.О.»**
вул.Старажоўская, 15а
Стрыптыз-шоў.
10.00—06.00

**Рэстаран «Рандэву»**
вул.Маякоўскага, 115
221–23–04
Эўрапейская кухня, стыптыз-шоў

## Караоке

**Кафэ «Арта»**
вул.Мірашнічэнкі, 55
261–23–31/31–47
Беларуская, усходняя кухня, ТБ.

**Кафэ «Банана-Club»**
вул.Старажоўская, 7
289–50–79
Міжземнаморская кухня, кальян, танец жывата.
10.00—02.00

**Кафэ «Жар-Птушка»**
вул.Фрунзэ, 2а (парк Горкага)
285–27–68, 236–56–72
Эўрапейская кухня, DVD, акварыюм.
11.00—22.00

**Кафэ «Кукуруза»**
вул.В.Харужай, 22
288–27–74, 237–86–83
Эўрапейская кухня, караоке.
12.00—02.00

**Кафэ «Налібокі»**
вул.Кульман, 4
232–38–73
Беларуская кухня.
10.00—23.00

**Рэстаран «П'ер Сьмірноф»**
вул.Старажоўская, 15.
234–64–34
Эўрапейская кухня, жывая музыка.
11.00—24.00

**Кафэ «Ракаўскі бровар»**
вул.Уральская, 13
235–17–01
Беларуская кухня, караоке, усходнія стравы.
11.00—23.00

**Рэстаран «Губэрня»**
вул.Адоеўскага, 28
207–67–66
Эўрапейская кухня.
10.00—24.00

**Клюб «Дыяна»**
вул.Бельскага, 71
252–21–90
Закускі, кухня, кафэ-бар.
11.00—06.00

**Рэстаран «Касбар»**
вул. Вакзальная, 23
220–81–55
Арабская кухня, кальян, танец жывата.
12.00—02.00

**Клюб «Мэрыдыян»**
вул.Прытыцкага, 56
216–89–81
Эўрапейская кухня.
11.00—23.00

**Рэстаран «Паляваньне»**
вул.Шаранговіча, 7
213–46–99
Беларуская кухня.

КАІСА

# Цікавостка месяца

Раніцай 23 верасьня на менскі Галоўпаштамт завітала нямала шахматыстаў. На прэзэнтацыі першых у краіне марак з шахматным зьместам былі заўважаны экс-чэмпіёны Беларусі Вячаслаў Дыдышка і Андрэй Малюш, трэнэр нацыянальнай зборнай Георгі Бугрым.

Выпуск шахматных марак (агульны наклад — больш за 70 тыс.) упісваецца ў канцэпцыю дзяржаўнай прапаганды беларускага спорту. «Было крыўдна, што на марках асьвятляліся іншыя віды, а шахмат не было», — зазначыў А.Малюш. Загадчыца выдавецкага цэнтру «Марка» паабяцала, што неўзабаве выйдуць і знакі паштовай аплаты, прысьвечаныя шашкам. Адсутнасьць на прэзэнтацыі непасрэднага выканаўцы — Шаміля Хайруліна, аўтара вядомай сярод філятэлістаў «чарнобыльскай сэрыі») — тлумачылася тым, што мастак — не публічны чалавек.

Блёк зь сямі марак наміналам па 500 руб. аздоблены надпісамі на тузіне моваў. Крыху эклектычныя гравюры — сумесь барока і готыкі — выяўляюць абстрактных мужчыну і кабету ў сярэднявечных касцюмах, якія перасоўваюць фігуркі. Акурат ілюстрацыі да паэмы «Шахматы» паэта XVI ст. Яна Каханоўскага.

Леў Коласаў, старшыня Саюзу філятэлістаў, задаволены задумкай мастака: «Праца ішла прыкладна год, было шмат варыянтаў, і вырашылі паказаць старажытнасьць».

Зважаючы на кошт, маркі патрапяць у «далёкае замежжа». Магчыма, замежнікам было б цікавей убачыць беларускіх «гросаў»? Л.Коласаў удакладніў, што жывых людзей — калі гэта не каралі і не прэзыдэнты — малююць на марках дужа рэдка. «Сярод шахматыстаў вынятакмі былі Карпаў, Каспараў, аднак у Беларусі няма такіх вялікіх мэтраў. Іх ня ведаюць у сьвеце».

Філятэлісты прагназуюць, што наклад хутка разыдзецца, хоць рарытэтнымі выкштальцоны буклеты і ня стануць — «мо гадоў праз пяцьдзясят». Дарэчы, у Беларусі няма людзей, якія зьбіралі б выключна маркі на тэму шахмат. Быў адзін энтузіяст, Анатоль Парнас, аднак ён эміграваў у ЗША. У сьвеце ж шахматнае калекцыянаваньне дужа папулярнае — дзейнічае нават сусьветная асацыяцыя аматараў шахматных артэфактаў. Знаным філятэлістам зьяўляецца чэмпіён сьвету 1975—1985 г. Анатоль Карпаў — кажуць, нават падарыў некалькі рэдкіх асобнікаў Лукашэнку.

Дзяўчына з Цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках на прэзэнтацыі выказала спадзяваньне, што зьяўленьне марак дапаможа завабіць вучняў у яе цэнтар. Дазволім і мы сабе трохі наіўнасьці: у год Караткевіча сувязістам варта было б адлюстраваць шахматныя паядынкі з «Ладзьдзі Роспачы»…

**ВР**

**Папраўка.** У №36 «Нашай Нівы» тэкст «Лідзкія ўражаньні» суправаджаўся дыяграмай, якая ня мела дачыненьня да задачы А.Сымановіча. Прыносім прабачэньне аўтару і чытачам. Друкуем слушны варыянт кампазыцыі праблеміста зь Ліды, вядучага шахматнай рубрыкі ў «Лідскай газеце».



## Рашыце задачу

А.Сымановіч. Мат за 2 хады. Публікуецца ўпершыню.

**Адказ: 1. Те5!** «Добры першы ход, прысутнічаюць разнастайныя тактычныя элементы — блякаваньне поля, прыцягненьне, адцягненьне, перакрыцьцё» (В. Жылко).

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 7 кастрычніка

**«Лад», 10.25**

«Хто сьмяецца апошнім».

Беларусь, 1954, рэж. Уладзімер Корш-Саблін.

Клясычная п'еса Кандрата Крапівы экранізавана па-расейску, час дзеяньня — умоўны. Але фільм Корш-Сабліна — трыюмф драматурга і беларускіх актораў. Рахмана-палахлівы Глеб Глебаў у ролі Тулягі, гратэскна-нахабны Леанід Рахленка — Гарлахвацкі.

**НТВ, 22.45**

«Я — Сэм».

ЗША, 2001, рэж. Джэсі Нэлсан.

Мэлядрама.

Душэўнахворы бацька з дапамогаю адвакаткі змагаецца за права апекі над сямігадовай дачкой.

Па сцэнары Дж.Нэлсан пастаўлены мэлядрамы «Мачаха» і «Гісторыя пра нас».

Карціна «Я — Сэм» намінаваная на «Оскара» ў катэгорыі «Найлепшы актор» (Шон Пэн).

### Субота, 8 кастрычніка

**«Лад», 10.15**

«Ясь і Яніна».

Беларусь, 1975, рэж. Юры Цьвяткоў.

Музычная тэлекамэдыя.

Студэнты-будаўнікі («Песьняры») спаборнічаюць з народным хорам лейтэнанта Данілы…

Фільм Цьвяткова цікавы не сюжэтам і ня ўдзелам культавых «Песьняроў». Стужка — узорны беларускі трэш, цнатлівы і чысты.

Карціна для адмысловых кінагурманаў.

**БТ, 19.15**

«Настасься Слуцкая».

Беларусь, 2004, рэж. Юры Елхаў.

Гістарычная драма.

Хаця фільм пазначаны як гістарычны, мінулае ў ім бесканфліктна-стэрыльнае, а таленавітая Сьвятлана Зелянкоўская зьведзена да ўзроўню стрыптызэра Тарзана. Чалавечыя жарсьці праяўляе толькі герой Анатоля Ката.

Карціну варта глядзець пад «навінкаўскую» агучку «Аляксандры Шклоўскай».

**НТВ, 21.50**

«Кантакт».

ЗША, 1997, рэж. Робэрт Зэмэкіс.



Фантастыка.

Астраном Элі Эраўэй (Джодзі Фостэр) атрымала пасланьне з Вэгі. Пасланьне расшыфравалі, і Элі адпраўляецца на кантакт зь іншым розумам.

Робэрт Зэмэкіс («Хто падставіў труса Роджэра?») стварыў відовішчную карціну, дзе найноўшыя эфэкты годна спалучаюцца з псыхалягізмам, а фантастычная вандроўка набывае тэалягічнае вымярэньне.

**СТВ, 23.00**

«Дэбютанты».

Чылі, 2003, рэж. Андрэс Вайсблат.

Крымінальная мэлядрама.

Два браты закахаліся ў прыгожую стрыптызэрку, палюбоўніцу крымінальнага боса.

Карціна А.Уэйсблата — гарачая, дынамічная. Сюжэт — рэзкі й адначасова кранальны. Акторская гульня імпульсіўная, глыбокая і прадуманая.

«Дэбютанты» — гэта лацінаамэрыканскія «Рока і ягоныя браты» з досьведам «Крымінальнага чытва» і аголенай жарсьцю.

### Нядзеля, 9 кастрычніка

**«БТ», 22.30**

«Нябесны капітан і сьвет будучыні».

ЗША—Вялікабрытанія—Італія, 2004, рэж. Керы Конран.

Комікс-рэтрафантастыка.

Лётчык Нябесны капітан і журналістка раскрываюць тайну зьнікненьня навукоўцаў і прадухіляюць канец сьвету.

Будучыня ў фільме — коміксы 1950-х і «вялікі стыль» у трэшвыкананьні. Карціна К.Конрана цалкам апрацаваная на камп'ютары, а ролю галоўнага злачынца іграе «ажыўлены» Лоўрэнз Аліўе.

У ролях: Джад Лоў, Гвінэт Пэлтроў, Анджэліна Джолі.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**Слуцкія паясы**

**Да 13 сьнежня** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (вул.К.Маркса, 12) працуе выстава «Слуцкія паясы». Апошняя выстава паясоў у Беларусі была ў 1927 г. Дэманструецца найбольшая колькасьць слуцкіх паясоў з тых музэяў, дзе яны знаходзяцца. Таксама **да 17 кастрычніка** можна ўбачыць чатыры паясы са збораў Дзяржаўнага гістарычнага музэю Масквы.

**Выстава на чатырох**

Да **15 кастрычніка** ў галерэі Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава «Акварэль у 4-х асобах». Ідэя выставы ўзьнікла падчас удзелу чатырох мастакоў зь Беларусі — Зьмітра Сурыновіча, Уладзімера Гераўкера, Сяргея Пісарэнкі і Лідзіі Лесьняковай — у Міжнародным біенале акварэлі ў Намюры (Бэльгія).

**Vivat, Alma Mater**

Да **26 кастрычніка** ў галерэі «Універсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) праходзіць выстава, прысьвечаная 30-годзьдзю Беларускага ўніверсытэту культуры і мастацтваў ды 15-годзьдзю спэцыялізацыі «народныя рамёствы» — «Vivat, Alma Mater!». На выставе выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў унівэрсытэту можна ўбачыць творы аб'ёмна-дэкаратыўнай керамікі, мастацкага тэкстылю, саломапляценьня, батыку, станкавага жывапісу, фатаграфіі.

## СУСТРЭЧЫ

**13 кастрычніка** а 18-й гадзінзе будзе паседжанне клюба інтэлегенцыі імя Сьвятога Кірылы Тураўскага пры грэка-каталіцкай парафіі Сьвятога Язэфа ў памяшканьні бібліятэкі імя Адама Міцкевіча, якая месьціцца ў Чырвоным касьцёле. Выступоўца Анатоль Сідарэвіч. Тэма выступу: экуменічны зьезд інтэлігенцыі ў Гнезьне «Эўропа хрысьціянская»

**Сустрэча зь пісьменьнікам**

**7 кастрычніка** а 19-й на гістарычным факультэце БДУ (вул.Чырвонаармейская, 6, аўд. №44) адбудзецца творчая сустрэча зь Ягорам Коневым — «Выкарыстаньне гістарычных сюжэтаў у папулярнай літаратуры».

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

*(на сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў)*

**11** (аўт) — «Кармэн».

**12** (ср) — вечар старадаўняга рамансу.

**13** (чц) — «Хаваншчына».

**15** (сб) — «Яўген Анегін».

*(на сцэне Беларускай філармоніі)*

**13** (чц) — вечар вакальных дуэтаў.

**Балет**

*(на сцэне Палацу Рэспублікі)*

**8** (сб) — «Дон Кіхот».

**9** (ндз) — «Эсмэральда».

**13** (чц) — «Карсар».

**Купалаўскі тэатар**

**7** (пт) — «Таполевая завея».

**8** (сб) — «Чычыкаў».

**9** (ндз) — «С.В.».

**10** (пн) — «Каханьне ў стылі барока».

**12** (ср), **13** (чц) — «Кім».

**15** (сб) — Івона, прынцэса Бургундзкая».

**16** (ндз) — «Памінальная малітва».

**Малая сцэна**

**7** (пт) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**9** (ндз) — «Адчыніце кантралёру!».

**15** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**8** (сб) — «Адэль».

**11** (аўт) — «Валянціна».

**13** (чц) — «Нязваны госьць».

**14** (пт) — «Містэр Розыгрыш».

**15** (сб) — «Адвечная песьня».

**Тэатар імя Горкага**

**8** (сб), **9** (ндз) — «Ніначка».

**11** (аўт) — «Выпадковы вальс».

**12** (ср) — «Анджэла ды іншыя».

**13** (чц) — «Перад захадам сонца».

**14** (пт) — «Дзядзькаў сон».

**15** (сб) — «Адзіны спадчыньнік».

**16** (ндз) — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасьці».

## СПОРТ

**Заключныя матчы зборных**

**11 кастрычніка,** аўторак

**Матч адборачнага турніру да моладзевага чэмпіянату Эўропы-2006**

Беларусь—Нарвэгія.

Барысаў. Гарадзкі стадыён. Пачатак а 19-й.

**12 кастрычніка,** серада

**Матч адборачнага турніру да чэмпіянату сьвету па футболе-2006**

Беларусь—Нарвэгія.

Сталічны стадыён «Дынама». Пачатак у 21.30.

**Гандбол**

**Ліга чэмпіёнаў. II тур**

**10 кастрычніка,** нядзеля

БГК імя Мяшкова (Берасьце) — «Колдынг» (Данія).

Менскі Палац спорту (пр.Машэрава, 4). Пачатак у 17.20.

**Хакей. Чэмпіянат Беларусі**

**8 кастрычніка, субота**

«Юнацтва» (Менск) — «Сокал» (Кіеў). Парк імя Горкага.

«Хімвалакно» (Магілёў) — «Гомель».

«Віцебск»—«Нёман».

«Хімік-СКА» (Наваполацак) — «Берасьце».

Пачатак а 13-й.

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Madison** (219-00-10)

**6** (чц), 22.00 — Lady's Thursday.

**7** (пт), 23.00 — dj Nice.

**8** (сб), 23.00 — шоў бармэнаў.

**9** (ндз), 23.00 — «Staff party»: бітва бармэнаў Расеі і Беларусі.

**Bronx** (288-10-61, GSM «Velcom»: 103 і 105)

**6** (чц), 23.00 — жывая музыка / dj-bar.

**7** (пт), 24.00 — dj Lovesky.

**8** (сб), 23.00 — St. Petersburg Sessions #3.

**9** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.

**Ізюм** (206-66-18)

**6** (чц), 23.00 — «RNB Royalty Party»: Gaamer, Induss / BURNing Night: drum show, fire strip dance, barman show, lady BURN.

**7** (пт), 21.00 — жывая музыка, эратычнае шоў.

**8** (сб), 22.00 — «GlobaliZation»: dj Angel (BE), dj Top.

**9** (ндз), 21.00 — жывая музыка / disco-program.

**Белая Вежа** (284-69-22, 239-16-00)

**6** (чц), 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Bergamo.

**7** (пт), 23.00 — dj Alex.

**8** (сб), 1.00 — dj Dee.

**9** (ндз), 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj Alex, dj Bergamo.

# У чаканьні «Сланоў Ганібала»

**11 кастрычніка**

**Дом літаратара**





Новую кнігу Уладзімера Арлова склалі выбраныя эсэ апошніх пятнаццаці гадоў — своеасаблівая хроніка зьменаў, што адбываліся ў нашай краіне й навакольным сьвеце. Адкрывае зборнік эсэ «Незалежнасьць — гэта…». Напісанае ў 1990 годзе да чарговых угодкаў БНР, яно было перакладзенае на дваццаць моваў, сталася амаль легендарным, але дагэтуль ня страціла актуальнасьці.

Прэзэнтацыя кнігі адбудзецца ў **аўторак, 11 кастрычніка**, у вялікай зале Дома літаратара (вул.Фрунзэ, 5). Удзел бяруць сябры і калегі пісьменьніка: Зьміцер Бартосік, Адам Глёбус, Андрэй Хадановіч...

Жывы аўтар дае аўтографы.

Чакаюцца сюрпрызы, але прэзэнтацыя адбудзецца пры любым надвор'і.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Браты Грым»: **7** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

«Калі сьвякроў — монстар»: **7** (пт) 17.30, 19.20, 21.10; **8, 9** (сб, ндз) 17.30.

«Зоркавыя войны: эпізод III. Помста сытхаў»: **7** (пт) 15.00; **8, 9** (сб, ндз) 13.00.

«Перавозчык-2» (прэм'ера): **8, 9** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.30, 19.20, 21.20.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Мужчына па выкліку-2»***: **7** (пт) 16.30, 18.10, 19.50, 21.30; **8, 9** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 18.10, 19.50, 21.30.

**«Дом кіно»** (266-35-26)

«Ключ ад усіх дзьвярэй»***: **7—9** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

«Мадагаскар»: **7—9** (пт—ндз) 15.00.

**«Дружба»** (240-90-13)

«Ключ ад усіх дзьвярэй»***: **7** (пт) 17.00 (іл), 19.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.30, 21.00.

«Зоркавыя войны: эпізод III. Помста сытхаў»: **7** (пт) 12.00, 14.00; **8, 9** (сб, ндз) 13.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Браты Грым»: **7** (пт) 14.20, 16.40, 19.00, 21.30; **8, 9** (сб, ндз) 15.00, 19.10.

«Перавозчык-2» (прэм'ера): **8, 9** (сб, ндз) 13.10 (іл), 17.20, 21.30.

**«Масква»** (203-14-48)

«Браты Грым»: **7** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 12.40 (іл), 16.50.

«Перавозчык-2» (прэм'ера): **8, 9** (сб, ндз) 15.00, 19.20, 21.10.

**«Мір»** (288-22-33)

«Мужчына па выкліку-2»***: **7** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

«Калі сьвякроў — монстар»: **7** (пт) 16.00, 18.00, 20.00; **8, 9** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.00, 20.00.

**«Перамога»** (203-77-66)

«Мужчына па выкліку-2»***: **7—9** (пт—ндз) 17.00 (іл), 19.00, 21.00.

«Птушкі-2: падарожжа на край сьвету»: **7** (пт) 15.00 (іл), **8, 9** (сб, ндз) 13.00, 15.00.

**«Піянэр»** (227-64-87)

«Знаёмства з Факерамі»: **7** (пт) 17.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 18.50.

«Міранда зь лёдам»***: **7** (пт) 15.00, 19.10; **8, 9** (сб, ндз) 17.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)

«Басаножкі па мастаўой»***: **7** (пт) 11.00, 13.30, 18.30, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 16.10, 18.30, 21.00.

«Перакладніца»: **7** (пт) 15.50; **8, 9** (сб, ндз) 13.40 (іл).

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка — 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 гадоў.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатры**

**Тэатар лялек**

**11** (аўт), 12 (ср) — «Бязглуздая казка».

**13** (чц), 14 (пт) — «Боская камэдыя».

**15** (сб) — «Чароўная лямпа Аладзіна».

**16** (ндз) — «Прыгоды алавяннага салдаціка, пастушкі і камінара».

**Тэатар юнага гледача**

**8** (сб) — «Канёк-гарбунок».

**9** (ндз) — «Дзюймовачка».

**Тэатар імя Горкага**

**15** (сб) — «Krok a'Дыл».

**Опэра**

**16** (ндз) — «Казка пра Каракаля, Вераніку і Горад Майстроў».

**Купалаўскі тэатар**

**9** (ндз) — «Афрыка».

**Кіно**

**«Аўрора»**

Зборнік мультфільмаў: **8, 9** (сб, ндз) 11.30.

**«Берасьце»**

«Ледавіковы пэрыяд»: **8, 9** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**

Зборнік мультфільмаў: **8, 9** (сб, ндз) 11.00.

**«Мір»**

«Шалёныя скачкі»: **8, 9** (сб, ндз) 13.00.

**«Піянэр»**

«Маленькія ўцекачы»: **7** (пт) 10.00; **8, 9** (сб, ндз) 14.00.

«Карпарацыя монстраў»: **7** (пт) 13.00; **8, 9** (сб, ндз) 12.00.

Зборнік мультфільмаў: **8, 9** (сб, ндз) 10.30.

**«Цэнтральны»**

«Супэрсямейка»: **8, 9** (сб, ндз) 11.30.

## КІНО НА DVD

**Master records**

**«Забойная каманда»**

Адзінаборствы, камэдыя, Карэя, 2005, рэж. **Нам Санг-Гук.**

У ролях: **Кім Донг-Ван, Х'ён Бін, Ё Ан.**

Найлепшая каманда краіны па таэквандо кідае выклік майстру, чыя школа ў заняпадзе. Майстар набірае новую каманду, у якую ўваходзяць балетныя танцор, бандыт, тоўсты гандляр сасіскамі…

**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Не хадзіце, дзеткі, зь ведзьмамі гуляць

«Браты Грым» («The Brothers Grimm»)

ЗША—Чэхія, 2005, каляровы, 118 хв.

**Жанр:** страшная казка.

**Адзнака:** 7,5 (з 10).



WWW.MOVIEWEB.COM

Браты Грым вандруюць па Нямеччыне, ратуючы даверлівых жыхароў ад нячыстай сілы, якую самі ж і ствараюць. Акупацыйныя француская ўлады адпраўляюць махляроў у Марбурскі лес, дзе зьнікаюць дзеці. Там авантурнікаў чакаюць жывыя дрэвы, ваўкалак і ведзьма, якой 500 гадоў.

Тэры Гіліям, вядомы па абсурдысцкай «Бразыліі», расквеціў 100-мільённы бамбафільм гратэскнымі прымочкамі. Брунатна-галюцынацыйны лес (гібрыд «Соннай лагчыны» й «Марозка»), Чырвоная Шапачка, злая жыжа з вачыма, разбэшчаная пяшчотная Жаба.

Вільгельм Грым (Мэт Дэйман) — практычны й рацыянальны; узыходная галівудзкая зорка Гіт Леджэр грае яго рамантычнага брата Якаба. Пакуты пяцісотгадовай каралевы, якая не жадае старэць, разыграла Моніка Бэлючы.

Але самы гіліямаўскі пэрсанаж, вяршыня гратэску — генэрал Дэлятомб, які не любіць казак і харчуецца пашкамутанымі кацянятамі. Сьмерць генэрала, які загадаў паліць забабонна-партызанскі лес, выклікае радасны ўздых у залі. «Я толькі хацеў, каб быў парадак», — сьцьвярджае адмоўны герой. Але цынічны Т.Гіліям усталёўвае свой парадак, дзе ўлада касуецца, а рамантычныя казкі атручаныя ангельскай іроніяй.

Ня кожны глядач дажыве да канца сэансу. Для дарослых фільм занадта казачны, для дзяцей — занадта страшны.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Выбар адзінага. Погляд з Каракасу



Няма нічога лепшага на сьвеце, як сядзець на беразе Карыбскага мора, цягнуць мясцовы ром і разважаць пра лёсы беларускай дэмакратыі. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Калі ў Менску ў гонар перамогі Мілінкевіча адкаркоўвалі шампусік, у Каракасе, адкуль пішу гэты тэкст, была дзявятая раніцы. У прынцыпе, цікава было даведацца, што там цяпер на МАЗе. Аднак нават у выпадку, калі б букмэкеры прапаноўвалі он-лайн рабіць стаўкі на кандыдатаў, усё роўна ня здолеў бы ў гэты час падняць свой зад і пачапаць у інтэрнэт-кафэ. З адной прычыны — па «скрыні» трансьлявалі праграму «Алё, прэзыдэнт», якую вядзе правадыр балівcovarскай рэвалюцыі, прэзыдэнт краіны, яго эксцэленцыя Уга Чавэс! (Бурныя авацыі.)

Прэзыдэнт Чавэс у жывым этэры ўстаўляе пістон усім, хто не жадае будаваць «сацыялізм у XXI ст.». Такіх чапушылаў у Вэнэсуэле дастаткова шмат, таму й праграма цягнецца доўга, пакуль гарант пятай у гісторыі краіны канстытуцыі ў парадку чаргі не апрацуе ўсю контру. Гэтым разам «Алё» цягнулася ўсяго шэсьць гадзін. За 360 хвілін Уга выклаў плян здабычы нафты, сьцёр у парашок лятыфундыстаў, правёў сэлектарную нараду зь міністрам адукацыі, уставіў «пятак» у філялягічную дыскусію, адкалоўшы нешта геніяльнае наконт таго, ці трэба ўстаўляць у слоўнікі партугальскія афарызмы, прэзэнтаваў чыйсьці раман, працытаваўшы найбольш упадабаныя ім кавалкі, агучыў лісты ў сваю падтрымку ад маладых чыканас з ЗША, назваў нейкага мясцовага палітыка «шэльмам».

У фінале ў студыю прыпёрся дзіцячы хор, удзельнікам якога было па 5—6 гадоў. Прэзыдэнт бухнуўся перад музычным калектывам на калені, падпоўз бліжэй, расцалаваў кожнага хлопчыка і дзяўчынку, а на закуску яшчэ і дырэктарку. Ня ведаю, як вэнэсуэльскі электарат, а зь мяне сьлёзы перлі ніягарскім вадаспадам.

Між тым, пакуль Чавэс адцягваўся зь дзецьмі, лідэр апазыцыі сабраў прэсуху і наехаў на Уга, быццам той прафукаў бюджэт. Натуральна, на фоне прэзыдэнцкага шоў гэта выглядала сумна і нудна. Нядзіўна, што рэйтынг у вэнэсуэльскіх адмарозкаў як кот наплакаў — 16%, у той час як у чавэскага «Руху за Пятую рэспубліку» — 44—45%.

Калі тэндэнцыя захаваецца, то нас чакаюць цікавыя часы: прайграўшы некалькі разоў, вэнэсуэльская апазыцыя лягічна прыйдзе да высновы — клін клінам вышыбаюць. І пачне шукаць кандыдата — люстэрка Чавэса. На гэтай плянэце ёсьць толькі адзін палітык, здольны пацягацца з Уга ў вобласьці піяру. Чытач, натуральна, ведае яго прозьвішча. Мая яму парада: ня трэба трымацца тут за ўладу. Адна справа будаваць рынкавы сацыялізм у краіне, якая сядзіць на іголцы «Газпрому», а другая — у Вэнэсуэле, адным з сусьветных лідэраў па экспарце нафты. Гэта ж можна такія хакейныя палацы па пэрымэтры вэнэсуэльскай мяжы забацаць!

Вучыце гішпанскую, Аляксандар Рыгоравіч…



PHOTO.BYMEDIA.NET

Рэдкі фэномэн — частковае зацьменьне сонца — назіраўся ў Беларусі 3 кастрычніка.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Алег** просіць адгукнуцца Варыводу Тамару. Т.: 274–73–75

### КАЦЯНЯ

**Беларускамяўнае кацяня** ў добрыя рукі. Т.: 247–57–80

### КНІГІ

**Прадам кнігі**: «Тэўтонскі ордэн» А.Краўцэвіча, «Беларуска-польскі размоўнік» Клышкі, «Сапраўднае аблічча» З.Пазьняка, «Споведзь», «Ад родных ніў» (Прага, 1942 г., факс. выд.) Л.Геніюш, «Палітычныя партыі Беларусі» ды шмат іншага, багаты выбар. Т.: 753–70–05

**Прадам кнігі**: «Кароткая гісторыя Беларусі» (1910 г., факс. выд.) Ластоўскага, «Беларуска-расейскі слоўнік» Байкова, Некрашэвіча, «Беларускі кнігазбор»: «Летапісы і хронікі», Каліноўскі, Баршчэўскі, Гётэ, «Філяматы і філярэты», «Пан Тадэвуш», перакладная паэзія, гісторыя, мастацкая. Т.: 753–70–05

**Кнігаабмен:** Т.: 753–91–96

**Прадаю**: «Беларускі клясычны правапіс», «Наша Ніва» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753–91–96

**«Сьпіс землеўладальнікаў Менскай губэрні»** ,«Міндаў, кароль Літовіі» (стасункі ВКЛ і Паўночнага ордэну), мэтрыкі. Т.: 753–91–96

**Пераклады**: кнігі, перакладзеныя з польскай, ангельскай, нямецкай, расейскай моў, у тым ліку «Дзяды», «Санэты» Міцкевіча, падручнікі па журналістыцы і іншае. Т.: 753–91–96

**Беларускае аўдыё**. Прапаную калекцыю беларускіх касэт, CD, у тым ліку аўтэнтычны фальклёр, «Я нарадзіўся тут», сучасная і архаічная музыка. Т.: 753–91–96

**Дабрачынная раздача** кніжак па мовазнаўстве, філязофіі, паліталёгіі, кніжак Зянона, Яна Станкевіча ды іншае на прымальных умовах, энцыкляпэдыі, слоўнікі, сусьветная клясыка па-беларуску, фільмы ды музыка на CD на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15.00—19.00). Т.: 707–40–01

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235–18–72. Юры

**Сэмінары па гісторыі**, культуралёгіі, мастацтвазнаўстве. Т.: 234–93–71, 707–40–01 (Сяржук)

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Зь Беларусі і Літвы**

**Віцебск.** Тымчасовы аддзел акружнога суду разглядаў справу Івашэўскай, Маліноўскага, Сянкевіча і Апанасёнка. Правініліся яны ў тым, што першыя двое ўтрымлівалі тайна школы, а другія вучылі ў іх. На судзе выявілася, што п.Івашэўская шчодра падтрымлівала шмат школ у цэлай губэрні, нягледзячы, чы то каталіцкія, чы то праваслаўныя.

Суд усіх апраўдаў.

**Г. Беласток**, Гродз. губ. У Беласток прыйшоў пехатой незвычайны мандровец, Мікульчык. Гэта беларус, яшчэ зусім малады хлопец, гадоў 26. Адзеты па-сялянску. Шмат бачыў на сваім вяку. Быў шаўцом, манахам, стрэлачнікам, пісаў у расейскіх газэтах, служыў у цырку. Гэтага году наважыўся пайсьці пехатой вакруг сьвету. Выйшаў з Пскова. Пойдзе ў Канстантынопаль, Марсэль, Парыж і далей. За сем гадоў вернецца ў Пецярбург. Грошай Мікульчык з сабой ня ўзяў і хоча падзарабіць часам у дарозе. З гэтай падарожжы маніцца напісаць рад абразкоў.

**«Б.В.»**

**Ад рэдакцыі:**

Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланыя ў рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны з праўдзівай фаміліяй і адрасам таго, хто яе прысылае. Можна таксама падпісаць прозьвішча разам з фаміліяй, хто не захоча, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрас і фамілія толькі для ведама рэдакцыі.

**Наша Ніва. 1910. №37**

## ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА

**9 кастрычніка** (нядзеля) па маршруце: Менск—Сынковічы—Зэльва — Крамяніца — Ізабелін — Гнезна — Мсьцібава — Краскі — Падароск — Менск.

**14—17 кастрычніка:** Кракаў—Вялічка.

**23 кастрычніка**: Дамашаны—Алесіна—Ляды—Убель—Сьмілавічы — Дукора — Раванічы —Багушэвічы—Беразіно.

Т.: 232–54–58, 622–57–20 (Зьміцер), 264–12–38, 776–24–35 (Павал)

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3372.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 05.10.2005.

Замова № 5734.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а